WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУССКАЯ ГАЗЕТА

24 СНЕЖНЯ 2010 г.
ПЯТНІЦА
№ 252
(26860)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Хрысціянам Беларусі, якія святкуюць Нараджэнне Хрыстова 25 снежня

Дарагія суайчыннікі!

Ад усёй душы віншую вас з Нараджэннем Хрыстовым.

Для ўсіх хрысціян Нараджэнне Хрыстова з'яўляецца крыніцай веры, чысціні і шчырасці, вучыць міласэрнасці і чалавекалюбству, а значыць, дапамагае станавіцца лепшымі, больш гуманнымі, справядлівымі. Гэты цудоўны час натхняе на здзяйсненне добрых спраў, на чуласць і ўвагу да ўсіх, хто мае патрэбу ў спагадзе, дапамозе і клопаце.

У Беларусі, дзе спакон веку побач жывуць прадстаўнікі розных веравызнанняў, Нараджэнне Хрыстова набывае асаблівы сэнс як сімвал згоды і ўзаемаразумення паміж людзьмі. У такія дні мы асабліва ясна ўсведамляем, што мір і спакой на роднай зямлі залежаць ад нас самих. Толькі разам, аб'яднаўшы намаганні, мы зможам захаваць дабрабыт у агульным беларускім доме, зрабіць яго яшчэ больш багатым і прыгожым.

Няхай цяпло калядных дзён сагравае вас увесь год і павялічвае стваральную энергію для працы ў імя нашай Айчыны.

Зычу вам і вашым блізкім моцнага здароўя, поспехаў, шчасця і радаснага настрою.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

БАНКАЎСКАЯ СІСТЭМА БЕЛАРУСІ Ў 2010 ГОДЗЕ ВЫКАНАЛА ЎСЕ ПАКАЗЧЫКІ ГРАШОВА-КРЭДЫТНАЙ ПАЛІТЫКІ

Аб гэтым далажыў учора Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку старшыня праўлення Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч.

«Прэзідэнту было даложана аб тым, што ўсе паказчыкі, закладзеныя ў Асноўных напрамках грашова-крэдытнай палітыкі на 2010 год, банкаўскай сістэмай поўнасцю выкананы», — сказаў Пётр Пракаповіч.

У адпаведнасці з запланаванымі тэмпамі ажыццяўляецца крэдытаванне эканомікі і насельніцтва, паспяхова рэалізуецца працэнтная палітыка, надзейна працуе плацежная сістэма, стабільны курс нацыянальнай валюты. На сённяшні дзень беларускі рубель да кошыка замежных валют дэвальваваў толькі на 1,5 працэнта ў параўнанні з пачаткам года. Укладаў насельніцтва ў беларускіх банках растуць, прычым у снежні сітуацыя нават палепшылася.

Прэзідэнту было даложана і аб развіцці самой банкаўскай сістэмы. Так, рэсурсная база банкаў з пачатку года вырасла на 42 працэнты ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года, усе банкі выконваюць нарматывы бяспечнага функцыянавання.

Пётр Пракаповіч запэўніў кіраўніка дзяржавы, што банкаўская сістэма гатова да выканання тых задач, якія пастаўлены перад ёю ў 2011 годзе.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт Узбекістана павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з перамогай на выбарах

Аляксандра Лукашэнку з перавыбраннем на пасаду Прэзідэнта Беларусі павіншаваў Прэзідэнт Узбекістана Ісламам Карымаў. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы.

«Перакананы, што традыцыйна дружалюбныя і ўзаемавыгадныя адносіны паміж Рэспублікай Узбекістан і Рэспублікай Беларусь будуць і ў далейшым развівацца і паглыбляцца ў інтарэсах нашых народаў», — адзначыў Ісламам Карымаў.



На Каляды збываюцца цуды!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Мінскім архікатэдральным касцёле Найсвяцейшай Дзевы Марыі.

Патрыярх Кірыл павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з перавыбраннем на пасаду Прэзідэнта Беларусі

Святейшы Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з перавыбраннем на пасаду Прэзідэнта Беларусі, паведамляе БЕЛТА.

«Сардэчна віншую Вас з перамогай на выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Займаючы вышэйшую дзяржаўную пасаду ў мінулыя гады, Вы шчыра служылі краіне і яе грамадзянам. Вынікі праведзеных выбараў паказалі ўзровень народнага даверу да Вас», — гаворыцца ў размешчаным на афіцыйным сайце Маскоўскага патрыярхата пасланні Прадстаяцеля Рускай праваслаўнай царквы Прэзідэнту Беларусі. Патрыярх Кірыл адзначае, што ў Беларусі створана сістэма царкоўна-дзяржаўнага партнёрства, якая ахоплівае розныя сферы жыцця, яна ўвабрала ў сябе лепшыя прыклады еўрапейскага вопыту з улікам спецыфікі беларускага грамадства. Святейшы Патрыярх выказаў надзею на тое, што Беларусь будзе нязменна ісці па шляху развіцця брацкіх адносін з Расіяй, а таксама з іншымі гістарычна і духоўна блізкімі краінамі. Кіраўнік РПЦ пажадаў Прэзідэнту Беларусі міру, моцнага здароўя і сіл у клопатах на карысць Айчыны.

Серж Саргсян павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з перавыбраннем на пасаду Прэзідэнта Беларусі

Аляксандра Лукашэнку з перавыбраннем на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь павіншаваў Прэзідэнт Рэспублікі Арменія Серж Саргсян.

«Упэўнены, што ваш аўтарытэт, энергія і шматгадовы вопыт дзяржаўнай дзейнасці будуць і ў далейшым служыць на карысць брацкага беларускага народа, устойлівага развіцця і працвітання Рэспублікі Беларусь», — гаворыцца ў віншаванні. Таксама на імя кіраўніка беларускай дзяржавы паступілі віншаванні ад Вярхоўнага Патрыярха і Каталікоса ўсіх армян Гарэгіна Другога, старшыні Палаты дэпутатаў Ліванскай Рэспублікі Набіха Беры і Апостальскага Нунцыя ў Рэспубліцы Беларусь Архіепіскапа Марціна Відовіча.

ЗАЗЗЯЛА НАМ СВЯТАЯ НОЧ

Пастырскае пасланне арцыбіскупа Тадэвуша Кандрусевіча на Божае Нараджэнне-2010

Глыбокапаважаныя святары, кансэкраваныя асобы, вернікі Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі!

Ад усяго сэрца вітаю ўсіх вас і віншую з радасным і збаўчым святам Божага Нараджэння. На працягу ўжо больш чым 2000 гадоў хрысціяне з радасцю і надзеяй скіроўваюць свой позірк да падзеі, якая стала пераломнай у гісторыі чалавецтва.

Адзначаючы свята Нараджэння Пана, мы разважаем над словамі Евангелля, што сёння нарадзіўся нам Збаўца (Лк 2, 11). Яны нам добра вядомыя, і мы іх паўтараем кожны год ва ўрачыстасць Божага Нараджэння. Аднак ці задумваемся мы над іх сэнсам?

Бог, не перастаючы быць Богам, стаў чалавекам, стаў адным з нас, стаў ва ўсім, акрамя граху, падобным да нас (Філ 2, 7). Як Бог — Ён вечны, бясконцы, паўсюдна прысутны і ўсемагутны. Як чалавек — абмежаваны часам, прасторай і моцай. Як Бог — Ён з'яўляецца Валадаром смерці. Як чалавек — ёй падуладны. Аднак у святую ноч уцелаўлення Бога час адкрыўся на вечнасць, і святасць Хрыста асвяціла яго.

Сёння мы не толькі ўспамінаем гістарычную падзею Нараджэння Збаўцы. Сэнс гэтага свята пераходзіць у мінулае. Таму сёння мы праслаўляем Хрыста, які, нарадзіўшыся ў Батлееме больш за дваццаць стагоддзяў таму, сваёю ласкай нараджаецца ў сучасным свеце.

Узрушаныя веліччу і таямніцай батлеемскай ночы, мы становімся перад яслямі, каб разам з Марыяй і Юзафам схіляцца над Збаўцам свету. Яны разважаюць над сэнсам знакаў, якія спадарожнічаюць таямніцы Уцелаўлення. Мы разам з імі разважаем над вобразам загорнутага ў пялёнкі Немаўляці, якое ляжыць у яслях, у якім сам Бог набліжаецца да нас, каб адарыць сваім шчасцем і спакоем.

Штодзённае жыццё пацвярджае, што нашыя сэрцы ўстрывожаны, яны шукаюць спакою і не ведаюць, дзе яго знайсці. Псальміст усклікае: Шукаю аблічча Твайго, о Пане (Пс 27 (26), 8). І вось, дзякуючы таямніцы Уцелаўлення, Бог прымае чалавечы вобраз і прамаўляе да нас чалавечай мовай.

Таму святая ноч Божага Нараджэння завяршыла гістарычны перыяд чакання прыйсця на зямлю Бога з чалавечым абліччам і сэрцам, завяршыла духоўную цемру, у якой жыў чалавек падчас Старога Запавету. Яна напоўніла сваім ззяннем не толькі бэтлеемскія яслі, але і ўсё стварэнне, бо, дзякуючы прыйсцю ў свет Божага Сына, чалавек прасвятліўся святлом праўды (Ян 1, 9), — як вучыць св. апостал Ян.

Аднак той жа апостал Ян нагадвае, што Бог прыйшоў да сваіх і свае Яго не прынялі (Ян 1, 11). Гэта азначае, што, нягледзячы на духоўнае святло, якое выпраменьвае Езус Хрыстус, чалавек выбірае грахоўную цемру і любіць яе больш за святло ласкі.

Гістарычны досвед паказвае, што калі чалавек сваё жыццё не будуе на падмурку праўды, то на самой справе яно не рэалізуецца. Знешне яно можа выглядаць нармальным, нават, можа, вельмі добрым. Аднак раней ці пазней памылка праявіць сябе ў трагедыі лёсу чалавека і нават цэлых грамадстваў.

Адрачэнне ад Бога і непаслухмянасць Яго запаведзям вядзе да Божай кары. Так было з нашымі першымі бацькамі Адамам і Евай. Так было, калі выбраны народ не слухаў Бога, выракаўся Яго і замест праслаўлення свайго Стварыцеля праслаўляў залатога цяльца. Непрыняцце Божага закону праяўляецца ў неадпаведным стылі жыцця чалавека, які пагражае яго годнасці, што мы вельмі часта бачым у сучасным свеце.

Да цемры сучаснага свету найперш належыць небывалае дагэтуль усемагуцце матэрыяльных каштоўнасцяў і нават іх абагаўленне. Грошы заўсёды адыгрывалі вялікую ролю ў жыцці людзей. Аднак у апошні час бурнага развіцця працэсаў глабалізацыі яны перавысілі амаль што ўсе міжчалавечыя адносіны. А тым часам «корань усялякага зла — гэта любоў да грошай» (1 Цім 6, 10), — як вучыць св. апостал Павел.

Нездаровае імкненне любым коштам да матэрыяльных каштоўнасцяў дапаўняецца залежнасцю спажывальніцтва, так што чалавек у сваім жыцці кіруецца правілам: зарабляць і траціць. Усё часцей можна ўбачыць рэкламны лозунг: «I love shopping» — «Я люблю рабіць пакупкі».

Цёмнай ноччу сучаснага свету ў ззянні святла рэкламы і неонаў з'яўляецца крызіс сям'і: законы, якія, з аднаго боку, дазваляюць забіваць як народжанае, так і ненароджанае жыццё, а з іншага — дазваляюць штучнае апладненне; імкненне да абсалютнай свабоды без адказнасці; імкненне лібералізацыі Божага закону, які па сваёй сутнасці нязменны; выкарыстанне дасягненняў генетыкі ў амаральных мэтах як, напрыклад, імкненне да кланавання чалавечага арганізму ці выкарыстоўванне эмбрыёнаў у касметычнай прадукцыі; нязгоднае з Божай воляй сэксуальнае жыццё і імкненне да так званага бяспечнага сэксу, што ўжо прывяло да пандэміі СНІДу; алкагалізм, наркаманія, карупцыя, насілле і многае іншае.

Вялікім выклікам з'яўляецца таксама тэрарызм, які, імкнучыся да валодання зброяй масавага паражэння, пагражае свету.

Сёння дзякуючы мас-медыя можна даведацца практычна пра ўсё. Аднак ці ўсе гэтыя веды спрыяюць нашаму чалавечаму і духоўнаму развіццю? Ці ўзбагачаюць яны маральна чалавека і яго індывідуальнасць? У наш час відавочная тэндэнцыя СМІ нават да замены выхаваўчых функцый сям'і выхаваўчымі ўстановамі. Закладзеныя шматлікімі жыццёвымі праблемамі бацькі не маюць часу нават паразмаўляць са сваімі дзецьмі. Тыя ж у такой сітуацыі чэрпаюць веды аб жыцці з вуліцы і мас-медыя, якія вельмі часта паказваюць рэчаіснасць вельмі павярхоўна або дэфармуюць яе.

СТАР.2

МІНІМАЛЬНАЯ ЗАРАБОТНАЯ ПЛАТА Ў БЕЛАРУСІ З 1 СТУДЗЕНЯ 2011 ГОДА ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА ДА BR460 ТЫС.

Мінімальная заработная плата ў Беларусі з 1 снежня 2011 года ўстанаўліваецца ў памеры Br460 тыс. Такое рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў Беларусі ад 20 снежня 2010 года № 1844, паведамілі БЕЛТА ў Апараце Саўміна.

Таксама гэтай пастановай устаноўлена пагадзінная мінімальная заработная плата ў памеры Br2710. Дакумент прыняты ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2002 года «Аб устанаўленні і парадку павышэння памеру мінімальнай заработнай платы».

Нагадаем, што мінімальная заработная плата ў Беларусі з 1 лістапада 2010 года складала Br400 тыс., пагадзінная мінімальная заработная плата — Br2360. Павелічэнне МЗП садзейнічае ўзмацненню сацыяльнай абароненасці нізкааплатных катэгорый работнікаў усіх арганізацый галін эканомікі незалежна ад формы ўласнасці. МЗП з'яўляецца дзяржаўным мінімальным сацыяльным стандартам у галіне аплаты працы, які забяспечвае сацыяльную абарону работнікаў у сферы працоўных адносін.

Напярэдадні

«...ЖЫЦЬ ТАК НЕ ТОЛЬКІ СКЛАДАНЕЙ, АЛЕ І ЦІКАВЕЙ»

Націск у слове «гады» схільны перастаўляць многія. Бо яно ж і насамрэч: толькі ўчора, здаецца, пачалося стагоддзе, стартаваў той новы 2001-ы, 2005-ы, 2010-ы, а ўжо на табе — чарговы фініш з уласцівай яму перадсвяточнай мітуснёй. Бо трэба ж — гэта святое — купіць падарункі і паштоўкі, адправіць пасылкі і грашовыя пераводы, аддаць даўгі (у тым ліку за камунальныя паслугі, мабільны і кватэрны тэлефон, ахову жытла, кабельнае або спадарожнікавае тэлебачанне, аформіць падпіску на абраныя выданні)...

Іншымі словамі — калі не ўсе, то вельмі многія дарогі вядуць на пошту. Яна, сталічная, цягам звычайных сутак толькі прымае (не кажучы пра дастаўку) каля 130 тысяч адпраўленняў пісьмовай карэспандэнцыі, 2700 пасылак, 3400 электронных грашовых пераводаў, 89 тысяч друкаваных сродкаў масавай інфармацыі...

Пра тое, як працуюць паштавікі ў дні, скажам так, не зусім звычайныя — перадкалядныя, размова з начальнікам вытворчасці «Мінская пошта» Аленай ТРУБАЧ.

— Так, свайго роду «дзяваты вал» на нашым прадпрыемстве ўжо пачаўся, — гаворыць Алена Уладзіміраўна. — Пайшлі навагоднія паштоўкі, пасылкі, вельмі шмат адпраўленняў міжнароднай пошты — з Германіі, са Злучаных Штатаў, з Расіі...Толькі іх аб'ём за апошнія 20 дзён павялічыўся на 40 працэнтаў. Ранейшым штатам апрацаваць такую колькасць паступленняў было б немагчыма. Дапамагаюць практыканты — студэнты каледжа сувязі, запрашаем папрацаваць нашых пенсіянераў. Іншымі словамі, і адпраўшчыкі, і атрымальнікі віншаванняў, іншай карэспандэнцыі могуць не хвалявацца: па адрасах будзе дастаўлена ўсё. У тым ліку і наша традыцыйнае пісьмовае віншаванне ад Дзеда Мароза.

СТАР.4

АВАРЫЯ НА НАФТАПРАВОДЗЕ

Вечарам, побач з в. Грушаўка (Камянецкі раён) на ўчастку нафтаправода РУП «Гомельтранснафта «Дружба» адбыўся разрыў трубы.

Нафта разлілася на ўчастку памерам 200 на 300 м і загарэлася. Вогненны слуп дасягаў 40 метраў у вышыню.

На месца аварыі прыбылі нарады раённых аддзелаў НС з Камянецкага, Пружанскага, Жабінкаўскага, Брэсцкага раёнаў са спецтэхнікай, 3 аварыйныя брыгады РУП УП «Брэстаблгаз», брыгада хуткай дапамогі, следча-аператыўная група, пракурор раёна...

Эвакуацыю жыхароў в. Грушаўка не праводзілі. Ачаг быў лакалізаваны. Прычыну загарання і страты ўстанаўліваюць.

СТАР.2

ISSN 1990 - 763X

БЕЛИНВЕСТБАНК

Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк» сообщает 29 декабря 2010 года в помещении Центрального банка по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 29 в 11.00 часов проводится внеочередное общее собрание акционеров банка в заочной форме.

В повестку дня внеочередного общего собрания акционеров банка (далее – Собрание) внесены следующие вопросы:

1. О процедурных вопросах
2. Об увеличении уставного фонда ОАО «Белинвестбанк».
3. Об утверждении Решения о выпуске простых (обыкновенных) акций ОАО «Белинвестбанк».
4. О внесении изменений в Устав ОАО «Белинвестбанк».

Дата формирования реестра владельцев акций, на основании которого составляется список лиц, имеющих право на участие в Собрании, – 23 декабря 2010 года.

Бюллетени для заочного голосования, иную информацию о проведении Собрания лица, имеющие право на участие в нем, могут получить под роспись при обращении в банк по адресу: 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29, а также в его филиалах по месту учета акций.

Окончательная дата представления заполненных бюллетеней для заочного голосования – 27 декабря 2010 года.

Телефоны для справок: (8 017) 239 01 42, 239 02 87.

www.belinvestbank.by

Открытое акционерное общество
«Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк».
Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 3 от 27.10.2006. УНП 807000028.

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Березинское» (продавец)

проводит повторный открытый аукцион по продаже здания главного корпуса брикетного завода (инв. № 630/С-47233), об. пл. 5092 кв.м, расположенного по адресу: **Минская обл., Молодечненский р-н, Городиловский с/с, вблизи аг. Березинское, территория промышленной зоны, уч. 1.**

Начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 116 009 426 бел. руб.

Задаток – 20 000 000 бел. руб.

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 21.10.2010.

Аукцион состоится **31.12.2010** в 12.00 по адресу: г.Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30.12.2010** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.

ГОМЕЛЬОБЛИМУЩЕСТВО
объекты недвижимости
■ продажа от 35 000 рублей
■ аренда
■ передача в безвозмездное пользование
продажа акций
WWW.GOMELOBLIM.BY
г. Гомель, пр-т. Ленина, 3, тел. +375 232 74 35 92

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.12.2010 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	3 006,00	1 чэшская крона	155,76
▼ 1 еўра	3 940,26	1 польскі злоты	990,15
1 латвійскі лат	5 555,86	▲ 1 расійскі рубель	98,26
1 літоўскі літ	1 141,14	1 украінская грыўня	377,40

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	30,5922
10 UAH	38,3722
1000 BYR	10,1737
EUR	40,1706

Агенцтва Уладзіміра Грэўцова

ФОНД «МОГИЛЕВОБЛИМУЩЕСТВО»
ПРЕДЛАГАЕТ К ПРОДАЖЕ С АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ НЕИСПОЛЬЗУЕМЫЕ ЗДАНИЯ,
расположенные в исторической центральной части города Могилева, являющиеся историко-культурными ценностями Республики Беларусь

двухэтажное каменное здание с полуподвалом общей площадью 836,7 кв.м, расположенное по ул. Лазаренко, 15

двухэтажное каменное здание с подвалом общей площадью 334,2 кв.м, расположенное по ул. Лазаренко, 13/1

двухэтажное каменное здание с подвалом общей площадью 727 кв.м, расположенное по ул. Лазаренко, 7

В соответствии с детальным планом центральной части г. Могилева с проектом регенерации исторической зоны возможно дальнейшее использование указанных зданий под размещение объектов многофункционального административно-торгового и культурно-делового назначения.

Контактные телефоны для справок: 8 (0222) 31 11 85, 22 90 22.

РОЗНЫЯ ЛІСТКІ — ЯШЧЭ НЕ ПЕРАПЫНАК

Твае правы

Не сакрэт, што пік захваральнасці традыцыйна прыпадае на зіму, таму менавіта ў гэты час становіцца асабліва папулярным усё, што звязана з тэмай лісткоў па часовай непрацаздольнасці. Як аплачваецца «бальнічны» сумяшчальніку, ці мае права на падобную выплату жанчына ў водпуску па цяжарнасці і родах, ці ўлічваецца пры прызначэнні памераў выплат час знаходжання ў камандзіроўцы — вось толькі некаторыя распаўсюджаныя і сапраўды няпростыя пытанні. А адказаць на іх мы паспрабуем з дапамогай начальніка аддзела сацыяльнага страхавання Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Ларысы Іванаўны КАПЫЛЬСКАЙ.

Сумяшчальніку — па кожным месцы

Работнік, які працуе на стаўку, вырашае дадаткова аформіцца ў сваёй жа арганізацыі па сумяшчальніцтве, а неўзабаве пасля гэтага афармленя выходзіць на «бальнічны». Як у такой сітуацыі разлічваецца дапамога па часовай непрацаздольнасці?

— Дапамога па часовай непрацаздольнасці прызначаецца па кожным месцы працы, такім чынам, у гэтай сітуацыі дапамога будзе складацца з дзвюх частак, — адзначае Ларыса Капыльская. — Пры гэтым памер дапамогі па асноўным месцы працы разлічваецца, зыходзячы з сярэднядзённага заробку за два папярэднія перад хваробай каляндарныя месяцы. А па месцы працы па сумяшчальніцтве разлік робіцца, зыходзячы з заробку за час ад уладкавання і да выхаду на «бальнічны».

80 або 100?

Не менш тыповая сітуацыя. Работнік спачатку ляжыць у бальніцы, а затым — працягвае лячэнне дома. Ці лічыцца тут непрацаздольнасць бесперапыннай?

— Варта нагадаць, што першыя 6 каляндарных дзён «бальнічнага» аплачваюцца ў памеры 80 працэнтаў, а наступныя дні — у памеры 100 працэнтаў сярэднядзённага або сярэднегадзіннага заробку за працоўныя дні ці гадзіны паводле графіка працы работніка, якія прыпадаюць на перыяд бесперапыннай часовай непрацаздольнасці, — заўважае Ларыса Капыльская. — І тут жа неабходна падкрэсліць: адлік перыяду часовай непрацаздольнасці не спыняецца, калі такая непрацаздольнасць працягваецца бесперапынна або з перапынкамі на выхадныя для работніка дні — за выключэннем сітуацый, калі ў гэты перыяд не наступіў новы выпадак непрацаздольнасці ці не наступілі акалічнасці, якія ўплываюць на памер дапамогі. Прычым пры вызначэнні бесперапыннасці не адыгрывае ролі, выдаваўся лісток часовай непрацаздольнасці адной або некалькімі арганізацыямі аховы здароўя, а таксама — афармлены кожны наступны лісток як першы ці як працяг. Адпаведна, пры пераходзе са стацыянарнага на амбулаторнае лячэнне перыяд часовай непрацаздольнасці з'яўляецца бесперапынным.

Пункт адліку — перавод

Зноў жа цікавы момант. Работнік пераводзіцца ў сваёй арганізацыі на іншае месца, а ўжо праз два дні выходзіць на «бальнічны». Як тут вызначаецца дапамога па часовай непрацаздольнасці?

— Работнікам, якія на працягу двух каляндарных месяцаў перад наступленнем часовай непрацаздольнасці ці непасрэдна ў месяцы яе наступлення былі пераведзены на новае месца, дапамога разлічваецца за час з дня пераводу і да пачатку хваробы, — кажа Ларыса Капыльская. — Інакш кажучы, тут дапамога павінна разлічвацца, зыходзячы з сярэдняга заробку за два дні.

Камандзіроўка — у залік

За час камандзіроўкі за работнікам захоўваецца яго сярэдні заробак. Ці ўлічваецца гэта пры вызначэнні памеру дапамогі па часовай непрацаздольнасці?

— Увогуле дапамога па часовай непрацаздольнасці разлічваецца з сярэднядзённага ці сярэднегадзіннага заробку, які вызначаецца шляхам дзялення заробку за пэўны перыяд на колькасць працоўных дзён ці гадзін у гэтым перыядзе, — тлумачыць Ларыса Капыльская. — Пры гэтым у колькасць працоўных дзён ці гадзін, на якія дзеліцца заробак, не ўключаюцца перыяды вызваленя ад працы ў сувязі з часовай непрацаздольнасцю, працоўным і сацыяльным водпускамі, прастоем па віне наймальніка і ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам. Аднак аплата за перыяд службовай камандзіроўкі ў заробак для вылічэння дапамогі ўваходзіць — паколькі падчас камандзіроўкі выконваецца праца па сваёй прафесіі ці пасадзе і па даручэнні наймальніка.

Дапамога толькі пасля водпуску

Хвароба маці падчас водпуску па цяжарнасці і родах — з'ява даволі распаўсюджаная. І ўсё ж: ці можа быць прызначана такой маці дапамога па часовай непрацаздольнасці?

— Вызначана, што па адным месцы працы не можа прызначацца больш чым адна дапамога па часовай непрацаздольнасці або па цяжарнасці і родах, — адказвае Ларыса Капыльская. — Таму жанчына, якая знаходзіцца ў водпуску па цяжарнасці і родах, права на дапамогу па часовай непрацаздольнасці не мае. Адно, што тут можна зрабіць заўвагу: калі хвароба працягваецца і пасля водпуску па цяжарнасці і родах, то такая дапамога прызначаецца — з наступнага пасля заканчэння гэтага водпуску дня.

Пры поўнай стаўцы можна і на бацьку

Нарэшце, крыху іншы выпадак. Маці выходзіць на працу, калі дзіцяці спаўняецца два гады. Ці магчыма ў такой сітуацыі пры хваробе дзіцяці афармленне «бальнічнага» на бацьку?

— У такім выпадку існуе наступная раскладка, — распавядае Ларыса Капыльская. — Калі маці не перапыніла водпуск па доглядзе за дзіцем ва ўзросце да 3 гадоў і выйшла на працу не больш чым на палову стаўкі, то права на дапамогу па часовай непрацаздольнасці ў сувязі з хваробай дзіцяці мае толькі яна. Аднак калі маці выйшла на поўную стаўку, то дапамога па часовай непрацаздольнасці можа быць прызначана і іншай асобе, якая даглядае хворае дзіця, і ў тым ліку — бацьку.

Сяргей ГРЫБ.

ЗАЗЯЛА НАМ СВЯТАЯ НОЧ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Імклівае развіццё сучаснага свету з яго выклікамі моцна ўплывае на стан грамадства. У ім, як грыбы пасля дажджу, растуць высокія будынкі, але адначасова паніжаецца маральнасць. Будуюцца ўсё шырэйшыя аўтастрады і адначасова звужаюцца гарызонты духоўнага жыцця. Купляецца ўсё больш і адначасова ўсяго мала. Усё большыя памяшканні і адначасова ўсё меншыя сем'і. Усё больш адукаваных людзей і адначасова ўсё менш добрай волі. Усё больш экспертаў і адначасова ўсё больш праблем. Усё больш лекаў і адначасова ўсё больш хваробаў. Больш працяглым становіцца фізічнае жыццё і адначасова абмяжоўваецца духоўнае. Вядзецца пошук жыцця ў космасе і адначасова праводзіцца генацыд пачатага і ненароджанага жыцця. Усё больш абагаўляецца тэлебачанне, інтэрнэт, багацце, прыемнасці а і нават сам грэх, і адначасова занядбоўваецца Бог.

А чым жа па сваёй сутнасці з'яўляюцца выказванні пра адноснасць маральных нормаў? Зусім нядаўна на гэта звярнуў увагу Святы Айцец Бенядыкт XVI. Ён падкрэсліў, што хоць некаторым такая тэндэнцыя здаецца дапаўненнем свабоды, на самай жа справе пагражае яе знішчэнню, бо навязваецца як сапраўдная дыктатура (http://www.zenit.org/article-24611?l=italian).

Такія цёмныя з маральнага пункту гледжання бакі сучаснага жыцця, якія абагаўляе свет і якім пакланяецца, падтрымліваючы гарызантальнае і аднабаковае бачанне чалавека, пагражаюць перш за ўсё годнасці чалавечай асобы. Чалавек, шукаючы сэнс свайго існавання, свабоды і любові, крыніцай якіх з'яўляецца Бог, звяртаецца не да Яго, але да свету. У ім пачынае панаваць свецкі, а не Божы дух. Вечныя Божыя праўды, адзіныя, якія могуць перамяніць нашае жыццё, сёння перастаюць быць ідэаламі. Яны, аднак, настойліва выцясняюцца з нашага жыцця прапагандай маральнай безадказнасці, эгаізму, імкнення да багацця і спажывальніцтва, страты пачуцця граху і г.д. Усё гэта нагадвае пра дэфіцыт маральных каштоўнасцяў у сучасным свеце. Аднак эканамічныя дасягненні без падтрымкі іх духоўнымі каштоўнасцямі з'яўляюцца нічым іншым, як калосам на гліняных нагах, аб чым вельмі добра нагадвае эканамічны крызіс, які паразіў увесь свет. Таму трэба заўсёды памятаць, што замена сапраўдных каштоўнасцяў фальшывымі вядзе да крызісу як у жыцці канкрэтнага чалавека, так і цэлых грамадстваў і свету.

Трэба таксама памятаць і пра тое, што абагаўленне граху чыніць чалавека нездольным прыняць Божую праўду і прынесці духоўны плён. Тады чалавек становіцца падобным да пустога коласа жыта. Ён можа быць прыгожым і вялікім, але не дасць зерня, з якога выпякаецца патрэбны для жыцця хлеб.

У такіх абставінах духоўнай цемры нам свеціць святло Хрыста, якое заззяла больш за 2000 гадоў таму ў Батлееме. Божае святло прыйшло на зямлю, несучы з сабой Божую праўду і невычарпальны зарад духоўнага аднаўлення, каб развеяць цемру чалавечага сэрца.

Простыя батлеемскія пастухі ўбачылі гэтае святло і, асветленыя верай, распазналі ў Немаўляці ўцелаўлёнага Бога. Такім чынам яны далі пачатак Яго праслаўленню, якое трывае праз пакаленні. Мы таксама павінны праслаўляць Збаўцу. Падчас вызнання веры на словы «ўцелавіўся ад Духа Святога і стаў чалавекам» сёння мы схіляем свае калені і ўшаноўваем уцелаўлёнага Бога, бо становімся сведкамі любові, якая адкрывае час святла, радасці і надзеі.

Абвяшчаю вам вялікую радасць: нарадзіўся сёння Збаўца (Лк 2, 10—11). Падчас гэтай святой ночы гучыць у нашых касцёлах гэты голас анёла, які таксама з'яўляецца запрашэннем прыняць Збаўцу. Нам нельга заставацца пасіўнымі і толькі чакаць. Нам трэба прыняць Хрыста ў свае сэрцы, у нашыя дамы, вёскі, гарады і ў наш народ.

Урачыстасць Божага Нараджэння павінна ажывіць у нашых сэрцах агонь веры, каб мы маглі жыць у яго бляску і цяпле, маглі асвятляць ім і саграваць іншых. Як многа дабра мы можам учыніць з Хрыстом, нягледзячы на розныя супярэчнасці, з якімі сустракаемся штодзённа. Толькі Хрыстус надае сэнс усяму таму, што мы робім.

Сучасны, поўны рэкламы, свет прапануе нам свае парады, як дасягнуць улады ці жыццёвага поспеху і як забяспечыць сваю будучыню. Нават калі некаторыя з іх і вартыя ўвагі, аднак усе яны адносяцца толькі да невялікага фрагмента нашага жыцця, і пры тым другаснага значэння. Для Бога ж не з'яўляюцца важнымі нашыя становішчы і дасягненні. Яму важна, якімі мы на самай справе з'яўляемся, ці любім мы Бога і бліжняга так, як навучае Езус Хрыстус, які не прыйшоў, каб Яму служылі, але каб служыць і аддаць сваё жыццё дзеля збаўлення свету (Мц 20, 28).

Хрысціянства адухаўляе жыццё, калі становіцца новым уцелаўленнем і ўвасабленнем Божага духа. Яно не адмаўляецца ад часовых каштоўнасцяў, аднак трактуе іх як выкарыстаны належным чынам «інструмент», які спрыяе ўзросту дабра ў свеце. Аптымізм нашай веры нараджаецца з пошуку духоўных каштоўнасцяў і ўнутранага, а не вонкавага шчасця. Толькі тады ўсё тое, што часовае, можа быць абагаўлёна. Пра гэта нам нагадвае таямніца Уцелаўленя.

Сутнасць святкавання Нараджэння Хрыста ў тым, што яно набліжае нам Збаўцу і Яго нязменную праўду. Бог ізноў таямнічым чынам нараджаецца ў глыбіні нашых душ, каб мы мелі жыццё (Ян 10, 10). Гісторыя батлеемскай ночы ўваходзіць у нашае жыццё, дапамагае ўбачыць яго з іншага боку і такім чынам, што тое, што яшчэ зусім нядаўна здавалася важным, цяпер паўстае малазначным, якое хутка мінае, саступаючы месца вечнай Божай праўды.

Таму, зачараваны цудам батлеемскай ночы, абудзіся, чалавек! Абудзіся з граху, і табе заззяе святло Хрыста!

Дзеля нас і дзеля нашага збаўлення Бог стаў чалавекам. Мы навекі засталіся б памерлымі духоўна, калі б Ён не нарадзіўся ў адпаведны час. Мы не былі б вызвалены з граху, калі б Ён не прыняў цела, падобнае да нашага грахоўнага цела. Мы былі б асуджаны на неміласэрную вечнасць, калі б Бог не праявіў сваю бязмежную міласэрнасць. Мы не атрымалі б жыцця вечнага, калі б Ён добравольна не пайшоў на смерць. Мы па-ранейшаму блукалі б, калі б Ён не прыйшоў у гэты свет, каб знайсці нас.

О святая і такая доўгачаканая ноч! Ты назаўсёды злучыла Бога з чалавекам! Запалі зноў у нас надзею, абудзі здзіўленне, запэўні перамогу любові над нянавісцю і жыцця над смерцю!

Дарагія браты і сёстры!

Яшчэ раз віншую вас з радасным і збаўчым святам Божага Нараджэння! Віншую католікаў і іншых хрысціян, якія адзначаюць сёння гэтае свята! Віншую братоў і сясцёр праваслаўных, якія ўжо зусім хутка будуць праслаўляць уцелаўленне Сына Божага!

Праблемы і выклікі сучаснага свету такія небяспечныя і нясуць такую вялікую пагрозу, што ўсім нам разам трэба ўчыніць усё магчымае, каб ззянне батлеемскай ночы асвяціла сваёй ласкай усіх людзей і яны вачыма душы ўбачылі таго, хто ёсць дарога, праўда і жыццё (Ян 14, 6), таго, у якім чалавек можа пазнаць сябе, таго, хто заўсёды застанецца верным, і таго, хто адорвае сапраўдным спакоем, шчасцем і радасцю.

Віншую ўсіх людзей добрай волі! Сын Божы стаўся чалавекам з любові да ўсіх людзей і ўсіх збавіў. Усім вам жадаю шчаслівых святаў Божага Нараджэння. Святаў добрых, спакойных і поўных духоўнай радасці. Няхай Езус, які нараджаецца падчас Эўхарыстыі, знойдзе ў нашых сэрцах годнае памяшканне, у якім будзе прыняты з верай і любоўю, з адноўленым захапленнем і спакоем. А свет батлеемскай зоркі няхай стане ўказальнікам на нашым шляху да сапраўднага шчасця.

З гэтымі пажаданнямі дзялюся з вамі аплаткай — знакам еднасці ў Хрысце і, давяраючы вас Марыі — Маці Збаўцы, — ад усяго сэрца благаслаўляю ў імя Айца, і Сына, і Духа Святога. Амэн.

Арцыбіскуп Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ, Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі.

ЗАКАЗ НА... ЗАБОЙСТВА

У Мінску папярэджана спроба расправіцца з бізнэсменам

29-гадовы мінчанін наняў кілера, каб «разабрацца» з дырэктарам таварыства з абмежаванай адказнасцю, якому завінаваціў буйную суму грошай.

Як распавёў карэспандэнту «Звязды» старшы памочнік пракурора горада Мінска Сяргей Балашаў, «ногі» ў гэтай крымінальнай гісторыі «выраслі» два гады таму, калі падазроны разам з сяброўкай задумалі пабудаваць кватэру, а пасля яе прадаць: такім чынам яны планавалі зарабіць грошай. Праўда, каб рэалізаваць задуманае, патрабаваўся капітал. На дапамогу прадпрымальнаму мужчыну прыйшоў сусед па пад'ездзе, дырэктар аднаго з таварыстваў з абмежаванай адказнасцю, які і пазычыў патрэбныя сродкі. Як высветлілася, у агульнай складанасці на будаўніцтва жылля ён даў 36 тысяч долараў. Толькі вось грошы пайшлі не па прызначэнні: кватэру мінчанін так і не пабудаваў, а пазычанае патраціў. Зразумеўшы, што вяртаць няма чаго, падазроны вырашыў расправіцца са сваім крэдыторам. А па параду, як дзейнічаць, звярнуўся да свайго знаёмага, які ўжо пабываў у месцах не вельмі аддаленых.

Інфармацыя пра тое, што мінчанін шукае кілера, каб устараніць чалавека, паступіла ў Міністэрства ўнутраных спраў. Падчас праведзенай спецаперацыі заказчык знайшоў-такі «кілера», і для кліента апошняга было інсцэніравана забойства. Затрымалі ж злымысніка ў той момант, калі ён перадаваў «ганарар» у 5 тысяч долараў «выканаўцу» заказу. Мінчаніну прад'яўлена абвінавачанне ў падрыхтоўцы да ўчынення забойства па найме.

Ігар ГРЫШЫН.

У сувязі са святам наступны нумар газеты «Звязда» выйдзе 28 снежня.

РАСІЙСКІ ПАСОЛ АБ ВЫБАРАХ І АПАЗІЦЫІ

Учора на прэс-канферэнцыі, прысвечанай беларуска-расійскаму супрацоўніцтву ў 2010 годзе, пасол Расійскай Федэрацыі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў адразу ўзяў, як гаворыцца, быка за рогі: не чакаючы пытанняў, сам адказаў, як ён, прадстаўнік палітычнага кіраўніцтва Расіі, ацэньвае вынікі прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі.

Пасол сказаў, што «нам было зразумела ўсё з самага пачатку, які будзе расклад галасоў. Мы прагназавалі далёка за 70 працэнтаў» на карысць дзейнага прэзідэнта — так яно і атрымалася. Разумела гэта і апазіцыя. Але яна зрабіла стаўку на плошчу. Хоць нават і не даслала запыту ў гарвыканкам на правядзенне мітынгу. Чаму? На думку Аляксандра Сурыкава, кандыдаты ў прэзідэнты бачылі, што яны не выйграюць выбары, а таму засяродзіліся на спробе правесці сваю «каляровую» рэвалюцыю. Бо галоўная мэта апазіцыі — дасягнуць непрызнання Захадам вынікаў галасавання на прэзідэнцкіх выбарах у Беларусі 2010 года.

Разам з тым, расійскі пасол паспачуваў людзям, якія пацярпелі ў ходзе разгону дэманстрацыі. Але, на яго погляд, само з'яўленне чалавека на несанкцыянаваным мітынгу — ужо адміністрацыйнае парушэнне, за якое прадугледжваецца адказнасць. А апазіцыі дыпламат параіў вучыцца перамагаць у рэальнай канкурэнтнай барацьбе. Для гэтага стваральі партыі, іх структуры на месцах, у тым ліку і нізавыя ячэйкі, каб потым прыцягваць да сябе прыхільнікаў, весці перадвыбарную агітацыю і г. д. Прычым пастаянна, а не толькі ў год выбараў. Вось тады і можна спадзявацца на дасягненне больш важкіх вынікаў галасавання, казаў пасол. А на разуменне пасла, такія палітычныя партыі ў нас адсутнічаюць, ёсць групы аднадумцаў і жаданне правесці свайго кандыдата ў прэзідэнты.

Пасол прызнаўся: «Мы «перакапалі» ўсё беларускае заканадаўства, знайшлі артыкул Выбарчага кодэкса аб тым, што кандыдаты ў прэзідэнты на працягу трох дзён пасля галасавання могуць падаць скаргу ў Цэнтрвыбаркам. І больш нічога, што датычыла недатыкальнасці кандыдатаў у прэзідэнты. Яны пасля выбараў — звычайныя грамадзяне. Таму затрымліваць іх мелі права.

Пасол абверг чуткі аб тым, што непрызнанне выбараў у Беларусі Захадам надзвычай выгадна Расіі, бо, маўляў, «прывяжа Лукашэнку да Масквы». З гэтай нагоды Аляксандр Аляксандравіч слушна заўважыў, што Расію і Беларусь даўно звязала гісторыя і лёс. Выбары — расійскія, беларускія — гэта толькі рыса ў гісторыі дзвюх краін, невялікая рыса змены ўладаў. І не трэба гэтыя рэчы ніяк звязваць. Ён таксама падкрэсліў: «Ёсць народы, яны вечныя, і ёсць кіраўнікі дзяржаў, якія змяняюцца. Таму я гэтыя рэчы проста не звязваю, а звязваю адзінства лёсаў двух народаў, якое парваць немагчыма», — сказаў пасол.

Дыпламат таксама адзначыў: адзінства народаў Беларусі і Расіі — фундаментальная з'ява. Па яго словах, мы адзіны народ, і ў нас агульны лёс. Нават калі ў публічнай рыторыцы пачынае іскрыць, кіраўнікі Расіі і Беларусі не сыходзяць з гэтых пазіцый. Ён назваў чаовай з'явай, натуральнымі некаторыя непразуменні інтэграцыйнага будаўніцтва, якім, на жаль, надаецца публічны характар.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Абзац

Жыхары Віцебскай вобласці могуць атрымаць у арэнду да 3 га зямлі для вядзення асабістых падсобных гаспадарак. Гэта прадугледжана абласной праграмай развіцця і падтрымкі падсобных гаспадарак на 2011-2015 гады, якую ўчора на пазачарговай сесіі зацвердзілі дэпутаты аблсавета.

Па звестках Дзяржкамстата, з пачатку года ў Беларусі больш за ўсё падаражала бульба, яе кошт павялічыўся на 46,8%. Крупы выраслі ў цане на 37,4%, алей — на 33,6%, сметанковае масла — на 32,7%. Цукар стаў даражэйшы на 27,8%, сыры — на 17,5%, кандытарскія вырабы — на 15,2%, садавіна — на 16,9%. Менш за ўсё выраслі ў цане рыба і морапрадукты — на 4,3%, макаронныя вырабы — на 1,8%, мука пшанічная — на 0,9%, хлеб і хлебабулачныя вырабы — на 4%. Цэны на алкагольныя напоі выраслі ў сярэднім на 8,7%.

Два рабочыя загінулі на будоўлях Мінска ў адзін дзень. Першы выпадак адбыўся на аб'екце, які будуецца ў раёне вуліцы Каліноўскага. Мантажнік 1956 г.н. па неасцярожнасці ўпаў у міжлесвічны пралёт з вышыні 3 м і памёр на месцы. У той жа дзень на аб'екце на вул. Кальварыйскай са стралы будаўнічага крана сарвалася жалезабетонная пліта. Яна пашкодзіла перакрыцце 10-га паверху, дзе працаваў электрык. Мужчына 1958 г.н. упаў на зямлю і памёр на месцы.

Выступленне беларускіх артыстаў на навагоднім карпаратыве будзе каштаваць у залежнасці ад выбранага фармату вечарынкі, працягласці імпрэзы і коштаў, якія называюць майстры сцэны. Так, група Litesound гатовая выканаць свае хіты за $1600, Аня Шаркунова — на сто долараў менш, за тысячу гэтых жа грашовых адзінак выступяць Герман, Галіна Шышкова, Ларыса Грыбалёва, Алена Грышанава. Група «3+2» возьме за міні-канцэрт $1500, Atlantica — у сярэднім $1800. Заслужаныя артысткі Беларусі Ірына Дарафеева і Іна Афанасьева праспяваюць за $2000 і $2600 адпаведна. Мастацкі кіраўнік ансамбля «Сябры» народны артыст Беларусі Анатоль Ярмоленка разам з Алесяй і Dj Анатолем готовыя выступіць за $3300, паведамляе БЕЛТА.

Поўны абзац

Амерыканскія ўрачы дасталі з вуха пацыента жамчужыну, з якой ён пражыў 41 год. Паводле слоў 46-гадовага Кэлвіна Райта з Атэнс-Кларка ў штаце Джорджыя, людзі заўсёды казалі, што ён вельмі гучна размаўляе. Сам Райт гэтага не адчуваў. У снежні 2010 года амерыканец звярнуўся ў бальніцу з-за бранхіту. Медсястра праводзіла агляд і выявіла ў вуху пацыента іншароднае цела, але дастаць яго не змагла і таму накіравала яго да ЛОР-урача, які дастаў з вуха амерыканца жамчужыну. Аказалася, што ў пяцігадовым узросце Кларк з малодшай сястрой парвалі жамчужныя каралі сваёй маці і рассыпалі пацеркі. Сястра ў працэсе гульні засунула дзве жамчужыны ў вуха брата. Маці адвезла сына ў бальніцу, дзе ўрачы дасталі іншародны прадмет. Але, як высветлілася, адна жамчужына засталася ў вуху. Пасля таго, як дасталі пацерку, Райт адзначыў значнае паляпшэнне слыху. Ён таксама паведаміў, што некалькі разоў у жыцці яго слыхавыя хады аглядалі, аднак ніводзін медработнік не знайшоў іншароднага прадмета.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

АВАРЫЯ НА НАФТАПРАВОДЗЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На думку спецыялістаў, пагрозы для забруджвання прадуктамі гарэння вёскі Грушаўка, якая знаходзіцца на адлегласці двух кіламетраў, і таго, што нафта трапіць у возера Ажыннікі (адлегласць 3,5 кіламетра), няма. Як сведчаць праведзеныя папярэднія падлікі, з нафтаправода выйшла каля 70 кубічных метраў нафты, разлілася яна на плошчы 1,2 гектара. На гэтай плошчы паліва і гарэла. Выратавальнікі спачатку ўзвялі са снегу і зямлі своеасаблівую агароджу, папярэдзіўшы далейшае распаўсюджванне нафты, а потым ў названых межах ліквідавалі гарэнне.

Пасля ліквідацыі пажару аварыйна-ўзнаўляльныя службы прыступілі да работы па запампоўцы нафты, якая выцекла, у паралельны нафтаправод. Для ліквідацыі аварыі прыцягнуты 51 адзінка тэхнікі і 139 чалавек, у тым ліку 33 адзінкі тэхнікі і 93 спецыялісты МНС. На месцы працуе камісія па выяўленні прычын аварыі. Прычыны будуць названыя пазней. Вядома толькі, што пазаўчора на гэтым участку нафтаправода праводзіўся капітальны рамонт з распрацоўкай грунту экскаватарам, вялася замена ізаляцыйнага пакрыцця з прымяненнем дызель-генератарнай устаноўкі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ, Святлана ЯСКЕВІЧ.

Минский городской территориальный фонд государственного имущества

отказывается от проведения аукциона с применением метода понижения начальной цены по продаже имущества республиканской собственности — транспортных средств в количестве 23 единиц, объявленного на 30 декабря 2010 г. Извещение о проведении аукциона, опубликованное в газете «Звязда» 30 ноября 2010 г. № 234 (26842), считать утратившим силу.

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО» сообщает об отказе от проведения аукциона, назначенного на 28 декабря 2010 года в 12.00 (газета «Звязда» за 23 ноября 2010 года № 229) по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине: части не завершенного строительством производственного корпуса № 4 в осях 32-34, расположенного по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, д. 31а, находящегося в хозяйственном ведении республиканского унитарного предприятия «Молодечненский завод металлоконструкций».

Калектыў «Звязды» выказвае шчырыя спачуванні свайму былому супрацоўніку, намесніку галоўнага рэдактара газеты «Рэспубліка» Міхаілу Кучко з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці МАЦІ.

ЗАВЕРЕНО
Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
_____А.Л.Гальперин
23.12.2010

УТВЕРЖДЕНО
Общим собранием Участников
КСО «Внешэкономстрой» ООО
03 декабря 2010 года
(протокол № 33)

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об открытой продаже жилищных облигаций двенадцатого, тринадцатого, четырнадцатого, пятнадцатого, шестнадцатого и семнадцатого выпусков Коммерческой совместной организации «Внешэкономстрой» общество с ограниченной ответственностью (КСО «Внешэкономстрой» ООО)

Раздел 1. Общие сведения об эмитенте

1. Наименование эмитента.
На белорусском языке:
полное наименование: Камерцыйная сумесная арганізацыя «Знешэканомбуд» таварыства з абмежаванай адказнасцю;
сокращенное наименование: КСА «Знешэканомбуд» ТАА.
На русском языке:
полное наименование: Коммерческая совместная организация «Внешэкономстрой» общество с ограниченной ответственностью (далее по тексту – эмитент);
сокращенное наименование: КСО «Внешэкономстрой» ООО.

2. Место нахождения эмитента: 220004, Республика Беларусь, г. Минск, пр. Победителей, д. 23, к. 3, оф. 208А; **телефон:** (017) 218 15 56; **факс:** (017) 218 15 55; **электронный адрес (e-mail):** market@vnesheconomstroy.by.

3. Основной вид деятельности эмитента:
согласно Общегосударственному классификатору Республики Беларусь «Виды экономической деятельности» ОКРБ 005-2006
701 – Операции с собственным недвижимым имуществом.
Эмитент вправе осуществлять функции заказчика (застройщика) согласно «Инструкции о застройщике, заказчике в строительстве», утвержденной приказом Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь 22 июня 1999 г. № 174 (с учетом изменений в действующей редакции).

4. Номер расчетного счета эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи, наименование обслуживающего банка: р/с № 3012004529008 в ОАО «Белвнешэкономбанк», г. Минск, ул. Мясникова, 32, код 226.

5. Бухгалтерская отчетность эмитента в составе, определенном пунктом 9 Инструкции о порядке представления отчетности и раскрытия информации участниками рынка ценных бумаг, утвержденной постановлением Комитета по ценным бумагам при Совете Министров Республики Беларусь от 16 декабря 2005 г. № 10/П «О некоторых вопросах представления отчетности и раскрытия информации участниками рынка ценных бумаг», в соответствии с законодательством в периодическом печатном издании не публиковалась и ее опубликование не требуется.

6. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента: Открытое акционерное общество «Белвнешэкономбанк» (далее по тексту – депозитарий).
Место нахождения депозитария: Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, ком. 607. Зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 12 декабря 1991 года, регистрационный номер 24.
Специальное разрешение (лицензия) № 02200/0247744 на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, выдано (продлена) Министерством финансов Республики Беларусь депозитарию на основании решения от 13 июля 2007 года № 243 сроком на 5 лет и действительна до 29 июля 2012 года.

7. Размер уставного фонда эмитента: 1 197 275 (Один миллион сто девяносто семь тысяч двести семьдесят пять) долларов США (уставный фонд сформирован в размере 100 %).

8. Дата и номер государственной регистрации эмитента, наименование органа, его зарегистрировавшего.
Коммерческая совместная организация «Внешэкономстрой» общество с ограниченной ответственностью зарегистрировано Министерством иностранных дел Республики Беларусь 15 августа 2002 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 800015707.

9. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии.
Ознакомиться с Проспектом эмиссии облигаций можно ежедневно (кроме выходных и нерабочих праздничных дней) с 9.00 до 12.30 и с 14.00 до 15.00 (в пятницу, а также в дни, предшествующие выходным и праздничным дням, объявленным нерабочими, с 9.00 до 12.30) начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста краткой информации об открытой продаже облигаций:
- в КСО «Внешэкономстрой» ООО по адресу: г. Минск, пр. Победителей, д. 23, к. 3, оф. 208А;
- в ОАО «Белвнешэкономбанк» по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, каб. 607.

10. Решение о выпуске жилищных облигаций двенадцатого, тринадцатого, четырнадцатого, пятнадцатого, шестнадцатого и семнадцатого выпусков принято 03.12.2010 года на внеочередном Общем собрании Участников (протокол № 33).

11. Объем эмиссии жилищных облигаций составляет:
двенадцатого выпуска – 1 205 458 800 (Один миллиард двести пять миллионов четыреста пятьдесят восемь тысяч восемьсот) белорусских рублей;
тринадцатого выпуска – 862 509 375 (Восемьсот шестьдесят два миллиона пятьсот девять тысяч триста семьдесят пять) белорусских рублей;
четырнадцатого выпуска – 1 778 827 050 (Один миллиард семьсот семьдесят восемь миллионов восемьсот двадцать семь тысяч пятьдесят) белорусских рублей;
пятнадцатого выпуска – 5 385 484 650 (Пять миллиардов триста восемьдесят пять миллионов четыреста восемьдесят четыре тысячи шестьсот пятьдесят) белорусских рублей;
шестнадцатого выпуска – 1 327 294 800 (Один миллиард триста двадцать семь миллионов двести девяносто четыре тысячи восемьсот) белорусских рублей;
семнадцатого выпуска – 1 426 230 000 (Один миллиард четыреста двадцать шесть миллионов двести тридцать тысяч) белорусских рублей.
Количество жилищных облигаций:
двенадцатого выпуска – 196 (Сто девяносто шесть) штук;
тринадцатого выпуска – 125 (Сто двадцать пять) штук;
четырнадцатого выпуска – 242 (Двести сорок две) штуки;
пятнадцатого выпуска – 718 (Семьсот восемнадцать) штук;
шестнадцатого выпуска – 158 (Сто пятьдесят восемь) штук;
семнадцатого выпуска – 159 (Сто пятьдесят девять) штук.

12. Номинальная стоимость одной жилищной облигации:
двенадцатого выпуска – 6 150 300 (Шесть миллионов сто пятьдесят тысяч триста) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (квартира 3-ей категории в «Многофункциональном комплексе» по проспекту Победителей, 27 в г. Минске);
тринадцатого выпуска – 6 900 075 (Шесть миллионов девятьсот тысяч семьдесят пять) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (квартира 5-ой категории в «Многофункциональном комплексе» по проспекту Победителей, 27 в г. Минске);
четырнадцатого выпуска – 7 350 525 (Семь миллионов триста пятьдесят тысяч пятьсот двадцать пять) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (квартира 8-ой категории в «Многофункциональном комплексе» по проспекту Победителей, 27 в г. Минске);
пятнадцатого выпуска – 7 500 675 (Семь миллионов пятьсот тысяч шестьсот семьдесят пять) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (квартира 9-ой категории в «Многофункциональном комплексе» по проспекту Победителей, 27 в г. Минске);
шестнадцатого выпуска – 8 400 600 (Восемь миллионов четыреста тысяч шестьсот) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (квартира 11-ой категории в «Многофункциональном комплексе» по проспекту Победителей, 27 в г. Минске);
семнадцатого выпуска – 8 970 000 (Восемь миллионов девятьсот семьдесят тысяч) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (квартира 12-ой категории в «Многофункциональном комплексе» по проспекту Победителей, 27 в г. Минске).

13. Открытая продажа (размещение) жилищных облигаций проводится с 28 декабря 2010 года и по 23 марта 2012 года.

14. Срок обращения облигаций с 28 декабря 2010 года по 31 марта 2012 года включительно (460 календарных дней).

15. Проведение открытой продажи (размещения) жилищных облигаций осуществляется ОАО «Белвнешэкономбанк» ежедневно (кроме субботы и воскресенья, а также за исключением государственных праздников и

ПУШЧА – ЗІМОВАЯ КАЗКА

Усё болей навукоўцаў і турыстаў прыцягвае галоўны лес Еўропы

Зубры — пушчанскі брэнд.

Пра пушчу напісаны кнігі, складзены песні, створаны цэлыя горы публіцыстычных твораў. Але з пісьменнікаў нашых найлепш, відаць, ухапіў сутнасць векавога лесу Уладзімір Караткевіч у сваім слове пра «гэты самы лепшы куток старажытнай нашай краіны», дзе можна застацца сам-насам з аленямі і зубрамі, з аксамітнымі грабамі і вузлаватымі дубамі, з сумленнем, з чалавечнасцю, з усёй гэтай добрай і адвечнай беларускай зямлёй. І далей: «Гэта не толькі неацэнны скарб усіх на свеце людзей. Галоўнае тое, што мы звязаны з чатырохногімі і пёрыстымі братамі нашымі адзінай повяззю еднасці ўсяго жывога на зямлі. Таму задача і гонар чалавека не забіваць, а бараніць і карміць. Ён зараз і робіць гэта, сапраўдны чалавек»...

Пушча — у кожнага свая. Бо у кожнага, хто хоць аднойчы пабываў у лесе, поўным дзівосаў, ён застаецца ў памяці, свядомасці, уяўленні назаўсёды. У пушчу хочацца вяртацца зноў і зноў, дыхаць яе паветрам, слухаць яе вясновае шматгалоссе і зімовую гучную цішыню.

Караткевіч толькі марыў, каб Белавежская пушча стала нечым накшталт нацыянальнага парку. А сёння яна гэты статус мае, а таксама атрымала шмат адзнак міжнароднага ўзроўню. Так, 14 снежня 1992 года ўчастак высокаўзроставанага лесу Нацыянальнага парку быў уключаны ў спіс Сусветнай спадчыны чалавецтва. На той час на постсавецкай прасторы гэта быў першы аб'ект, удастоены такога ганаровага звання. На наступны год, у 1993-м, пушча атрымала міжнародны статус біясфернага запаведніка, а напрыканцы 1997-га Савет Еўропы ўзнагародзіў Нацыянальны парк Еўрапейскім дыпломам як адну з эталонных прыродаахоўных устаноў на кантыненце. Гэта сапраўднае прызнанне работы, якая праведзена пакаленнямі навукоўцаў, лесаводаў, гаспадарнікаў і праводзіцца зараз. За апошняе дзесяцігоддзе пушча стала не толькі вядомым у свеце навуковым, але і турыстычным аб'ектам. І турысцкай папулярнасці Нацпарку паспрыяў, несумненна, сам Дзед Мароз.

У ГАСЦЯХ У ПУШЧАНСКАГА ДЗЕДА

Цяпер у нашай краіне, мабыць, не засталося школы, а раёна — дык дакладна, адкуль дзеці не бывалі ў гасцях у галоўнага беларускага Дзеда Мароза. Едуць сюды людзі не толькі з нашай рэспублікі, але і іншых далёкіх і блізкіх краін. Дзядуля старанна лічыць для цікавасці і статыстыкі замежныя дэлегацыі, у спісе ўжо значацца 93 краіны. Не так даўно тут сустракалі паўмільённага наведвальніка.

Рэзідэнцыя — гэта сапраўдная казка, асабліва снежнай зімой у перадnавагоднія дні. Дамкі-церамкі зззяюць рознакаляровым святлом, казачныя героі сустракаюцца ледзь не на кожным кроку тутэйшага падарожніка. Цікава і тое, што сядзіба сама па сабе на гістарычным месцы заснавана — тут пачыналася адраджэнне зубрынага статка. Зуброў у пушчы знішчылі падчас Першай сусветнай вайны. Калі да згаданых падзей іх налічвалася ў лесе 720, то да 1919 года быў забіты апошні з цароў векавога лесу. Потым, як вядома, пушча была тэрыторыяй польскай дзяржавы. І толькі пасля вайны, калі большая частка лесу стала нашай, у Польшчы, дзе здолелі захаваць від, купілі пяць жывёлін, для якіх на тэрыторыі цяперашняга маёнтка быў арганізаваны гадавальнік. Адсюль і пайшло рассяленне зуброў. Месца шчаслівае, да таго ж надзвычай маляўнічае.

Зразумела, чаму яно прыйшлося даспадобы казцы, чаму пасяліўся на ім Дзед Мароз. Мы толькі-толькі прыехалі ў дзедаву рэзідэнцыю і засталі дзядулю за гутаркай са школьнікамі з Парахонска Пінскага раёна. Ён распытваў, як дзеці вучацца, якім спортам захапляюцца, якія гурткі наведваюць. Міжволі залюбаваліся, заслухаліся іх харошай гаворкай на роднай мове. Потым сказалі пра гэта Дзеду, а ён аж здзівіўся: «А які ж гэта быў бы беларускі Дзед Мароз, каб не ведаў мовы свае? Гэта быў бы нейкі чужы дзед. Хоць, вядома, калі прыязджаюць госці з Расіі, іншых краін, я адразу з павагі да іх пераходжу на рускую мову. Ну вось, напрыклад, завіталі да мяне аднойчы добрыя хлопчыкі, выхаванцы навігацкай кадэцкай школы, пастроіліся ля ганка і ў адзін голас дружна і зычна: «Здравия желаем, товарищ Дед Мороз!» — «Вольно», — адказаў і запрасіў іх акунуцца ў казку свайго лесу.

А парламентарыяў з Судана давялося спачатку ратаваць ад холаду, а потым ужо гаварыць з імі праз перакладчыка. У пушчы — мінус 15, а госці з афрыканскай краіны, дзе ніжэй за 20 цяпла амаль не бывае, так скарчанелі, балюча глядзець было. Запрасіў іх Дзед у дамок свой да цёплага каміна, там і разгаварыліся.

Гасцей розных бывае ў сядзібе, едуць і едуць сюды людзі кожны дзень. А яшчэ пішуць лісты. Найболей — дзеці. У вялікіх куфрах дзедавай скарбніцы захоўваюцца лісты, на сценах вісяць малюнкі, на паліцах раскладзены падарункі, якія даслалі дзеці. На пісьмы прынята адказваць. І ўсе малыя аўтары лістоў, хто напісаў дакладны зваротны адрас, атрымліваюць адказы і віншаванні казачнага Дзеда.

Вельмі прыемна было пачуць ад экскурсавода, якая суправаджала дзяцей па чароўным маёнтку, не толькі расповед пра яго казачныя дзівосы ды жывую навагоднюю ёлку, самую высокую ў Еўропе, але і пра лясныя клопаты валадара-Мароза: як ён зімой кантралюе, каб травы і іншыя расліны не замярзалі, а жывёлам дапамагае пракарміцца, як сочыць, каб рыбы пад лёдам не задыхнуліся. А вясной птушак сустракае ды месцы ціхія для гнёздаў паказвае, летам назірае, каб усяму жывому вільгаці хапала. Словам, экскурсія нясе ў сабе пэўны элемент экалагічнай адукацыі. Бо пушча — найперш унікальны прыродны аб'ект, адзіны на ўвесь еўрапейскі кантынент.

Генеральны дырэктар Нацыянальнага парку «Белавежская пушча» Мікалай БАМБІЗА: «Шчыра віншую ўсіх чытачоў «Звязды» з Новым годам! Хай ён нясе ўсім здароўе, шчасце, сямейны дабрабыт. Яшчэ зычу кожнаму любіць і разумець прыроду і хоць аднойчы пабываць у Белавежскай пушчы».

ЗАХАВАЦЬ ГЕНЕТЫЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ПУШЧЫ

Працягласць Нацыянальнага парку з поўначы на поўдзень складае 60 кіламетраў, а з захаду на ўсход — ад 10 да 50 кіламетраў. Яго плошча — 163,5 тыс. га. Белавежская пушча — своеасаблівы ў флярыстычных адносінах рэгіён. Гэта ўнікальная лабараторыя для вывучэння біялагічнай разнастайнасці. Геаграфічнае становішча, кліматычныя і глебава-гідралагічныя ўмовы забяспечылі багацце і разнастайнасць флоры. На гэтай параўнальна невялікай тэрыторыі расце каля тысячы відаў раслін, каля 550 відаў імхоў і лішайнікаў.

Тут прадстаўлена ўся разнастайнасць лясоў Беларусі, як па прыродным складзе, узроставай структуры і прадукцыйнасці, так і па тыпах. У пушчы захаваўся ўчастак практычна некранутых першабытных лясоў Еўропы з надзвычай багатай флорай і фаўнай. Сярэдні ўзрост лясоў складае больш чым 100 гадоў, максімальны — 200-300 гадоў, а асобныя дрэвы дажываюць і да 500-600 гадоў. Сапраўдны скарб нацыянальнага парку — мохавыя і травяныя балоты на плошчы ў многія тысячы гектараў. Яны рэгулююць газавы склад атмасферы і гідралагічны рэжым і адыгрываюць важную ролю ў падтрыманні стабільнасці экасістэм і захаванні біяразнастайнасці не толькі раслін, але і жывёл.

Фаўна Белавежскай пушчы налічвае больш за 10 тысяч відаў. Свет млекакормячых прадстаўлены 59 відамі. Гэтая колькасць магла б быць большай, аднак асобныя віды былі знішчаны. Ужо стараннямі чалавека шмат якія віды пазней адноўлены. Пра зубра ўжо гаварылася. Паспяхова акліматызаваны ці рэакліматызаваны алені, бабры, а таксама лані. Апошнія былі знішчаны падчас Першай сусветнай вайны. Асобныя віды звяроў знайшлі ў пушчы прытулак — экалагічную нішу, мігрыраваўшы з іншых месцаў. Добра пачуваюць сябе грызуны, сярод іх найбольш адметны бабёр. З драпежнікаў тут прыжыліся воўк, лісіца, рысь, лясная куніца. Гаспадаром адчувае сябе дзік. Ну а краса і гордасць лесу — лось, алень, казуля.

Навукоўцы нацыянальнага парку рупяцца сёння аб захаванні каштоўнага генетычнага патэнцыялу раслiннага свету пушчы. На сямі з паловай гектарах разбіта пляцоўка пад гадавальнік, на якім будуць вырошчвацца саджанцы ад пушчанскіх дрэў. Цікава, што дрэвы, якія пачыналі расці 600-500 гадоў таму, калі не было ніякай матарызаванай тэхнікі і розных сучасных забруджвальнікаў паветра, маюць іншы генетычны код, чым цяперашнія дрэвы.

Інжынер-лесапатолаг Алена Дземянчук, якая піша па гэтай новай справе дысертацыю, расказала, што аналага будучаму гадавальніку ў нашай краіне няма. Лесаводы маюць намер выкарыстаць сучасны айчынны і замежны вопыт і сканцэнтраваць у гэтым гадавальніку ўсё самае перадавое. Праект рыхтуе інстытут «Белгіпралес». Кансультантамі выступаюць спецыялісты інстытута лесу айчыннай Акадэміі навук. Яны знаёміліся з узорамі такіх аб'ектаў заходніх краін-суседак, аналізавалі, супастаўлялі. Такім чынам паступова стала вымалёўвацца канцэпцыя гадавальніка на аснове самых найноўшых тэхналогій нарыхтоўкі насення, яго захавання, перапрацоўкі і, вядома, вырошчвання.

Выбіраць элітныя дрэвы для пасадачнага матэрыялу будуць на ўзроўні генетыкі, для гэтага спатрэбяцца асобныя даследаванні, і спецыялісты галіновых інстытутаў ужо выказалі гатоўнасць дапамагаць калегам. Тэма дысертацыі аспіранткі Алены Дземянчук гучыць так: «Эколага-эканамічная эфектыўнасць павышэння прадукцыйнасці лясоў як фактар выкарыстання на генетыка-селекцыйнай аснове». Побач з гадавальнікам будуць закладзены плантацыі для вырошчвання маладых дрэў. Элітны пасадачны матэрыял плануецца прапаноўваць іншым аб'ектам ляснога гаспадарання. Ахвотнікі купіць яго знойдуцца, спадзяюцца ў пушчы.

ЦЭНТР ЭКАЛОГІІ І АСВЕТЫ

Музей прыроды Нацыянальнага парку шмат гадоў заставаўся адной з яго славутасцяў. Менавіта з яго пачыналі экскурсанты знаёмства з раслінным і жывёльным светам старажытнага лесу. А да 600-гадовага юбілею запаведнага рэжыму, які адзначылі летась, у Камянюках узвялі новы будынак. Тут размясціўся эколага-асветніцкі цэнтр з музеем прыроды. Арыгінальны дом са шкла і бетону звонку нагадвае невялікі палац. Але галоўнае — унутры. А там шыкоўны музей з вялізнымі дыярамамі, якія адлюстроўваюць багацце тутэйшай прыроды. Дырэктар музея Людміла Грачанік расказала, што пры стварэнні яго канцэпцыі ставілася мэта дасягнуць максімальнага падабенства, так бы мовіць, з натурай. Таму знаёмячыся з экспазіцыяй, наведвальнік мае магчымасць акунуцца ў чароўны свет лясных гукаў, прычым у розныя поры года. Вядома, вясновы хор птушак нікога не пакіне абыякавым, але не менш захапляльныя і зімовыя гукі лесу. Тут можна пачуць рог старадаўніх паляўнічых... і нават убачыць іх у выглядзе манекенаў. У новых дыярамах знайшлося месца старадаўнім пчалярам, князям і шляхце, розным людзям, што ў розныя часы асвойвалі нетры вялікага лесу.

У адной з залаў вока абавязкова спыніцца на белым палацы неверагоднай прыгажосці. Гэта царскі паляўнічы палац, які быў узведзены ў 1894 годзе ў горадзе Белавеж (цяпер гэта польскі бок пушчы). У тым палацы было ажно 133 пакоі. І кожны з іх меў назву: пакойчык ранішняй зары; дубовы, кляновы, аздобленыя адпаведнай драўнінай; паштовы пакой быў абклеены спрэс маркамі, гульнявы — картамі. Апартаменты імператрыцы архітэктар зрабіў у выглядзе гнязда ластаўкі. Гэтая прыгажосць засталася толькі на здымках сучаснікаў ды на макетах — да нашага часу палац не захаваўся.

Неўзабаве ў новым музеі на


Сядзіба беларускага Дзеда Мароза — адно з самых вядомых месцаў на абшарах старажытнай пушчы.


Брастаўчанка Юлія МІНЬКО з маленькай Арынай прыехала да Дзеда Мароза на экскурсію.

У Людмілы ШКУРДАЙ адказная пасада — яна загадвае маёнткам Дзеда Мароза і ўручае гасцям навагоднія падарункі з чароўнага куфэрка.

Белавежская пушча — месца працы маладога спецыяліста, знаўцы лесу Алены ДЗЕМЯНЧУК.

ПАСЛЯ ЮБІЛЕЮ

Як ужо гаварылася, восенню 2009 года ў Нацыянальным парку ўрачыста адзначылі 600-годдзе запаведнага рэжыму. Да свята ўзвялі не толькі эколага-асветніцкі цэнтр, пра які было сказана. Абсталявана некалькі новых гасцініц і рэстаранаў, узведзены іншыя аб'екты інфраструктуры, накіраваныя перш за ўсё на развіццё турызму. Цяпер у Камянюках ёсць канферэнц-залы самага сучаснага ўзроўню, дзе можна праводзіць любыя, у тым ліку міжнародныя, мерапрыемствы. Пражыла сапраўднае паляпшэнне цэнтральная сядзіба Нацыянальнага парку «Камянюкі».

Пасля юбілею быў прыняты шэраг рашэнняў для паляпшэння як экалогіі пушчы, так і яе турыстычнай прывабнасці. У маёнтку Дзеда Мароза зараз будуюць карчму. Сапраўды, калі паходзіш, асабліва па зімовай рэзідэнцыі ў мароз, то хочацца ў цяпло. Бліны з гарачым чаем, якія прадаюцца ў гандлёвых радах на вуліцы, саграваюць толькі часткова. А ў драўлянай карчме, стылізаванай пад даўніну, прыемна будзе пагрэцца і паспытаць беларускіх страў проста з чыгунка, з гарачай печы. Менавіта такім чынам мяркуюць абсталяваць новы пункт харчавання.

Яшчэ падчас святкавання юбілею кіраўнік дзяржавы даручыў набыць для экскурсій некалькі аўтамабіляў з электрычнай цягай, і пяць электрамабіляў ужо паступіла на склады Нацпарку. Як паведаміў намеснік дырэктара Аляксандр Шарында, нядаўна падпісаны дамовы аб набыцці ў Польшчы дзвюх брычак-дыліжансаў на 25 чалавек, кожную з якіх будзе цягнуць пара коней. Паводле дакументаў, новы транспарт называецца воз-круіз, але ў пушчы яму, хутчэй за ўсё, прыдумаюць сваю назву, якая больш пасуе нашым мясцінам.

І галоўнае, пасля юбілею было прынята рашэнне аб будаўніцтве аб'язной дарогі вакол пушчы. Дакументамі прадугледжана, што абапал дарогі на льготных умовах інвестары атрымаюць зямельныя ўчасткі побач з населенымі пунктамі, каб стварыць на іх інфраструктуру, якая выведзе пушчанскі турызм на новы ўзровень.

Агульная працягласць аўтадарогі вакол нацпарку складае каля 185 кіламетраў. На яе ўзвядзенні занятыя два дзясяткі дарожна-будаўнічых арганізацый. У ролі генпадрадчыкаў выступаюць два магутныя прадпрыемствы Брэстчыны — «Брэстаблдарбуд» і «Брэстаўтадар». Ім дапамагаюць дарожна-будаўнічыя фірмы Мінска, Брэста, Гродна, Магілёва, іншых гарадоў. Мостаатрады шчыруюць на будаўніцтве мастоў, іх па новай трасе будзе шэсць.

Першай ластаўкай прыдарожнага і турысцкага сэрвісу на шляху аб'язной дарогі можна лічыць турысцкі комплекс у вёсцы Клятное Пружанскага раёна. А ўсяго толькі па Брэсцкай вобласці запланавана будаўніцтва 41 аб'екта ў гэтай зоне: з іх тры гандлёвыя, 11 устаноў харчавання, чатыры гасцініцы, 14 аўтазаправак, чатыры аўтастаянкі. Стаянкі асабліва актуальныя пры новай дарозе. Яна і будуецца, каб разгрузіць ад традыцыйнага транспарту саму пушчу. Таму, хто захоча ўбачыць векавы лес, трэба будзе выйсці з машыны ці аўтобуса і накіравацца ў пушчу на веласіпедзе, пехатою, на кані ці электрамабілі.

Святлана ЯСКЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК, Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).
УНН 200056212.

У сядзібе Дзеда Мароза снег можа ісці па заказе — на тое ёсць спецыяльная тэхніка.

У новай экспазіцыі белавежскага музея можна ўбачыць маляўнічую дыярраму старасвецкага палявання і макет колішняга мясцовага палаца.

Студэнтка Брэсцкага дзяржуніверсітэта Юлія ЛЯШУК прыехала ў Белавежскую пушчу на практыку — цікавай працы для будучага спецыяліста тут хапае.

У новым гасцінічным комплексе заўжды рады гасцям пушчы.

«...ЖЫЦЬ ТАК НЕ ТОЛЬКІ СКЛАДАНЕЙ, АЛЕ І ЦІКАВЕЙ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Ведаю, што замаўляюць іх не толькі дзецям — прыяцелька такім чынам штогод віншуе... мужа.

— А чаму б і не! На Каляды, на Новы год многім хочацца «ўпасці ў дзяцінства», адчуць сябе малым і любімым, атрымаць адпаведны падарунак. У ім сёлета прыгожая паштоўка, кніжка «Навагоднія прыгоды», сімпатычны заяц, сімвал 2011 года, і шакаладка. Нічога ж лішняга?.. Заказы на гэтыя віншаванні даступныя па кошце, прымаюцца ў кожным аддзяленні паштовай сувязі. Да таго ж яны могуць быць уручаны атрымальнікам не толькі ў Беларусі, але і ў Літве, Расіі, у іншых краінах... Чым многія і скарысталіся: больш чым дзве тысячы замоў у сталіцы ўжо аформлена, нашы паштальёны, Дзядулі Марозы і Снягуркі ўжо гатовыя пайсці па дамах.

— Гэтую ганаровую місію выконваюць работнікі прадпрыемства?

— Так. У нас ёсць мастацкі кіраўнік, ёсць таленавітыя самадзейныя артысты, людзі, якія любяць і ўмеюць кантактаваць з дзецьмі, прычым робяць гэта штогод. Так што сумнявацца ў выніках не прыходзіцца.

— Традыцыйнымі для кліентаў пошты сталі не толькі гэтыя пісьмовыя віншаванні, але і кірмашы паштовак?

— Гэта заканамерна, бо чалавек, асабліва ў сталіцы, даўно прывык да самаабслугоўвання, да таго, што перш, чым нешта купіць, ён сам гэта выбера (а тым больш, калі ёсць з чаго!), патрымае ў руках, параўнае, прыцэніцца...

Такая магчымасць, прычым загадзя, была створана на паштамце, а ў гэтыя перадnавагоднія дні яшчэ ў 23 аддзяленнях сувязі — па ўсім Мінску.

Паклапаціліся мы і пра людзей занятых. Яны да навагодніх паштовак могуць прыцаніцца на сайце РУП «Белпошта» і потым замовіць іх праз інтэрнэт-магазін. Афармлены і аплачаны заказ можна потым атрымаць на тым жа паштамце альбо з дастаўкай па названым адрасе. Так што — сардэчна запрашаем! У тым ліку і аформіць падпіску на любімыя газеты, часопісы, для чаго, дарэчы, таксама неабавязкова ісці на пошту: ёсць інтэрнэт, ёсць паштальёны, якія могуць прыйсці да вас.

— Алена Уладзіміраўна, да добрага чалавек, як вядома, прывыкае хутка. Прынамсі, жыхары сталіцы даўно прызвычаіліся да таго, што пошта — гэта і праўда блізка, гэта, можна сказаць, з дастаўкай дамоў. Але ж горад расце — і досыць імкліва: засяляюцца новыя кварталы, мікраёны. Плануецца адкрыццё і новых аддзяленняў сувязі?

— Безумоўна. У новым мікраёне Чырвоны Бор памяшканне ўжо гатовае, зараз завозім мэблю, абсталяванне. Наблізім свае паслугі і да жыхароў мікраёнаў Дружба, Міхалова...

— Спатрэбяцца новыя кадры?...

— Так... Прычым вельмі спецыфічныя, бо для аператара паштовай сувязі, для паштальёна важна не толькі мець адпаведныя веды, навыкі дыпэўныя якасці характару. Не менш важна любіць людзей, хацець і ўмець кантактаваць з імі, ісці насустрач...

— Калі пра гэта размова... Наш маленькі звяздоўскі дэсант дагэтуль памятае прэзентацыю газеты ў Вілейцы, дзе вы раней працавалі і дзе для гасцей, для падпісчыкаў арганізавана было, здаецца, усё!.. У вас там была пасада намесніка начальніка вузла паштовай сувязі, аўтарытэт, кватэра... Вы, тым не менш, прынялі прапанову ўзначаліць вузел у не блізкім ад Вілейкі Мядзеле, потым пераехалі ў Мінск. Для жанчыны падобныя перамены, а тым больш з пераездам (з сям'ёй) справа, згадзіцеся, не дужа ўласцівая?

— Так... Муж душой дагэтуль жыве ў Вілейцы. Мне ж заўсёды быў прыемны давер, заўсёды цікавіла нешта новае, невядомае — хацелася паспрабаваць, праверыць, ці змагу.

— Раіце тое ж іншым?

— А чаму б і не, калі жыць так не толькі складаней (гэта само сабой), але і цікавей: новыя калектывы, новыя задачы, патрабаванні, знаёмствы з людзьмі...

— На вытворчасці «Мінская пошта» іх больш за тры тысячы — вялікі калектыў, вялікая адказнасць і, адпаведна, нагрузка, што, аднак, не адбіваецца на знешнім выглядзе: вы заўсёды, так бы мовіць, пры парадзе. Як жанчына жанчынам: што для гэтага трэба?

— Галоўнае — хацець! І магчымасці тады абавязкова знойдуцца.

— Гэтага — зноў-такі — пажадаеце іншым?

— Так. Усім паштавікам, усім нашым кліентам, усім дзелавым партнёрам найшчырэйшыя віншаванні з Калядамі, з Новым годам! Усім удачы, дабрабыту, душэўнай раўнавагі, узаемавыручкі, здароўя... Міру і дабра ў кожны дом!

Валянціна ДОЎНАР.

Тамара РЫЖАВУЦКАЯ, дворнік:

«МЯТУ ДВОР 27 ГАДОЎ»

Жыццёвая проза

Як жывецца дворніку ў сталіцы? Ці магчыма жыць на адну зарплату? Чаму дворнікі доўга не трымаюцца на адным месцы? Сваім меркаваннем на гэты конт дзеліцца дворнік са стажам Тамара Рыжавуцкая.

Знайсці Тамару Віктараўну каля дома 22 па бульвары Шаўчэнкі было б досыць складана (у жанчыны няма мабільнага тэлефона) без яе напарніцы. Напарніца паказала вакенца, куды трэба пастукацца.

Блакітнавокая светлавалосая жанчына невысокага росту выйшла з пад'езда. Мы праходзім у нізкае маленькае памяшканне, і яна ўсаджвае мяне на старое пацёртае крэсла.

— Вось тут мы і перакусваем, гарбату ды каву п'ём, — паказвае памяшканне Тамара Віктараўна.

Я азіраюся. Невялічкі столік з печывам, кавай ды кубкамі, пластыкавыя кветкі і навагодняя мішура на сценах, у куце зялёны конь з аранжавай грывай. А насупраць званеныя ў кучу старыя дзверы, пластык, поліэтылен і г.д.

— Раней не было дзе нават перакусіць, — расказвае Тамара Віктараўна. — А зараз далі памяшканне нам, вось халадзільнік прынеслі, дзяўчаты сёе-тое з дому папрыцягвалі. Дык утульней стала...

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

«У дворнікі пайшла, каб атрымаць кватэру»

Сама Тамара Віктараўна родам з Лагойшчыны. З чацвярых дзяцей яна была самая малодшая. У Мінск, па яе словах, прыехала васямнаццацігадовай дзяўчынай. На двары тады быў 1977-ы.

— Я адвучылася ў гандлёвым каледжы, а пасля шэсць гадоў працавала прадаўцом у краме. Па шчырасці, праца мне вельмі падабалася, — проста расказвае Тамара Віктараўна.

У краме яна пазнаёмілася і са сваім будучым мужам.

— Я тады працавала ў магазіне, ён там побач жыў каля гастранома ў цёткі. Так і пазнаёміліся. Год сустракаліся, — Тамар Віктараўна ўсміхаецца, і на яе шчоках з'яўляецца няўлоўная чырвань. — У кіно хадзілі... Не ведаю, ці ходзяць зараз маладыя ў кіно... Тады па горадзе гулялі, шмат гулялі, так дома не сядзелі, як цяпер маладыя... А пасля і ажаніліся.

Муж працаваў бляхаром у СПМК, а яна пайшла «зарабляць кватэру» ў дворнікі.

— А што было рабіць, — аргументуе Тамара Віктараўна. — Трэба ж недзе жыць. Тады дворнікам давалі службовае жыллё, таму шмат хто ішоў працаваць. Мы 12 гадоў пражылі на агульнай кухні. Пайшлі дзеці... Усякае было: і сварыліся, і мірыліся. Але думкі на развод падаваць ні разу не было...

«Мы з мужам былі ў розных брыгадах дворнікаў»

Атрымаўшы двухпакаёўку «з выгодамі», яны змаглі яе прыватызаваць. Нарэшце тая мэта, дзеля якой Тамара Віктараўна штозіму з самага рання ломам дзяўбала лёд, была дасягнутая.

— У нас вунь дзяўчаты па дзевяць гадоў падпрацоўвалі. І тут гэты закон адмянілі. Уяўляеце, як крыўдна... Цяперака ў інтэрнаце жывуць, — распавядае, абапершыся на стол, жанчына. — А мне вось так пашчасціла.

Пасля дворнікам стаў і муж Тамары. Штозіму сям'я Рыжавуцкіх сваімі рукамі грузіла пяць-шэсць машын снегу.

— Два гады таму ён мне дапамагаў, асабліва зімой снег чысціць і лісце выносіць, — уздыхае Тамара Віктараўна. — А я яму дапамагала таксама, мы ж у розных брыгадах былі. Дворнікам стаў, бо цяжкавата было ўжо па камандзіроўках ездзіць, таму і прыйшоў на працу ў ЖЭС. Цяпер яго няма, сыны дапамагаюць, бывае...

За 750 тыс. жыць у Мінску і вучыць сына

Зімой Тамара Віктараўна атрымлівае даплату за снег, восенню ідзе асобная плата за лісце. На маё пытанне, ці хапае ёй грошай, жанчына згодна ківае галавой. Аднак разгаварыўшыся, расказвае, што не атрымлівае і мільёна...

— Мільёна не выходзіць. Так — 700-750 тысяч, — гаворыць Тамара Віктараўна. — Калі снегу больш, то і больш плацяць. Тое ж і восенню, калі лісця шмат. Летам таксама за прыборку вуліц можна атрымаць...

На гэтыя грошы жанчына харчуецца, плаціць камуналку, а таксама вучыць малодшага сына.

— Старэйшы працуе на заводзе Арджанікідзэ. А малодшы ў мяне яшчэ вучыцца на другім курсе ўніверсітэта, — усміхаецца яна. — Праўда, платна. У семестр патрэбна 950 тысяч рублёў плаціць.

Я пытаюся, як у яе так атрымліваецца. Тамара Віктараўна толькі паціскае плячыма.

— Крэдыт не брала. Адкладваю паціху з заробку. Ды і падпрацоўваю крыху. Увечары офісы мыю, — сарамліва адказвае жанчына. — Я ж яшчэ і бабулю 90-гадовую гляджу. Яна жыве разам з намі, на вуліцу ходзіць з цяжкасцю...

«Я неяк не задумвалася, мяняць ці не мяняць працу»

Між тым Тамара Віктараўна кажа, што ў працу ўжо ўцягнулася, падладзілася... З самага ранку яна прыходзіць, бярэ шуфель ці мятлу і пачынае чысціць снег, лісце і смецце, якое накідалі мінакі. У абед яна звычайна сыходзіць дамоў. А вечарам да дзевяці-дзесяці гадзін жыхары дома могуць чуць шоргат яе веніка...

— За 27 гадоў мяне ў гэтым доме ведаюць усе. Падыходзяць, здароўкаюцца, абавязкова пытаюцца пра маё здароўе, справы, дзяцей, — усміхаецца Тамара Віктараўна. — Ёсць, вядома і п'яніцы. Але які дом без іх. Такіх дамоў няма...

— Ці падабаецца мне праца? — перапытвае мяне жанчына. — Пра тое, што буду дворнікам, і колькі гэта прэстыжна ці не, я неяк не задумвалася... Працавала ды і ўсё...

Яна на хвілінку задумваецца, а пасля, спахапіўшыся, прапаноўвае мне каву і печыва.

— Маладыя зараз не хочуць працаваць. І складана, ды і кватэры перасталі давацьі... Прыйдзе хто, паспрабуе, убачыць, што цяжка. Ды і сыходзіць шукаць лепшай долі... — адказвае на маё пытанне, чаму такая цякучка ў ЖЭСах, Тамара Віктараўна. — А што тут скажаш. Хіба папракаць будзеш?

«Мне нічога не патрэбна, у мяне ўсё ёсць»

Жанчына кажа, што мараў пра штосьці канкрэтнае ў яе няма. І колькі я ні спрабавала дапытацца, Тамара Віктараўна спакойна адказала, што ёй усё падабаецца. Таму што прасіць у Дзеда Мароза на Новы год, яна не ведае.

— У мяне хапае ўсяго. І пральная машына. І камп'ютар, і мікрахвалёўка, і г.д... У мяне ўсё ёсць і мне нічога не трэба... — сцвярджае жанчына.

Не хоча яна ні паездак за мяжу, ні мабільнага тэлефона.

— Ды ездзіла я... Былі мы ў Львове, Хмяльніцкім... — гаворыць Тамара Віктараўна. — А вось зараз у Адэсу ездзілі дзяўчаты мае, але я не паехала. Неяк раней больш цікава было. Раней і вязала, і кніг больш чытала (муж вельмі шмат кніжак купляў), ды і ў тэатры хадзілі, а зараз неяк не хочацца...

Праўда, пасля, трохі падумаўшы, сказала, што было б нядрэнна, каб зарплату павысілі ды і старэйшаму ўжо не зашкодзіла б ажаніцца.

— Нявестак пакуль няма, а час ужо прыйшоў, — паківала галавой Тамара Віктараўна.

Таму давядзецца Дзеду Марозу пастарацца.

Настасся ЗАНЬКО.

ПА ЯКІМ РАСКЛАДЗЕ БУДУЦЬ КУРСІРАВАЦЬ АЎТОБУСЫ?

Выбіраючыся ў дарогу ў перадсвяточныя і святочныя дні, пасажырам аўтобусных маршрутаў трэба ведаць, як у гэты час — з 24 снежня па 9 студзеня — будзе арганізавана праца аўтатранспарту.

Як паведамілі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс», рух аўтобусаў па міжгародніх маршрутах будзе арганізаваны: 24, 31 снежня і 6 студзеня — як па пятніцах; 25 снежня, 1 і 7 студзеня — па раскладзе суботы; 8 студзеня — па раскладзе серады; 26 снежня, 2 і 9 студзеня — па раскладзе нядзелі. Аўтобусы па прыгарадных маршрутах будуць курсіраваць па наступным графіку: 24, 31 снежня і 6 студзеня — як па пятніцах; 25 снежня, 1, 7 і 8 студзеня — як па суботах; 26 снежня, 2 і 9 студзеня — па раскладзе нядзелі. У асобныя перадсвяточныя і святочныя дні на шэрагу маршрутаў рэйсы могуць быць або ўвогуле адменены, або іх колькасць можа быць зменшана.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Хакей. КХЛ

ДЫНАМА. ПЕРАЗАГРУЗКА

Чэмпіянат КХЛ узнавіў свой ход пасля міжнароднай паўзы. І мінскае «Дынама», у якога запланавана цяпер правесці пяць дамашніх гульняў запар, нарэшце парадавала сваіх заўзятараў: упершыню за тры гады мінчане дабіліся перамогі над астанінскім «Барысам» — прыйдзе хто, паспрабуе, убачыць, што цяжка. Ды і сыходзіць шукаць лепшай долі... — адказвае на маё пытанне, чаму такая цякучка ў ЖЭСах, Тамара Віктараўна. — А што тут скажаш. Хіба папракаць будзеш?

У час перапынку ў турніры ў складзе беларускай каманды адбыліся некаторыя змены. Кантракт з фінскім абаронцам Хану Пікарайненам быў скасаваны па ўзаемным пагадненні, а Яраслаў Чупрыс быў адпраўлены ў мінскае «Юнацтва». Затое аднавіўся пасля траўмы форвард Сяргей Дзямагін. Усё гэта дазволіла Марэку Сікору стварыць збалансаваныя чатыры тройкі нападзення. Першыя дзве легіянерскія з украплennем аднаго беларуса (Спірыдонаў-Штумпел-Глазачаў і Міхалёў-Плат-Сікора) і дзве беларускія (Дзямагін-Стась-Мялешка і Кулакоў-Дрозд-Стэфановіч). Такім чынам, колькасць легіянераў і беларусаў у камандзе стала амаль роўнай — 10 на 9. Наступны матч «бела-блакітныя» правядуць ужо сёння вечарам супраць ханты-мансійскай «Югры».

Яўген ВАРАКСА.

Дарагія жыхары Беларусі, браты і сёстры!

Сардэчна віншуем Вас з вялікім і цудоўным святам

НАРАДЖЭННЯ ХРЫСТОВА і НОВЫМ 2011 ГОДАМ!

Напярэдадні свята мы зноў звяртаемся да натхняльнай евангельскай весткі аб нараджэнні Ісуса Хрыста: «І народзіць Сына, і дасі Яму імя Ісус, бо Ён збавіць людзей Сваіх ад грахоў іх. А ўсё гэта сталася, каб збылося сказанае Госпадам праз прарока, які кажа: вось, Дзева ва ўлонні зачне і народзіць Сына, і дадуць імя Яму Эмануіл, што азначае: з намі Бог» (Евангелле ад Матфея, 1:21-23).

У поўнай адпаведнасці са старажытнымі прароцтвамі Ісус нарадзіўся ў Віфлееме Іудзейскім, і нябесныя пасланнікі апелі радасную песню: «Слава ў вышніх Богу, і на зямлі мір, у людзях добрая воля!» (Евангелле ад Лукі, 2:14). Той, Якім «створана ўсё, што на нябёсах і што на зямлі» (Пасланні да Каласянаў, 1:16), сышоў на зямлю, «прыняўшы вобраз раба, зрабіўшыся падобным чалавекам і па выглядзе стаўшы як чалавек» (Пасланне да Філіпійцаў, 2:7). Сын Божы стаў чалавекам, каб мы сталі дзецьмі Божымі. Хрыстос прыйшоў на зямлю, каб мы маглі быць на небе з Богам. Ён прыйшоў у наш свет, каб мы мелі надзею. Ён прыйшоў, каб падзяліць з намі радасці і гора.

Да! С нами Бог —
не там в шатре лазурном,
Не за пределами
бесчисленных миров...
Он здесь, теперь, —
средь суеты случайной
В потоке мутном жизненных тревог.

Святкуючы нараджэнне Хрыста, мы нагадваем сабе аб мэце Яго прыходу ў свет. Па сведчанні Евангелля, Ісус нарадзіўся, каб выратаваць «людзей Сваіх ад грахоў іх». Кесар мог задаволіць патрэбу народа ў «хлебе і відовішчах», але толькі Ісус ратуе ад граху і ліквідуе перашкоду паміж намі і Святым Богам. Для гэтага Ён нарадзіўся, пакутаваў, памёр і ўваскрэс. У Бібліі ясна сказана: «Бо так узлюбіў Бог свет, што Сына Свайго Адзінароднага даў, каб кожны, хто веруе ў Яго, не загінуў, але меў жыццё вечнае» (Евангелле ад Іаана, 3:16).

Лишь в Нем ты сможешь
сердцем отдохнуть,
Лишь в Нем найдешь
душе успокоенье.

Біблія гаворыць, што Хрыстос прыйшоў выратаваць ад грахоў. Падумайце пра грахі, якія раздзяляюць Вас з Богам, з блізкімі і нават з самім сабой. Ісус прыйшоў, падману, непаслушэнства, вядзьмарства, зайздрасці, ганарыстасці, хабарніцтва, забабонаў, зайздрасці, нявернасці, самаправаднасці і многіх-многіх іншых. І, згодна з Бібліяй, калі мы «вызнаем грахі нашы, то Ён, верны і праведны, прабачыць нам грахі нашы і ачысціць нас ад усякай няпраўды» (1 Іаана, 1:9).

Христос есть Жизнь, и Истина,
и Путь,
В Нем полнота спасенья и прощенья.

Радуйцеся нараджэнню Збавіцеля свету. Ідзіце па жыцці з верай у Ісуса Хрыста і ў Ім шукайце суцяшэння і натхнення. Няхай у наступным годзе жыцця Гасподзь дасць вам шмат радасці і шчасця, няхай мір і дабрабыт праліваюцца на вас і вашых блізкіх. Благаслаўленняў вам ад Нябеснага Айца.

З Нараджэннем Хрыстовым!
З любоўю да ўсіх Вас,
Епіскап цэрквяў евангельскіх хрысціян баптыстаў
у Рэспубліцы Беларусь
Віктар КРУЦЬКО.

Адваротны бок

З ПІРАТЭХНІКАЙ НЕ ЗАЎСЁДЫ ВЕСЕЛА

Звыш 7 тысяч месцаў навагодняга святкавання плануецца абследаваць па краіне на прадмет бяспекі. Хоць апошняя, вядома, залежыць не столькі ад месца правядзення свята, колькі ад тых, хто бярэ ў ім удзел. Каб свята не азмрочылі сумныя наступствы, не варта парушаць правілы бяспекі самім і дазваляць рабіць гэта навакольным.

Фота Пятра ФАМІНА.

— Штогод знаходзяцца асобы, якія нелегальна завозяць і распаўсюджваюць піратэхнічныя вырабы неадпаведнай якасці, — кажа намеснік начальніка ўпраўлення аховы правапарадку Галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Віктар ПАЛЕЙ. — За шаснаццаць дзён снежня органамі ўнутраных спраў канфіскавана звыш 1 200 тысяч адзінак піратэхнічных вырабаў. З 1 снежня 2009-га па 6 студзеня 2010 года было канфіскавана звыш 2 700 тысяч адзінак. Самым буйным падобным фактам у гэтыя дні стала канфіскацыя ў сталіцы звыш 1 млн гэтых вырабаў. Зараз праводзіцца праверка законнасці іх увозу. Грамадзяне, якія набываюць піратэхніку на рынках, па-ранейшаму не столькі эканомяць пэўныя грошы, колькі істотна павялічваюць магчымасць нанясення шкоды свайму здароўю...

Піратэхнічныя вырабы дзеляцца па ступені патэнцыйнай бяспекі на пяць класаў. Небяспеку ў піратэхніцы можа ўяўляць кінетычная энергія, рух самога вырабу або яго частак, магутнасць светлавога выпраменьвання і радыус небяспечнай зоны. Бытавая піратэхніка 1-2 класаў можа прадавацца ў неспецыялізаваных магазінах, 3 класа — у спецыялізаваных секцыях. Продаж піратэхнікі 4 і 5 класаў — спецыяльнага і тэхнічнага прызначэння — дапускаецца толькі ў спецыялізаваных магазінах. Клас бяспекі пацвярджаецца выпрабаваннямі адпаведных акрэдытаваных лабараторый.

— Піратэхнічная прадукцыя, якая завозіцца ў нашу краіну, як правіла, з Кітая і паступае на склады, павінна суправаджацца дакументам, які пацвярджае адпаведнасць вырабу патрабаванням нарматыўнаправавых актаў сістэмы супрацьпажарнага нарміравання, а таксама ўтрымлівае інфармацыю пра адпаведнасць класу, указанаму на этыкетцы, — тлумачыць першы намеснік начальніка Упраўлення нагляду і прафілактыкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі Уладзімір СУВОРАЎ. — Да піратэхнічнага вырабу павінна прыкладацца інструкцыя з указаннем тэрміну прыдатнасці, класу бяспекі, абмежавання па прымяненні і ўмоў прымянення...

● Продаж піратэхнікі на рынках — з латкоў, палатак, рук, а таксама праз інтэрнэт забаронены, а значыць, цікавіцца ў дадзеных выпадках пратаколам выпрабаванняў бессэнсоўна.

● Набыццё піратэхнікі афіцыйным шляхам — у крамах — дае пакупніку прынамсі юрыдычныя гарантыі вяртання магчымай шкоды.

● Адміністратыўную адказнасць нясе як той, хто прадае, так і той, хто набывае.

● Крымінальная адказнасць прадугледжана ў выпадках, калі піратэхніка аказалася прычынай атрымання цяжкіх цялесных пашкоджанняў больш як дзвюма асобамі або стала прычынай гібелі чалавека.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Траўмапункт

ШТО РАБІЦЬ ПРЫ ТРАЎМАХ ВОКА?

Набліжаецца час школьных канікулаў. Але, на жаль, гэта не толькі вясёлы навагодні час для дзяцей, а яшчэ і сезон траўмаў. Часцей за ўсё, апынуўшыся за межамі школ і кватэр, дзеці застаюцца прадастаўленыя самі сабе. Яны шмат рухаюцца, свавольнічаюць, тады і здараюцца сур'ёзныя непрыемнасці. Даволі распаўсюджаныя траўмы ў гэты час — пашкоджанне вачэй. Калі такое здарылася, трэба ўмець аказаць пацярпеламу першую дапамогу. Але зрабіць гэта трэба правільна, падкрэслівае <u>кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт кафедры афтальмалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, Галіна СЯМАК</u>.

Калі ў вока трапіла нейкая вадкасць, трэба старанна і доўга прамываць яго праточнай вадой, пажадана пад напорам. Для гэтага можна выкарыстаць адназразовы шпрыц ці спрынцоўку. Павекі трэба адцягнуць ад вочнага яблыка, каб старанна выдаліць усё, што трапіла на слізістыя. І абавязкова потым звярнуцца да доктара-афтальмолага.

Часта на кан'юнктыву трапляюць розныя іншародныя целы: вейкі, пылінкі і г.д. Гэтыя пашкоджанні суправаджаюцца рэзкімі болямі, слёзацячэннем, святлабоязню, пачырваненнем слізістай абалонкі. Ні ў якім разе нельга церці пашкоджанае вока рукамі, бо іншароднае цела вострымі гранямі можа нанесці дадатковыя пашкоджанні. Вядома, што нават найдрабнейшая парушынка можа стаць сур'ёзнай праблемай, таму лепш звярнуцца да спецыяліста. Калі ж па нейкіх прычынах гэтага зрабіць немагчыма, трэба аказаць першую дапамогу. Спачатку вымыйце рукі. Потым пасадзіце дзіця тварам да святла. Станьце ззаду і прыцісніце яго галаву да свайго жывата. Указальным і сярэднім пальцамі разляпіце павекі. Папрасіце пацярпелага паглядзець улева, управа, уверх, уніз. Калі вы ўбачыце вейку ці парушынку, якая трапіла пад верхняе павека, проста адцягніце яго ад вочнага яблыка, пры гэтым іншароднае цела можа быць змыта слязой. Калі пры аглядзе прычыну боляў выявіць не ўдаецца, можна прамыць вока растворам левамецэціну, слабаружовым растворам марганцоўкі. Пасля накласці сухую стэрыльную павязку, прымацаваўшы яе пластырам ці бінтам, і звярнуцца па медыцынскую дапамогу.

Яшчэ адзін від траўмы вока — апёкі. Тых гарэз, што любяць «пахімічыць» з рознымі рэчывамі, падпільноўвае сур'ёзная небяспека. Каварна працякаюць апёкі шчолачамі. У першыя дні могуць быць невялікая святлабоязь і боль, і многія пацярпелыя не спяшаюцца звяртацца па медыцынскую дапамогу. А, між іншым, шчолач пранікае ўглыб тканак — пачырванненне павялічваецца, рагавіца мутнее, рэзка знікаецца зрок, ажно да слепаты. Трэба тэрмінова прамыць вочы нямоцным струменем вады з-пад крана на працягу 15-20 хвілін і выдаліць тампончыкам часцінкі абпальваючага рэчыва.

Акрамя хімічных, спецыялістам даводзіцца мець справу і з ***апёкамі тэрмічнымі***. Прычынай іх можа быць полымя вогнішча, якое дзеці распалілі ў патаемным месцы, гарачыя вадкасці, пара, а таксама петарды. У апошнія гады рэзка ўзрасла колькасць хлопчыкаў і дзяўчынак, якія пацярпелі ад запуску гэтых салютаў і ў выніку пасля навагодніх свят апынуліся на бальнічным ложку. У гэтых выпадках апёкам спадарожнічаюць раненні вачэй і іх прыдаткаў, чэрапна-мазгавыя траўмы.

Пры тэрмічных апёках вочы прамываць не трэба — хутчэй да ўрача. А дарослым неабходна ўзяць на заметку наступнае: нельга купляць петарды ў выпадковых месцах, дзе парушаны правілы захавання тавару, бо няякасная піратэхніка становіцца непрадказальнай. Самая распаўсюджаная памылка пры запуску петардаў — іх няправільная ўстаноўка. Для адных феерверкаў патрабуецца дастаткова трывалая фіксацыя іх на зямлі, а для іншых яна катэгарычна забароненая. Таму трэба ўважліва чытаць інструкцыю.

Сярод пашкоджанняў вачэй пераважаюць ***механічныя — кантузіі, раненні***. Нельга пакідаць без увагі ўдары тупым прадметам — кулаком, мячом, каменем, палкай. Лёгкія тупыя траўмы прыводзяць да кровазліцця і ацёку скуры павек і кан'юнктывы, Звычайна такія ўдары рассмоктваюцца за 10-12 дзён. На вобласць траўмы трэба пакласці насоўку, змочаную халоднай вадой, або лёд.

Больш цяжкія тупыя траўмы вядуць да змяненняў у рагавіцы, унутраных абалонках вока і зрокавым нерве, выклікаюць зніжэнне зроку. Таму ад непрыемных наступстваў лепш застрахавацца. Ніводзін выпадак кантузіі не павінен заставацца без абследавання ў афтальмолага.

Вольга ШАЎКО.

Прамая лінія

МАЛОЧНАЯ ЗАЛОЗА ЛЮБІЦЬ УВАГУ

На пытанні чытачоў адказаў загадчык аддзела анкамамалогіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, доктар медыцынскіх навук, прафесар Леанід ПУТЫРСКІ.

(Працяг. Пачатак у нумарах за 21 — 23 снежня.)

☎ — Брэсцкая вобласць, Людміла Арцем'еўна. 49 гадоў. Цяжка працякае клімакс. Мяркую, мне могуць прапанаваць гармоназамяшчальную тэрапію. Ці можа такое лячэнне спрыяць пагаршэнню стану здароўя малочнай залозы?

— Адна справа, калі ў жанчыны клімакс праходзіць нармальна і яна ўжывае гармоназамяшчальную тэрапію выключна для працягу маладосці. Такая жанчына мае права выбару — працягнуць маладосць і павялічыць рызыку развіцця раку малочнай залозы або не ўжываць гармоны і не павялічваць рызыку. Іншая справа, калі клімакс працякае цяжка і гінеколагі вымушаныя прызначаць гарманальную тэрапію. У такім выпадку гэтае лячэнне не павінна працягвацца шмат гадоў. Можа быць, дастаткова папіць з паўгода, каб сітуацыя нармалізавалася. Праз нейкі час пасля прыёму гармонаў гінеколаг павінен накіраваць пацыентку на агляд да мамолага. Адна з прычын, па якой у некаторых развітых краінах вышэй рызыка развіцця раку малочнай залозы, заключаецца ў тым, што там больш прымяняюць супрацьзачаткавыя гармоны і гармоназамяшчальную тэрапію.

☎ — Мінск, Наталля. Чытала неяк у «Звяздзе», што рак малочнай залозы бывае і ў мужчын. Для мяне гэта было навіной. У маёй свекрыві быў рак малочнай залозы. Ці можа гэта захворванне напаткаць майго мужа, ці яно перадаецца толькі па жаночай лініі? Якая катэгорыя мужчын больш схільная да дабраякасных і злаякасных утварэнняў у малочнай залозе?

— Сапраўды, у мужчын таксама бываюць хваробы малочнай залозы. Гэта такая дабраякасная хвароба як гінекамастыя, якая калі не лечыцца кансерватыўна, то выдаляецца. Бывае ў мужчын і рак. На 100 жанчын з ракам малочнай залозы прыпадае 1 мужчына. У мужчын хваробы малочнай залозы тлумачацца шэрагам прычын, сярод якіх і экалогія, і злоўжыванне алкаголем або анабалічнымі гармонамі ў маладым узросце, а таксама розныя захворванні — уралагічныя, хваробы надныркавічкаў, шчытападобнай залозы... Некаторыя лекавыя прэпараты таксама могуць адмоўным чынам уплываць на стан малочнай залозы. Схільнасць да развіцця раку малочнай залозы можа перадавацца не толькі дзяўчынцы, але і хлопчыку, хоць такое назіраецца радзей, чым па жаночай лініі.

Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.
(Працяг будзе.)

ЗА ШТО РАГАЧОЎСКІЯ ДАРОЖНІКІ ПАБІЛІ ШКЛО КАРЭСПАНДЭНТУ «ЗВЯЗДЫ»?

Паводле іх версіі, карэспандэнту гэта прыснілася, а камяні не маглі трапіць у машыну з пяском

Учора мы з калегам Яўгенам Валошыным, загадчыкам аддзела расследаванняў «Звязды», ехалі ў Гомель у камандзіроўку. Калі да Гомеля заставалася яшчэ 103 кіламетры, перад намі ўзнікла машына, якая пасыпала дарогу пяском. Ехала яна паводле правілаў — з мігалкай, з хуткасцю 40-50 кіламетраў за гадзіну.

Мы, шчыра кажучы, прыпазняліся. Таму, не парушаючы правілаў дарожнага руху, вырашылі абагнаць дарожную машыну. Калі параўняліся — апынулася, што з машыны разам з пяском ляцяць каменьчыкі і камяні. Хоць і праскочылі хутка — тры «раненні» на шкле. Не трэшчыны, сколы. Але з іх у любы момант могуць пайсці і трэшчыны...

— Та-а-ак, Глеб Паўлавіч, — працягнуў Валошын. — Былі б большыя камяні, маглі б з табой і ў лоб атрымаць... Што за бясчынства?! Гэта ж — небяспека для людзей!

У гэты момант мы зрабілі галоўную памылку — не спыніліся і не выклікалі ДАІ. Па-першае, бо напраўду прыпазняліся. Па-другое, — страшна было спыняцца, каб яшчэ большую порцыю камянёў не атрымаць! Аднак мы сфатаграфавалі «крыўдзіцеля», каб адшукаць пасля адказных.

Неўзабаве пабачылі на трасе дарожных працаўнікоў. Паказалі ім фотку. Іхняя машына! Яны далі мабільнік начальніцы.

— Апроч спачуванняў, нічым вам дапамагчы не магу, — адказала **Таццяна ДУБ, начальнік участка ААТ ДСА-1 Рагачова**. — Раз ДАІ не выклікалі, нічога не дакажаце. У нас у машыну засыпаецца рачны пясок, камянёў там не можа быць у прынцыпе!

На зваротным шляху мы заехалі на гэты ўчастак — машына, якая пабіла шкло, стаяла ў двары. Праўда, быў вечар, нікога ўжо, апроч вартаўніка, не было. Ужо ў Мінску спрабуем дабіцца справядлівасці. Тэлефаную начальніку Таццяны Дуб — **намесніку генеральнага дырэктара ААТ ДСА-1 Рагачова Васілю МЯХВЕДЗЮ**.

Такія падарункі на шкле карэспандэнтавай машыны пакінулі рагачоўскія дарожнікі.

— Нічога вы не зробіце ў вашай сітуацыі! — адказвае мне Васіль Мяхведзь. — Калі такое здарылася, трэба было выклікаць ДАІ, каб яны гэта пацвердзілі. Па-другое, машына абсталяваная мігалкай — вы павінны бачыць, што наперадзе небяспека... Таму ваш выпадак застанецца з вамі!

— А тое, што ў машыну з пяском трапілі камяні, небяспечныя для ўдзельнікаў дарожнага руху, — як вы гэта патлумачыце?

— Хто гэта можа засведчыць?

— Я, а са мной у машыне яшчэ былі 2 чалавекі!

— Гэтага мала! Трэба было выклікаць ДАІ! Вашы сведкі, якія ехалі ў машыне і сышлі з месца здарэння, — мала!

Начальнік Упраўлення ДАІ Гомельскага аблвыканкама Ігар МАКУШЭНКА пацвердзіў, што без пратакола ДАІ дабіцца нечага будзе цяжка.

— Вядома, дарма ДАІ не выклікалі, — кажа Ігар Аляксандравіч. — Вы ж ведаеце, што з дарожнікамі судзіцца заўжды цяжка, таму трэба мець дакладныя доказы...

Фармальна, бачыце, усё ў іх слушна. А тое, што гэты камень мог пабіць шкло цалкам і справакаваць аварыю? А тое, што ён мог прычыніць шкоду здароўю і жыццю кіроўцы? А тое, што новае шкло для машыны каштуе 1 мільён 200 тысяч? Гэтыя сколы можна, зрэшты, і «адрамантаваць» — каштуе каля 100 тысяч. Але гарантыі, што трэшчына не пойдзе, ніводная фірма не дае...

Але як жа цяжка размаў

Заверено
Директор Департамента по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
Гальперин А.Л.
23.12.2010

Утверждено
ООО «Юнивест Консалтинг энд Трейдинг ГмбХ» (ФРГ)
(Решение № 85 от 24.11.2010 г.)

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ПЕРВОГО ВЫПУСКА ИП «ЮНИВЕСТ-М»

г. Минск

1. Полное и сокращенное наименование эмитента (на белорусском и русском языках)
на белорусском языке:
полное: Замежнае прыватнае унітарнае вытворча-гандлёвае прадпрыемства «ЮНІВЕСТ-М» ООО «ЮНІВЕСТ Кансалтынг энд Трэйдынг ГмбХ»;
сокращенное: ЗП «ЮНІВЕСТ-М»;
на русском языке:
полное: Иностранное частное унитарное производственно-торговое предприятие «ЮНИВЕСТ-М» ООО «ЮНИВЕСТ Консалтинг энд Трейдинг ГмбХ»;
сокращенное: ИП «ЮНИВЕСТ-М».

2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)
Республика Беларусь, 220005, г. Минск, ул. Гикало, 3, телефон: (017) 2845954, телефон/факс: (017) 2845964, e-mail: univest_minsk@mail.ru.

3. Основные виды деятельности эмитента
Эмитент в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и своим уставом осуществляет следующие виды деятельности (в соответствии с общегосударственным классификатором «Виды экономической деятельности»):
• 0111 – выращивание зерновых, технических и прочих сельскохозяйственных культур, не включенных в другие группировки;
• 0112 – овощеводство, декоративное садоводство и производство продукции питомников;
• 0113 – выращивание фруктов, орехов, культур для производства напитков и пряностей;
• 0121 – разведение крупного рогатого скота;
• 0123 – разведение свиней;
• 1513 – производство мясных продуктов;
• 1532 – производство фруктовых и овощных соков;
• 1591 – производство дистиллированных алкогольных напитков;
• 1592 – производство этилового спирта из сброженных материалов;
• 1593 – производство виноградных вин;
• 1594 – производство сидра и прочих плодовых вин;
• 1595 – производство прочих недистиллированных напитков из сброженного материала;
• 1596 – производство пива;
• 1597 – производство солода;
• 1598 – производство минеральных вод и других безалкогольных напитков;
• 2320 – производство нефтепродуктов;
• 2411 – производство промышленных газов;
• 2416 – производство пластмасс в первичных формах;
• 2470 – производство искусственных и синтетических волокон;
• 2651 – производство цемента;
• 2652 – производство извести;
• 2653 – производство гипса;
• 2661 – производство изделий из бетона и извести для использования в строительстве;
• 2662 – производство гипсовых изделий для использования в строительстве;
• 2663 – производство товарного бетона;
• 2664 – производство сухих бетонных смесей;
• 2665 – производство изделий из асбестоцемента и волокнистого цемента;
• 2666 – производство прочих изделий из бетона, гипса и цемента;
• 2812 – производство строительных металлических изделий;
• 3612 – производство мебели для офисов и предприятий торговли;
• 4511 – разборка и снос зданий, земляные работы;
• 4521 – общестроительные работы;
• 4522 – устройство покрытий зданий и сооружений;
• 4523 – строительство дорог, аэродромов и спортивных сооружений;
• 4525 – прочие строительные работы;
• 4531 – электромонтажные работы;
• 4532 – изоляционные работы;
• 4533 – санитарно-технические работы;
• 4534 – установка прочего инженерного оборудования;
• 4550 – аренда строительного оборудования;
• 5050 – розничная торговля моторным топливом;
• 5112 – деятельность агентов по торговле топливом, рудами, металлами и химическими веществами;
• 5131 – оптовая торговля фруктами и овощами;
• 5132 – оптовая торговля мясом и мясными продуктами;
• 5134 – оптовая торговля алкогольными и другими напитками;
• 5135 – оптовая торговля табачными изделиями;
• 5137 – оптовая торговля кофе, чаем, какао и пряностями;
• 51382 – оптовая торговля хлебобулочными и макаронными изделиями, мукой и крупой;
• 51389 – оптовая торговля прочими пищевыми продуктами, не включенными в другие группировки;
• 51511 – оптовая торговля сырой нефтью и попутным газом;
• 51512 – оптовая торговля природным (горючим) газом;
• 51513 – оптовая торговля углем;
• 51514 – оптовая торговля торфом;
• 51515 – оптовая торговля бензином, керосином, дизельным топливом;
• 51516 – оптовая торговля мазутом топочным;
• 51519 – оптовая торговля смежными продуктами;
• 5155 – оптовая торговля химическими продуктами;
• 5188 – оптовая торговля сельскохозяйственными машинами;
• 51909 – неспециализированная оптовая торговля непродовольственными товарами;
• 5211 – розничная торговля в неспециализированных магазинах преимущественно пищевыми продуктами, включая напитки, и табачными изделиями;
• 5212 – прочая розничная торговля в неспециализированных магазинах;
• 5221 – розничная торговля фруктами и овощами;
• 5222 – розничная торговля мясом и мясными продуктами;
• 5223 – розничная торговля рыбой, ракообразными и моллюсками;
• 52242 – розничная торговля кондитерскими изделиями;
• 5225 – розничная торговля алкогольными и другими напитками;
• 5226 – розничная торговля табачными изделиями;
• 5227 – прочая розничная торговля пищевыми продуктами в специализированных магазинах;
• 5244 – розничная торговля мебелью и товарами для дома;
• 52630 – прочая розничная торговля вне магазинов;
• 5511 – предоставление услуг гостиницами с ресторанами;
• 5512 – предоставление услуг гостиницами без ресторанов;
• 5530 – предоставление услуг ресторанами;
• 5540 – предоставление услуг барами;
• 5552 – доставка готовой пищи;
• 6010 – деятельность железнодорожного транспорта;
• 6024 – деятельность автомобильного грузового транспорта;
• 6030 – транспортирование по трубопроводам;
• 6311 – транспортная обработка грузов;
• 6312 – хранение и складирование;
• 63213 – деятельность терминалов;
• 6330 – туристическая деятельность;
• 6340 – организация перевозок грузов;
• 7011 – подготовка к продаже недвижимого имущества;
• 7012 – покупка и продажа собственного недвижимого имущества;
• 7020 – сдача в наем собственного недвижимого имущества;
• 7031 – деятельность агентств по операциям с недвижимым имуществом;
• 7032 – управление недвижимым имуществом;
• 7110 – аренда автомобилей;
• 7121 – аренда прочих сухопутных транспортных средств и оборудования;
• 7132 – аренда строительных машин и оборудования;
• 7134 – аренда прочих машин и оборудования;
• 72300 – обработка данных;
• 7411 – деятельность в области права;
• 7414 – консультирование по вопросам коммерческой деятельности и управления;
• 74201 – деятельность в области архитектуры, инженерные услуги;
• 7430 – технические испытания и исследования;
• 7440 – рекламная деятельность;
• 7450 – наем рабочей силы и подбор персонала;
• 7460 – проведение расследований и обеспечение безопасности;
• 7482 – деятельность в области упаковки;
• 74850 – предоставление секретарских услуг и услуг по переводу;
• 7487 – предоставление прочих услуг потребителям;
• 93011 – стирка и обработка белья и других изделий;
• 9302 – предоставление услуг парикмахерскими и салонами красоты.

15.00 Свет драпежнікаў.
17.00 Расследаванні авіякатастроф.
18.00 Інжынерныя ідэі.
20.00, 23.00, 2.00 «Падарожжа па планетах».
21.00, 0.00, 3.00 Тайны старажытнасці.
22.00 Паранармальнае.

TRAVEL

5.00, 10.00, 14.00, 17.00, 21.00, 2.00 Сусветны падарожнік.
6.00, 12.30 Раскошныя падарожжы з Варунам Шармай.
7.00, 20.00, 1.00 Круіз за паўночным ззяннем.
8.00, 15.30, 4.00 Флойд каштуе віны.
8.30, 16.00, 4.30 Прагны вандроўнік.
9.00, 22.00, 3.00 Бясстрашныя падарожнікі.
11.00 Кулінарная Азія.
12.00, 16.30 Падарожжа са смакам.
13.30 Пра галоўнае.
15.00 Рудзі Макса падарожнічае па свеце.
18.00, 23.00 Галівуд і віно.
18.30, 23.30 Насустрач мастацтву.
19.00, 0.00 Цудоўныя падарожжы вачыма відавочцы з Варунам Шармай.

ANIMAL PLANET

7.00 Незвычайныя жывёлы Ніка Бейкера.
7.50 «Самыя забаўныя жывёлы планеты».
8.40 Сабакі, коткі і іншыя любімцы.
9.35 Планета дзікіх.
10.00 Уводзіны ў сабаказнаўства.
21.05, 1.40 Ветэрынар у дзікай прыродзе.
22.00, 2.35 «Хуткасць жыцця».
22.55 Кітовыя войны.
0.45, 5.20 Дзікія і небяспечныя.
3.30 Паліцыя Філадэльфіі: аддзел па абароне жывёл.
4.25 Твар у твар з белым мядзведзем.
6.10 «SOS дзікай прыроды».
6.35 «Аддзел па абароне жывёл».

EUROSPORT

9.30 Вось гэта дзіва!!!
10.30, 14.15 Усе віды спорту. Топ-10.

У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена!

Працяг праграмы тэлебачання чытайце ў наступным нумары.

MTV

5.00, 1.40 Music.
6.00 «Стэрэа_раніца».
8.35 «Элен і сябры». Серыял.
9.00, 1.15 Наступны.
9.35 Шалёныя продкі.
10.05 Кіначарт.
10.35 Праверка чутак.
11.05 Зоркі на далоні.
11.35 Dance Chart.
12.30, 22.35 News блок.
12.40, 18.50 «Подыум».
16.20, 22.45 «Сэкс у вялікім горадзе». Серыял.
17.30, 23.55 «Два з паловай чалавекі». Серыял.
17.55 Самая разумная мадэль.
21.40 Каляды з ведзьмай Джэніс.
0.20 «Клініка». Серыял.
0.50 «Клава, давай!». Серыял.

ІНТЭР+

7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00 Навіны.
7.10, 7.40, 8.10, 8.40 Раніца з Інтэрам.
9.10 Бацькі, якія кормяць.
9.20, 17.10, 0.55 Серыял «Простыя ісціны».
10.20, 16.40, 1.50 Серыял «Свая каманда».
10.45, 18.05, 3.30 Серыял «Суседзі».
11.10, 20.30 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
12.15 Я ўсё пра Вас ведаю.
13.10 Знак якасці.
13.40, 22.30, 5.50 Маст. фільм «Ігар Сававіч».
14.50, 21.20, 4.35 Маст. фільм «Раферці».
16.00, 0.10 Судовыя справы.
18.30, 4.00 Пазавочы. Н. Мейхер.
19.15, 2.15 Серыял «Танга ўтраіх».
20.00, 3.00 «Падрабязнасці».
23.40 Праўда жыцця.

ФІЛЬМ ДНЯ 11.05

«ТРЫ ТАПОЛІ НА ПЛЮШЧЫСЕ»
(СССР, 1967 г.)

Дзіўнае часам здараецца ў жыцці. Сустрэліся два чалавекі — сімпатычная замужняя вясковая жанчына, маці дваіх дзяцей, якая прыехала ў Маскву прадаваць хатнюю вяндліну, і маскоўскі шафёр, чалавек немалады і далёка не гаваркі.



Рэжысёр — Таццяна Ліёзнава. **У ролях:** Таццяна Дароніна, Алег Яфрэмаў, Вячаслаў Шалевіч, Аляўціна Румянцава, Мікалай Смірноў.

Заканчваецца падпіска. Заставайцеся са «Звяздой»!

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на I квартал або I-е паўгоддзе 2011 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 6 студзеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць эл. чайнік, кухонную ЭЛ-машыну, тэлевізар або печ ЗВЧ. Розыгрыш прызоў адбудзецца **11 студзеня 2011 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 22 студзеня 2011 г.**

Дастаўку тэлевізараў і печы ЗВЧ ажыццяўляе рэдакцыя. Астатнія прызы можна атрымаць у рэдакцыі **па 31 сакавіка 2011 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або I-е паўгоддзе 2011 года і пашпарта. **Пасля 31 сакавіка** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 11.11.10 г. **Тэрмін правядзення гульні — з 13.11.10 па 31.03.11.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1794 ад 03.11.10, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

8 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або I-е паўгоддзе 2011 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____ (аддзяленне сувязі)

_____ на I кв. або I-е паўг. 2011 года

Хатні адрас і тэлефон _____ (індэкс)

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання) | Колькасць камплектаў

на 2011 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____ (прозвішча, ініцыялы)

Куды _____ (адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету (індэкс выдання)

ПВ | месца | лі-тар

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт | падпіскі _____ руб. | пераадрасоўкі _____ руб. | Колькасць камплектаў

на 2011 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____ (прозвішча, ініцыялы)

Куды _____ (адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

«Звязда»: мінусы і плюсы

...МНЕ ЗАСТАЛАСЯ СПАДЧЫНА

Па сабе ведаю — прыемна чуць ад людзей нешта добрае. Таму і пішу.

Газету «Звязда», нягледзячы на беднасць, пастаянна выпісваў мой бацька, чытаў. Потым старымі звяздоўскімі нумарамі маці выклейвала сцены, і ў хаце адразу рабілася святлей. Да таго ж з дзяцей я быў старэйшым, і гадкоў з пяці бацька ўжо паказваў мне вялікія літары ў загалоўках, казаў, якая з іх як называецца.

Так, можна сказаць, «па сценах» і навучыўся чытаць, чытаць па-беларуску.

У 1939 годзе я пайшоў у школу, навучанне там было па-польску.

А потым пачалася вайна, і не стала ніякага. Тым больш што ў 1943-м бацька памёр, і я ў сям'і застаўся «за старэйшага». З мамай і малодшым братам чаго мы толькі ні зведалі — хапіла і голаду, і холаду, бо сваёй зямлі ў нас было мала. Даводзілася працаваць на чужой, «зарабляць каня»...

Але ж бацькава павага да чытання, да вучобы мне засталася ў спадчыну і захавалася на ўсё жыццё. На шчасце, ў суседстве з намі жыў (светлай памяці!) пісьменнік Янка Брыль. Я досыць часта хадзіў да яго, і ён заўсёды знаходзіў пра што пагаварыць са мной (прычым па-нашаму, па-вясковаму, па-беларуску), а потым выбіраў добрыя кніжкі і даваў пачытаць. Школа ў нас таксама была беларускай, а вось газету я тады амаль не выпісваў, бо не меў за што.

Іншая справа, калі вырас, калі пайшоў працаваць, калі з'явіліся грошы...

Карацей — больш за пяцьдзясят гадоў «Звязда» пастаянна прыходзіць у маю сям'ю, і я ўпэўнены, што лепшай газеты для нас, вяскоўцаў, проста не існуе, таму што выдаецца на роднай мове, таму, што друкуе шмат патрэбнага і карыснага, таму што адказвае на пытанні, таму што можа падбадзёрыць, пасмяшыць...

А яшчэ таму, што дазваляе нам, падпісчыкам, нешта выйграваць. Я, напрыклад, за апошнія восем гадоў атрымаў ад сваёй газеты аж тры прызы: веласіпед, гадзіннік і кухонны камбайн. Гэтага ж самага жадаю і ўсім астатнім: спачатку — стаць пастаяннымі падпісчыкамі «Звязды», чытачамі, а потым не ленавацца — дасылаць карткі на розыгрыш прызоў...

Пра сябе пісаць як быццам няма чаго: шмат гадоў пражыта, шмат чаго перажыта. Але сілы, дзякаваць Богу, яшчэ ёсць: адзінаццаць гадоў працую старастам у роднай вёсцы, якая, на жаль, вымірае. І пра гэта трэба пісаць. Абавязкова! Можа, тады не будзе неперспектыўных вёсак, можа, і ў іх будзе нешта мяняцца да лепшага.

М.П. БАБАРЫКА,
в. Загор'е, Карэліцкі раён.

Пасажыр, памятай пра дадатковыя цягнікі

24 і 31 снежня можна будзе скарыстацца дадатковымі электрацягнікамі: Талька — Мінск адпраўленнем у 12.54; Талька — Мінск адпраўленнем у 15.51; Мінск — Пухавічы (13.39); Пухавічы — Мінск (15.15); Мінск — Стоўбцы (12.45); Стоўбцы — Мінск, Інстытут культуры (16.02); Мінск, Інстытут культуры — Орша (14.10); Орша — Мінск-Усходні (18.26).

25 і 26 снежня, а таксама 1 і 2 студзеня прызначаюцца дадатковыя цягнікі: Мінск-Усходні — Барысаў адпраўленнем у 10.31; Барысаў — Мінск-Усходні (12.54); Мінск, Інстытут культуры — Стоўбцы (11.15); Стоўбцы — Мінск, Інстытут культуры (13.37); Мінск — Стоўбцы (12.45); Стоўбцы — Мінск, Інстытут культуры (16.02); Мінск — Пухавічы (13.39); Пухавічы — Мінск (15.15); Мінск — Пухавічы (17.02); Пухавічы — Мінск (18.47).

30 снежня ў раскладзе пасажыры пабачаць дадатковыя электрацягнікі: Мінск — Пухавічы адпраўленнем у 17.02; Пухавічы — Мінск (18.47); Мінск, Інстытут культуры — Стоўбцы (16.09); Стоўбцы — Мінск, Інстытут культуры (18.33).

31 снежня ў раскладзе будуць дадатковыя электрацягнікі: Мінск — Маладзечна адпраўленнем у 14.37; Маладзечна — Мінск адпраўленнем у 12.04. Таксама ў гэты дзень дадаткова прызначаюцца дызель-цягнікі: Орша — Лепель (13.44) і Лепель — Орша (17.49).

Сяргей РАСОЛЬКА.

МТС — аграрным гарадкам

ПРАЦАЎНІКІ — ГАЛОЎНАЕ БАГАЦЦЕ

Па добрых старых савецкіх фільмах мы ведаем, што абрэвіятура МТС калісьці абазначала скарочаную назву машынна-трактарнай станцыі. Сучаснікі герояў чорна-белага кіно, безумоўна, маглі толькі марыць аб тым, што настане час, калі многае ў сельскай гаспадарцы будзе механізавана, разумныя электронныя начынкі тых жа машын і трактароў дазволяць значна аблегчыць цяжкую працу вяскоўцаў. І, напэўна, толькі аматары чытаць фантастыку таго часу маглі фантазіраваць аб тым, што прама з поля ў далёкім будучым можна будзе патэлефанаваць у любы куточак свету.

На жаль, і ў XXI стагоддзі не паўсюды паважаныя вяскоўцы атрымалі тое, што даўно па праве заслужылі. Але на Віцебшчыне ў апошні час так многа з вялікімі энтузіязмам і тэмпамі робіцца, каб працаўнікі сельскай гаспадаркі працавалі плённа, каб сельскагаспадарчая галіна ў Прыдзвінскім краі актыўна развівалася.

Менавіта ў сельскагаспадарчых майстэрнях распачалося чарговае выязное пасяджэнне Віцебскага аблвыканкама: у механізаваным двары сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Іванскі» Чашніцкага раёна. **Губернатар Аляксандр Косінец** паведаміў прысутным адказным асобам пра сённяшні стан спраў у сельскай гаспадарцы ўсёй вобласці і бліжэйшых перспектывах развіцця. Нават цяпер, калі лічыць без аказання дзяржаўнай дапамогі, рэнтабельнасць сельскай гаспадаркі — 0,3 працэнта. І ўжо да 2015 запланавана ў памеры 5,6 працэнта.

Безумоўна, галоўны поспех у выкананні таго, што закладзена ў паперах, за «радавымі сяла» — простымі людзьмі. Кіраўніцтва аблвыканкама патрабуе клапаціцца не толькі аб тым, каб лічбы паказчыкаў розных у справаздачах былі прыгожымі. «Працавітыя людзі — галоўнае багацце» — гэта ўжо не дэвіз савецкіх часоў, а рэаліі сённяшняга дня. Працаўнікоў трэба берагчы. Таму і патрэбна стварыць на тых жа рамонтных майстэрнях умовы, як на перадавых заводах, — паставіў канкрэтную задачу губернатар. І не зацягваючы на гады, як часта было ў нас раней. Трэба капітальна адрамантаваць усе механізаваныя двары, дзе гэта патрабуецца. Адпаведная задача будзе выканана ў рамках спецыялізаваная абласной аграрнай праграмы. У механізаваных майстэрнях павінна быць цёпла і ўтульна, неабходна аднаўляць сістэмы ацяплення і вентыляцыі, а таксама зрабіць добрае асвятленне. Трэба забяспечыць людз

НЕАЖЫЦЦЁЎЛЕНЫ ПРАЕКТ,

Архіўная сенсацыя

або Чаму Сталін не падпісаў дакумент аб стварэнні Беларускай арміі ў 1942 годзе?

Працягваем гутарку журналіста «Звязды» Паўла БЕРАСНЕВА з гісторыкам Уладзімірам ГУЛЕНКАМ.

— Урад БССР у той час быў у Маскве? Адкуль такая ідэя?

— Пачну, мусіць, з апісання сітуацыі таго часу. 1942 год, вясна. У Мінску Кубэ дазволіў правесці 25 сакавіка ўрачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя гадавіне абвяшчэння БНР. Бітва за Маскву ўжо адбылася, але Сталінградскай яшчэ не было. Урад БССР эвакуяваны і знаходзіцца ў Маскве. Яшчэ не створаныя Цэнтральны штаб партызанскага руху і Беларускі штаб партызанскага руху (першы будзе створаны 30 мая 1942 года, а другі — толькі ў верасні). Чым жа займаецца партыйны і дзяржаўны апарат БССР? Разам з удзелам у вайне кіраўніцтва Беларусі праводзіць перапіс эвакуяванага насельніцтва Беларусі і беларусаў-вайскоўцаў у Чырвонай Арміі — і робіцца аналіз па ўзросце, адукацыі, спецыяльнасці, поле, стане здароўя і гэтак далей. У тым ліку былі падлічаны беларускія генералы, афіцэры: хто дзе служыць, якія ўзнагароды мае. Усяго на ўлік было ўзята 780 тысяч эвакуяваных беларусаў: у асноўным насельніцтва з БССР канцэнтравалася ў Башкірскай, Татарскай і Чувашскай АССР, Туркменскай і Казахскай ССР, а таксама ў Куйбышаўскай, Новасібірскай, Свярдлоўскай, Челябінскай і Тамбоўскай абласцях. Для чаго рабіўся такі перапіс, ды яшчэ ва ўмовах вайны? Гэта ж не проста людзей у адной вёсцы пералічыць, тут а быў зроблены велізарны аб'ём працы. Такі перапіс — папярэдняя праца, якая дала адказ наконт магчымых крыніц камплектавання будучай Беларускай арміі. І было высветлена, што беларусаў па ўсіх параметрах хопіць на стварэнне не адной, а хоць пяці армій!

Ну а ў жніўні 1942 года з'явіўся праект пастановы Дзяржаўнага камітэта абароны «Аб фарміраванні Беларускіх армій». Заўважце, што тут гаворка ідзе нават не пра адну , а пра дзве Беларускія арміі! Кожная з іх павінна была налічваць 84 560 чалавек, а агульная колькасць — 169 120 чалавек. 1-я Беларуская армія па задуме распрацоўшчыкаў павінна была дыслакавацца на тэрыторыі Маскоўскай Ваеннай Акругі, а 2-я Беларуская — на тэрыторыі Уральскай Ваеннай Акругі. Да 10 верасня 1942 года арміі павінны былі быць укамплектаваныя і распачаць баявую падрыхтоўку, а тэрмін гатоўнасці Беларускіх армій быў акрэслены як 10 лістапада 1942 года. Укамплектаваць новыя арміі планавалася «беларусамі і грамадзянамі іншых нацыянальнасцяў, якія пражывалі раней на тэрыторыі Беларускай ССР», тут жа прыводзіліся звесткі, што з дзейнай і рэзервовых армій можна ўзяць для камплектацыі 40 тысяч чалавек, з запасных часцей — 27 тысяч, з прызыўнікоў 1924 года нараджэння — 10 тысяч чалавек, з ліку курсантаў ваенных вучылішчаў — 3 тысячы чалавек, з унутраных і памежных войскаў НКУС — 3 тысячы чалавек, з колькасці эвакуяваных беларусаў па адборы ЦК КП(б)Б і СНК БССР — 14 тысяч чалавек (у тым ліку 4 тысячы жанчын), з ваенна-будаўнічых арганізацый — 5 тысяч чалавек, з кантынгентаў Заходняй Беларусі па адборы ЦК КП(б)Б — 10 тысяч чалавек, з колькасці эвакуяваных партыйных, савецкіх, наркамунутрспраўскіх, камсамольскіх і гаспадарчых працаўнікоў — 4 тысячы чалавек, з партызанскіх атрадаў — 5 тысяч чалавек, а таксама з добраахвотнай дывізіі, створанай Новасібірскім абкамам і аблвыканкамам для дзеянняў у Беларусі — 13 тысяч чалавек. Тут жа праектам пастановы прадугледжваліся заданні армейскім начальнікам наконт укамплектавання будучых Беларускіх армій кіруючымі кадрамі, зброяй, конямі, аўтатранспартам, харчамі і іншай маёмасцю.

— Дык адна Беларуская армія ці дзве?



— У жнівеньскім праекце пастановы Дзяржаўнага камітэта абароны — дзве арміі, але ж у пазнейшым кастрычніцкім праекце — ужо толькі адна Беларуская армія. У Нацыянальным архіве Беларусі захавалася некалькі дакументаў на гэты конт: дакладная запіска сакратара ЦК КП(б)Б таварыша Панамарэнкі да Сталіна, датаваная 14 кастрычніка 1942 года, і ўжо іншы праект пастановы Дзяржаўнага камітэта абароны аб стварэнні Беларускай арміі, завізіраваны таварышам Шчадзенкам, начальнікам упраўлення кадраў РСЧА. Гэты ж праект пастановы быў завізіраваны намеснікам Народнага Камісара Абароны (прозвішча яго не пазначана), ёсць віза начальніка аргштатнага ўпраўлення генерала-маёра Чацверыкова.

— І чым абгрунтоўвае неабходнасць стварэння Беларускай арміі таварыш Панамарэнка?

— Панцеляймон Кандратавіч спасылаецца на ўзрослую самасвядомасць беларусаў, а таксама на прагу да вызвалення акупаванай тэрыторыі Беларусі. Цытую, што напісана ў дакладной запісцы: *«У час вайны моцна выраслa нацыянальная самасвядомасць беларусаў, умацаваліся глыбокія сувязі і любоў да рускага народа. Даўняя нянавісць беларусаў да немцаў, крывавая палітыка акупантаў у Беларусі выклікалі ў народзе разумненне вялізнай небяспекі нацыянальнаму існаванню беларусаў. Выраслa вялізнае азлабленне, пачуццё непрымірымай нянавісці да немцаў. Гэта знаходзіць выражэнне ў шырока разгорнутым партызанскім руху ў Беларусі і ў баявой устойлівасці чырвонаармейцаў-беларусаў на франтах. ЦК КП(б) Беларусі ўносіць прапанову аб утварэнні нацыянальнай Беларускай арміі. Такая армія, скамплектаваная з беларусаў, людзей, якія ненавідзяць немцаў, прагнуць помсты, будзе арміяй вялікага наступальнага парыву і ўдарнай сілы. Гэтая армія ўсімі імкненнямі будзе накіраваная на захад, на вызваленне родных месцаў. Пры вызваленні хаця б часткі Беларусі армія будзе мець вялізную крыніцу папаўнення»*. Касцяком для фарміравання Беларускай арміі павінны былі стаць 6 стралковых дывізій па 10374 чалавекі, а агульная колькасць арміі павінна была скласці 84 тысячы чалавек. Крыніцы для фарміравання беларускай арміі былі прадугледжаныя амаль тыя ж, што і ў папярэднім праекце пастановы, ну хіба толькі трошкі ў іншай колькасці. Што тычыцца камандавання арміяй і ўкамплектавання афіцэраў, то тут ніякіх праблем не было. Як піша Панамарэнка, кадраў бы хапіла і на пяць Беларускіх армій: *«Пытанне аб малодшым, сяржнім і старшым начсаставе і палітсаставе вырашаецца добра. Гэтых кадраў хапіла б і на пяць Беларускіх армій. У вышэйшым саставе Чырвонай Арміі маецца 66 генералаў-беларусаў. З іх камандуюць арміямі — 6, камандзіруў карпусоў і дывізій — 12, начальнікаў штабоў армій — 8»*.

Беларуская армія павінна была дыслакавацца на тэрыторыі Маскоўскай ваеннай акругі, яе фарміраванне і ўкамплектаванне павінны былі скончыцца да 15 снежня 1942 года, а тэрмін гатоўнасці быў вызначаны да 1 мая 1943 года.

— А сімволіка для Беларускай арміі прадугледжвалася?

— Вядома, як жа без гэтага. Для пачатку варта адзначыць, што шэсць дывізій Беларускай арміі павінны былі насіць імя герояў-беларусаў, прычым першыя пяць — Герояў Савецкага Саюза, што загінулі ў час ВАВ (імя Мікалая Грыцаўца, Льва Даватара, Мікалая Гастэлы, Ціхана Бумажкова, Георгія Смалячкова), а 6-я стралковая дывізія — імя Кастуся Каліноўскага. Дарэчы, у жніўні 1942 года, калі яшчэ планавалі стварыць 2 Беларускія арміі, дзе адпаведна і стралковых дывізій было б 12, шэсць астатніх дывізій планавалася назваць імя Фрунзе, імя Героя Савецкага Саюза Міхаіла Сільніцкага, імя Вярхоўнага Савета БССР, імя Героя Савецкага Саюза Анатоля Талаліхіна, імя Уладзіміра Ванеева, імя Героя Савецкага Саюза Вікенція Наркевіча.

Цікава, што ў больш раннім дакументе пад назвай «Пытанні палітычнага выхавання і дысцыпліны» прапаноўваецца назваць армію Беларускай асобай арміяй, а дывізіям даць назвы імя таварыша Сталіна, а таксама па геаграфічных прыкметах — Мінская, Віцебская, Гомельская, Палеская, Магілёўская і Баранавіцкая. А вось імёнамі герояў-беларусаў прапаноўвалася назваць брыгады. Што тычыцца палкоў, то тут і імёны, і геаграфія — 17-ы пяхотны Мінскі полк, 3-і пяхотны Гомельскі полк, 7-ы пяхотны Полацкі полк, 15-ы пяхотны імя Героя Савецкага Саюза Сільніцкага Суражскі полк, а таксама стралковы Вілейскі імя Янкі Купалы!

(Працяг будзе.)

Чыгунка рыхтуе і дадатковыя вагоны, і дадатковыя цягнікі

У сёлетнім навагоднім сезоне пік міжнародных пасажырскіх перавозак чакаецца 29 і 30 снежня, а таксама 2, 9 і 10 студзеня. У мясцовых зносінах чыгунка будзе найбольш запатрабаванай 30 і 31 снежня.

У калядныя і навагоднія святы і дні зімовых канікулаў па Беларускай чыгунцы будуць курсіраваць 20 мясцовых дадатковых цягнікоў. У міжнародных зносінах дадаткова прызначана 107 цягнікоў, з іх 52 — фарміравання Беларускай чыгункі, і 55 — Федэральнай пасажырскай кампаніі (даччынай кампаніі Расійскай чыгункі).

Першыя дадатковыя міжнародныя цягнікі будуць курсіраваць па беларускай магістралі з 24 снежня на кірунках: Магілёў — Масква, Масква — Салігорск/Віцебск і Масква — Мінск. У пікавыя дні перавозак будуць дадаткова прызначаныя цягнікі па такіх маршрутах як Мінск — Масква, Брэст — Масква, Масква — Брэст, Санкт-Пецярбург — Брэст, Брэст — Санкт-Пецярбург, Гомель — Санкт-Пецярбург, Санкт-Пецярбург — Гомель, Масква — Кракаў, Масква — Прага.

Што тычыцца дадатковых цягнікоў у мясцовых зносінах, дык першы з іх таксама пачне курсіраваць 24 снежня: гэта цягнік Мінск — Брэст. На 29 снежня прызначаныя дадатковыя цягнікі па кірунках Віцебск — Мінск, Мінск — Віцебск і Мінск — Брэст. Дадатковы цягнік Гомель — Брэст будзе курсіраваць 7 і 9 студзеня.

Самым папулярным у святочныя дні традыцыйна з'яўляецца маршрут Мінск — Брэст — Мінск. Са сталіцы ў Брэст па адным дадатковым цягніку будзе курсіраваць 29 і 30 снежня, 6, 7, 10 і 12 студзеня. Па маршруце Брэст — Мінск па адным дадатковым цягніку прызначана на 30 снежня, 2 і 7 студзеня, і па два дадатковыя цягнікі — на 3 і 4 студзеня. Дабрацца ў святочныя дні з Мінска да Брэста дапамогуць і дадатковыя электрацягнікі, якія будуць курсіраваць па кірунку Мінск — Баранавічы — Брэст 30 і 31 снежня, а таксама 6 студзеня. Для пасажыраў 31 снежня з Мінска ў Пінск будзе арганізаваны дадатковы цягнік, які адправіцца са сталіцы ў 12.20 і прыбудзе ў Пінск у 17.40.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Вадалеі могуць выпраўляцца ў падарожжа, а Дзевы рыхтавацца да новых прыемных знаёмстваў

АВЕН. Можаце дабіцца значных поспехаў у многіх справах. Вас могуць цалкам заняць бытавыя праблемы. Кампрамісныя рашэнні падыходзяць для працы і зусім не прыдатныя дома. Не давайце спакусам заваладаць вамі, своечасова адыходзьце ў бок ці пераключайце ўвагу на штосьці іншае. Калі першая палова тыдня абяцае даволі пазітыўныя паказчыкі ў многіх галінах, то ў чацвер і пятніцу лепш не пачынаць нічога новага і тым больш глабальнага.

ЦЯЛЕЦ. Час падвесці вынік таго, што пражыта, і адкрыць для сябе новую старонку ў жыцці. Пастарайцеся сачыць за сваімі словамі і дзеяннямі — яны могуць згуляць з вамі злы жарт. Вучыцеся цаніць час. Пастарайцеся не ўшчамляць інтарэсы партнёраў і калег. Вам неабходна быць больш уважлівымі, каб не дапускаць памылак. Усміхайцеся з самай раніцы і пастарайцеся заклікаць на дапамогу ўсю магутнасць стваральнай энергіі.

БЛІЗНЯТЫ. Актыўныя і рашучыя дзеянні могуць адкрыць перад вамі новыя далягляды. Будзьце ўважлівыя: небяспечна як недапрацаваць, так і перапрацаваць. У сераду і чацвер пажадана не планаваць ніякіх важных сустрэч і мерапрыемстваў. Здольнасць адэкватна ацэньваць сітуацыю можа значна знізіцца, таму будзьце больш уважлівымі. У пятніцу будуць лёгка атрымлівацца справы, якія звязаны з праявай асабістай ініцыятывы.

РАК. Тыдзень падорыць мноства цікавых сустрэч і новай інфармацыі. Могуць пачнуцца зусім новыя, нечаканыя здольнасці. Суму і дэпрэсіі побач з вамі проста не знойдзецца месца. Не хавайце ад навакольных свае таленты і магчымасці. Калі пры гэтым не дазволіце эгаізму дарвацца да ўлады, то спрэчкі і непаразуменні абмінуць вас. Пачуцці набудуць глыбіню, а думкі — узвышанасць.

ЛЕЎ. Перш чым згадзіцца на прывабную прапанову, адсуньце свае эмоцыі і дайце зялёнае святло логіцы. З серады і да канца тыдня пастарайцеся пазбягаць непрыемных сустрэч. Давяздзецца заклікаць на дапамогу мудрасць, цярпенне і зрабіць вялікую работу над памылкамі. Будзьце больш уважлівымі пры зносінах, бо любое неасцярожнае слова можа павярнуцца супраць вас.

ДЗЕВА. Падзеі спрыяюць раскрыццю таленту. Ваша кумунікабельнасць дазволіць завесці новыя прыемныя знаёмствы — і яны адкрыюць перспектывы, пра якія вы нават не марылі. Старайцеся не давяраць выпадковым знаёмым. Пастарайцеся ў другой палове тыдня пазбягаць кантактаў: вялікая рызыка з-за дробязі разбурыць шматабяцальныя сувязі.

ШАЛІ. Пастаўленыя жыццёвыя пытанні запатрабуюць яснасці ў думках, дакладнасці ў словах і вызначанасці ў планах на будучыню. Пачынаць рэалізацыю буйных праектаў і планаў не варта, бо вельмі вялікая верагоднасць сутыкнуцца з рознымі перашкодамі. Вас будуць перапаўняць творчыя ідэі. Прыслухайцеся да голасу інтуіцыі — гэта дазволіць пазбегнуць многіх памылак і наблізіць да ажыццяўлення запаветнага жадання.

СКАРПІЁН. Тыдзень будзе поўны вельмі значных падзей — як на працы, так і дома. У панядзелак, пры жаданні, можаце ажыццявіць даўнія задумы. У аўторак рызыка ці авантура прывядзе да правалу ці расчаравання. Серада — дзень кампрамісаў, таму з начальствам лепш не канфліктаваць. Праявіце цярпімасць — і вашы справы будуць складвацца больш паспяхова.

СТРАЛЕЦ. Вас чакае мноства сустрэч, дзякуючы якім зможаце атрымаць неабходную і вельмі каштоўную інфармацыю. Не дапускайце залішняй мітусні ў думках і ўчынках. Пазбягайце праяў зайздрасці і сквапнасці. Пастарайцеся быць больш спакойнымі і ўраўнаважанымі, не губляйце кантроль над эмоцыямі, інакш варагодны крах вашага прэстыжу. Акуратнасць і ўвага — ключавыя словы гэтага тыдня.

КАЗЯРОГ. Тыдзень абяцае пачацца з добрых вестак, якія адкрыюць перад вамі шырокія далягляды. Сіняя птушка ўдачы можа зляцець проста ў рукі. Зараз важна не спалохацца раптоўнага поспеху і не пачаць мітусіцца на радасцях. У сераду на працы і дома магчымы канфліктныя сітуацыі, таму будзьце больш асцярожнымі ў словах і ўчынках. Кантралюйце кожны крок, інакш усплёск эмоцый з далейшымі разборкамі практычна непазбежны.

ВАДАЛЕЙ. Пастарайцеся быць больш мяккімі, чым звычайна. Пачынаючы з другой паловы тыдня будуць удалымі падарожжы з мэтай адпачыць. Тыдзень пройдзе паспяхова, калі прыўзняты настрой на пачатку вы здолееце захаваць да яго канца. У сераду варта з асцярожнасцю паставіцца да кампліментаў ад людзей, з якімі вас зводзяць дзелавыя пытанні. Не дазваляйце сабе расслабіцца — гэтым могуць скарыстацца вам ва ўбытак. Ды і ў цэлым неслужбовыя адносіны з калегамі не рэкамендуюцца.

РЫБЫ. Вас усе будуць любіць, паважаць і слухаць. Вашы веды будуць запатрабаваны, гумар дарэчны. Вызваляйцеся ад навязлівых ідэй і страхаў. Не бярыце на сябе вялікі аб'ём працы, рэальна разлічвайце сілы. Пастарайцеся не паддавацца на спакусы і правакацыі. Лепш загадзя вызначыць лінію сваіх паводзін і абавязкова прытрымлівацца яе.

ЗАВЕРЕНО
Директор Департамента
по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
Гальперин А.Л.
21.12.2010

УТВЕРЖДЕНО
Решением Совета директоров
Закрытого акционерного
общества Банк ВТБ (Беларусь)
06 декабря 2010 года,
протокол № 13

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об открытой продаже облигаций Закрытого акционерного общества Банк ВТБ (Беларусь) седьмого выпуска

1. Наименование эмитента
на русском языке:
полное: Закрытое акционерное общество Банк ВТБ (Беларусь);
сокращенное: ЗАО Банк ВТБ (Беларусь);
на белорусском языке:
полное: Закрытае акцыянернае таварыства Банк ВТБ (Беларусь);
сокращенное: ЗАТ Банк ВТБ (Беларусь).

2. Дата, номер государственной регистрации эмитента и наименование органа, его зарегистрировавшего
ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) (именуемое в дальнейшем – эмитент, Банк) создано в соответствии с законодательством Республики Беларусь на основании Распоряжения Президента Республики Беларусь № 47рп от 04.03.1996 года и Договора о совместной деятельности по созданию Славянского совместного акционерного коммерческого нефтяного банка «Славнефтебанк» от 03 февраля 1995 года. Банк зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 07 октября 1996 года, регистрационный № 57.

Решением Общего собрания акционеров от 14 декабря 2000 года, протокол № 2, Славянский совместный акционерный коммерческий нефтяной банк «Славнефтебанк» переименован в Закрытое акционерное общество «Славнефтебанк». Изменения в устав Банка, связанные с изменением наименования, зарегистрированы Национальным банком Республики Беларусь 29 декабря 2000 года.

В соответствии с решением Общего собрания акционеров Банка от 17 сентября 2007 года, протокол № 6, Закрытое акционерное общество «Славнефтебанк» переименовано в Закрытое акционерное общество Банк ВТБ (Беларусь). Изменения в устав Банка, связанные с изменением наименования, зарегистрированы Национальным банком Республики Беларусь 27 ноября 2007 года.

3. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)
Республика Беларусь, 220007, г. Минск, ул. Московская, дом 14, телефон: (017) 309 15 15, факс (017) 309 15 30, e-mail: info@vtb-bank.by.

4. Сумма зарегистрированного уставного фонда
Уставный фонд Банка по состоянию на 01.11.2010 составляет **84 370 200 000** (Восемьдесят четыре миллиарда триста семьдесят миллионов двести тысяч) белорусских рублей.

5. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться годовой отчет эмитента (бухгалтерский баланс, отчет о прибыли и убытках, отчет об изменении капитала, отчет о движении денежных средств), и сроки его публикации
Годовой отчет Банка публикуется в газете «Звязда» не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным.

6. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии)
С более подробной информацией и Проспектом эмиссии облигаций можно ознакомиться в Банке по адресу: г. Минск, ул. Московская, дом 14.

7. Сведения о проведении открытой продажи облигаций

7.1. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение
Решение о выпуске облигаций **седьмого** выпуска (далее – облигации) принято Советом директоров Банка 06 декабря 2010 (протокол № 13).

7.2. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество облигаций:
Форма выпуска облигаций – именные, дисконтные, в бездокументарной форме (в виде записей на счетах), неконвертируемые.

Объем эмиссии облигаций составляет – 60 000 000 000 (Шестьдесят миллиардов) белорусских рублей.

Количество облигаций, предлагаемых к открытой продаже – 60 000 (Шестьдесят тысяч) облигаций, которым присвоена серия «ВТБО-7», номера «000001-060000».

7.3. Номинальная стоимость облигаций
Номинальная стоимость облигаций - 1 000 000 (Один миллион) белорусских рублей.

7.4. Цель выпуска облигаций
Целью выпуска облигаций является привлечение временно свободных денежных средств юридических лиц для формирования ресурсной базы Банка.

7.5. Период проведения открытой продажи облигаций
Открытая продажа облигаций проводится **с 29.12.2010 по 29.06.2011** включительно и прекращается в случае полной реализации всего объема эмиссии облигаций.

7.6. Место и время проведения открытой продажи облигаций
Открытая продажа облигаций осуществляется на внебиржевом рынке и/или в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (г. Минск, ул. Сурганова, 48а) в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Владельцами облигаций могут быть только юридические лица – резиденты и нерезиденты Республики Беларусь в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Для приобретения облигаций юридические лица могут обращаться в Банк (г. Минск, ул. Московская, дом 14) в течение рабочего времени (понедельник – четверг – с 8.30 до 17.30, пятница – с 8.30 до 16.15).

Юридические лица, изъявившие желание приобрести облигации на внебиржевом рынке, обязаны перечислить Банку денежные средства в безналичном порядке в соответствии с договором купли-продажи (первичного размещения) облигаций.

Расчеты при открытой продаже облигаций на биржевом рынке проводятся в соответствии с регламентом расчетов в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

7.6.1. Цена продажи облигаций
В день начала открытой продажи облигации размещаются по минимальной цене, которая составляет **826837 (Восемьсот двадцать шесть тысяч восемьсот тридцать семь) белорусских рублей**.

Начиная с календарного дня, следующего за днем начала открытой продажи облигаций, облигации продаются первому их собственнику по текущей стоимости, определенной на день продажи.

Текущая стоимость дисконтных облигаций рассчитывается по следующей формуле:

$$С = Ц + \frac{Ц \times П}{100} \times \left(\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366} \right),$$

где:
С – текущая стоимость дисконтных облигаций (белорусских рублей);
Ц – минимальна цена продажи облигаций, определенная эмитентом в день начала открытой продажи (**826837 (Восемьсот двадцать шесть тысяч восемьсот тридцать семь) белорусских рублей**);
П – доходность, установленная при выпуске **(10,5 % годовых**);
Т365 – количество дней обращения дисконтных облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
Т366 – количество дней обращения дисконтных облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.

Количество дней обращения облигаций определяется с даты начала их открытой продажи (размещения) по дату расчета их текущей стоимости. При этом день начала открытой продажи (размещения) и день расчета их текущей стоимости считаются одним днем. При этом, если срок (период) делится переходом с календарного года, состоящего из 365 дней, на календарный год, состоящий из 366 дней, либо наоборот, то при определении значений Т365 и Т366 уменьшается количество дней в первой части периода независимо от количества дней в календарном году.

Расчет цены продажи и текущей стоимости осуществляется по каждой облигации, исходя из фактического количества дней в году. Проценты начисляются за каждый календарный день года.

Расчет цены продажи осуществляется с точностью до одного белорусского рубля. Округление производится по правилам математического округления.

7.7. Срок обращения облигаций
Срок обращения облигаций составляет **729 (Семьсот двадцать девять) календарных дней**, **с 29 декабря 2010 года по 27 декабря 2012 года**. Для расчета срока обращения облигаций день начала открытой продажи и день начала погашения облигаций считаются одним днем.

7.8. Дата начала погашения облигаций и порядок их погашения
Дата начала погашения облигаций – **27 декабря 2012 года**.

Погашение облигаций производится владельцам облигаций, имеющим право приобретать облигации в соответствии с условиями выпуска облигаций, в день их погашения на основании реестра владельцев облигаций. Реестр владельцев облигаций формируется по состоянию на **21 декабря 2012 года**.

Владельцы облигаций обязаны прекратить все сделки с облигациями с **21 декабря 2012 года**.

В случае, если день погашения облигаций приходится на нерабочий день, погашение облигаций осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты на сумму погашения за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.

Банк осуществляет списание денежных средств со своего счета по реквизитам владельцев облигаций в день погашения облигаций. Обязанность по погашению облигаций считается исполненной с момента списания денежных средств со счета Банка по реквизитам владельцев облигаций.

В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о банковских реквизитах владельцев облигаций, а также в случае, если реестр содержит ошибочные банковские реквизиты, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на счете Банка до непосредственного обращения владельца облигаций. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

При погашении облигаций владельцам возмещается номинальная стоимость облигаций денежными средствами в сумме и валюте номинала облигации в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

7.9. Размер или порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты
Минимальная цена продажи облигаций на первичном рынке устанавливается Банком в первый день открытой продажи облигаций из расчета доходности **10,5 процентов годовых** к погашению.

Продажа облигаций осуществляется по цене ниже номинальной стоимости. Доходом по облигациям является дисконт, который рассчитывается по следующей формуле:

$$Д = Н – С,$$

где:
Д – дисконт (белорусских рублей);
Н – номинальная стоимость облигаций (1 000 000 белорусских рублей);
С – цена продажи дисконтных облигаций при их размещении (белорусских рублей).

Выплата дохода осуществляется единовременно при погашении облигаций.

7.10. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь
При запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь денежные средства, внесенные в их оплату, возвращаются инвесторам не позднее 30 календарных дней со дня принятия соответствующего решения с уплатой процентов за фактический срок пользования денежными средствами исходя из текущей стоимости, рассчитанной по формуле, указанной в п. 7.6.1. настоящей краткой информации, в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

7.11. Дата и номер регистрации облигаций в регистрирующем органе
Облигации зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 21 декабря 2010 года, регистрационный номер выпуска: 5-200-02-0918.

7.12. Информация об обеспечении облигаций
Облигации выпускаются в соответствии с подпунктом 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 г. № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг».

Общий размер обязательств по облигациям не превышает 80 (Восемьдесят) процентов нормативного капитала Банка.

Нормативный капитал Банка по состоянию на 01.11.2010 составляет 316 786,0 млн. белорусских рублей.

Выпуск облигаций согласован с Национальным банком Республики Беларусь – постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от 16 декабря 2010 года № 552.

Председатель Правления **В.В. Иванов**

Главный бухгалтер **М.В. Дудко**

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 17.05.2010 г. № 23, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 101165625

Прыходзьце ў філармонію павіншаваць Народнага паэта!

Юбілейны вечар Рыгора Барадуліна адбудзецца 28 снежня ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі ў Мінску

«Як так, 75 гадоў Барадуліну споўнілася 24 лютага!» — заўважаць самыя пільныя чытачы «Звязды». Аднак яшчэ пільнейшыя згадаюць, што гэтую дату класік, на жаль, сустрэў у рэанімацыі — цэлы месяц медыкі змагаліся за жыццё дзядзькі Рыгора... І тое, што вечарына адбываецца толькі цяпер — не бяда. Такія даты, як 75 гадоў, святкуюцца не адзін дзень, а цэлы год!

Вечарына ў філармоніі пройдзе ў форме прэзентацыі фільма пра Барадуліна «Як па сухому...» рэжысёра Алеся Матафонава. Гледачы ведаюць спадара Алеся па цыкле бліскучых дакументальных фільмаў «Лабірынты» на тэлеканале ЛАД. Фільм пра Барадуліна атрымаўся не менш удалы — паэта здымалі на ягонай радзіме, ва Ушачах. Каля каміна, за пісьмовым сталом, ля бацькавага вяза. Гэтае дрэва ля брамкі Барадулінскай хаты — знакавае. Калі паэт вучыўся ў 10 класе, ён прымацаваў да яго шпакоўню. Невысока — як лесвічка дастала. Цяпер, каб пабачыць шпакоўню, трэба задзерці галаву — за прамінулы час шпакоўня ўзнеслася ў нябёсы метраў на дваццаць!

Фільм вельмі дакладна перадае, што Барадулін — не трыбунны паэт, не крыкун і хвалько, як некаторыя. Ён — камерны, інтымны, глыбінны. Але тое, што ён гаворыць нават шэптам, чуюць тысячы людзей. У фільме, апроч дзядзькі Рыгора, гавораць ягоныя сябры. Ёсць і кур'ёзныя моманты: адна сямідзесяцігадовая жанчына апантана распавядае, «як Рыгора мама гадавала», «якія яна яму песні спявала», а потым сціпла прызнаецца, што гэта яна натхніла Барадуліна напісаць кнігу духоўнай паэзіі «Ксты». Што ж, для некаторых пастаяць побач з Барадуліным — адзіны сродак застацца ў гісторыі...

— На імпрэзе будзе прэзентаваны фільм на вялікім экране, — гаворыць рэжысёр канцэрта Ніна ОСІПАВА, галоўны рэжысёр канцэртных залаў Белдзяржфілармоніі. — Прэзентацыю будзе весці паэт Леанід Дранько-Майсюк. Выступяць зводны хор Чырвонага касцёла «Голас душы», Дзяржаўны камерны хор Рэспублікі Беларусь, Якаў Навуменка — яны выканаюць песні на вершы Рыгора Барадуліна. Мастацкі кіраўнік Тэатра беларускай драматургіі Валер Анісенка будзе дэкламаваць вершы класіка. А Канстанцін Шараў выканае арганную п'есу.

Квіткі можна прыдбаць у касе філармоніі. Непрыемна, што большасць з іх была выкупленая адразу адной установай. Таму нам з вамі засталіся толькі на балкон. Што праўда, недарагія — па 6000-7000 рублёў.

Глеб ЛАБАДЗЕНКА. Фота аўтара.

Дарэчы

«ЯК ПА СУХОМУ...»

Верш «Як па сухому» Рыгор Барадулін напісаў у свой дзень народзінаў, 2007 года. Па збегу акалічнасцяў — у рэанімацыі. Здароўе за апошнія гады падводзіла народнага паэта неаднойчы. Дзядзька Рыгор згадвае, што баяўся забыць гэты верш, бо не мог тады пісаць, і захаваў яго ў сваёй памяці...

Дзень, як сын дачаканы, падрос.
Ціша стому вярнула дадому.
І ступаў малады Хрыстос
Па вадзе, як па сухому.
Тыя, што над вадой
І ў вадзе,
Усе нямелі ў нябесным здзіве,
Ведалі,
Гэта Сейбіт ідзе
Сеяць душы
На горкай ніве.
Досвітак загараўся й гас.
І рабіліся блізкімі далі.
Хвалі ўрэшце дагналі час
І Хрыстовы
сляды захавалі.
Ростань выкне вініць успамін.
У сустрэчы сцежка крывая.
Калі Госпаду верыш, як Сын,
Дык цябе і вада трымае...

24 лютага 2007, рэанімацыя

ПАШЫРАЙ ДЫЯПАЗОН З «ВІЦЬБАЙ»

Інжынер-тэхнолог прадпрыемства Таццяна ШАХМАТАВА.

Вы ўжо прыдумалі, што пакласці дзецям пад ёлку альбо ўкінуць у шкарпэтку, ці як спакаваць для любімых смачны падарунак? А чаму б не паспрабаваць адысці ад традыцыйных цукерак і замяніць іх, напрыклад, на вафлі? Камунальнае вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Віцебскі кандытарскі камбінат «Віцьба» прапануе настолькі шырокі хрумсткі асартымент, што сёння кожны зможа знайсці сабе прадукт па душы. Павялічваецца не толькі асартымент, але і колькасць выпускаемай прадукцыі: так, за месяц тут вырабляецца столькі вафелек, што Дзядулю Марозу хопіць на кожнага жыхара Беларусі. Камбінат працуе кругласутачна, у месяц тут выпускаецца каля 1000 тон прадукцыі. Дарэчы, калі будзеце купляць гатовыя салодкія падарачныя наборы, цалкам магчыма, што вам трапяцца і вырабы «Віцьбы»: каля 30 тон вафелек ляжа ў навагоднія падарункі. Вы самі пакуеце салодкія наборы? Абавязкова звярніце ўвагу на прысмакі Віцебскай кандытарскай фабрыкі, тым больш што яна прапануе шэраг навінак.

Дырэктар кандытарскага камбіната «Віцьба» Уладзімір САЗОН.

VITBA.BY

«Vitba.by» (Віцьба. Бай) — назва новай прадукцыі кандытарскага прадпрыемства «Віцьба». Гэты цудоўны вафельны батончык у малочнай глазуры з пасыпкамі з арахісу, фундуку ці паветранага рысу даступны нават тынэйджарам, у якіх не багата кішэнных грошай і якім не хапае на дарагія замежныя ласункі. Але разлічана гэта прадукцыя не толькі на падлеткаў. Напэўна, навінку ў стыльнай, моладзевай упакоўцы не пакінуць без увагі ўсе мабільныя ласуны, якія заўсёды ў курсе навін, якія пакідаюць каментарыі на разнастайных форумах і заводзяць сяброў у інтэрнэце. Таму і выпускаецца батончык «Vitba.by» з дэвізам «Пашырай дыяпазон!».

Дарэчы, калі ў адрасным радку набраць «Vitba.by», можна завітаць на сайт прадпрыемства, дзе пазнаёміцца і з іншымі смачнымі прапановамі ад «Віцьбы».

Батончык «Vitba.by» можа скласці дастойную канкурэнцыю замежным прысмакам. «Віцьба» не капіруе чужыя смакі — яна прапаноўвае сваю ўнікальную прадукцыю для мабільнага пажыўнага салодкага перакусу. Шматслойная хрусткая вафля з начыннем, якое ўтрымлівае какава, пакрыта малочнай глазурай і пасыпана кавалачкамі фундуку, арахісу і рысавымі шарыкамі. Звяртаем увагу: батончыкі з фундуком і арахісам на 15 працэнтаў складаюцца з натуральных арэхаў! Смак батончыка падказваюць колеры на ўпакоўцы: блакітны —паветраны рыс, чырвоны — арахіс, зялёны — фундук.

На камбінаце пачала дзейнічаць выдатная новая лінія, якая дазволіць не толькі вырабляць новыя батончыкі з пасыпкамі, але і рэалізоўваць іншыя задумы супрацоўнікаў прадпрыемства. У планах і пашырэнне лінейкі «Vitba.by» (гэта могуць быць батончыкі ў шакаладнай глазуры, новыя варыянты пасыпак, напрыклад, з курагой, семкамі) і глазіроўка трубачак і пячэння.

Магчыма, ужо ў хуткім часе батончыкам «Vitba.by» мабільны спажывец дасць сваю альтэрнатыўную назву. Можа гэта будзе «беларускі снікерс»? Ва ўсялякім разе, падобныя прыклады з замяшчэннем замежнай прадукцыі ў кандытарскага камбіната «Віцьба» ўжо ёсць. Так, «Арэшкі зерневыя максі» (у асартыменце з фундуком і Амарэла), што выпускае камбінат, людзі ўжо называюць «беларускім рафаэла». Але, бясспрэчна, гэтыя сучасныя, стыльныя батончыкі знойдуць дастойнае месца на рынку. Чаму? А вы пасмакуйце навінку «Vitba.by» — і вам абавязкова захочацца паўтарыць. Пашырайце дыяпазон з «Віцьбай»! Дыяпазон смаку, новых уражанняў, новых ідэй.

Мы паспрабавалі высветліць у супрацоўнікаў «Віцьбы», якія з прысмакаў камбіната яны б раілі пакласці пад навагоднюю ёлку, і нам называлі самыя розныя прадукты: ад класічнай «Віцьбы» да супернавінкі «Vitba.by» . А выбіраць тут сапраўды ёсць з чаго — зараз у асартыменце прадпрыемства больш за 170 найменняў!

ВАФЕЛЬНЫЯ САКРЭТЫ

Мы не будзем раскрываць сакрэты рэцэптуры, а яны ў «Віцьбы» сапраўды ёсць. У аснове любога прадукту — асаблівы, вельмі далікатны вафельны ліст. Над кожнай навінкай тут чаруюць месяц, а часам і не адзін: рэцэптура адпрацоўваецца тэхнолагамі і ў лабараторыі, і ў цэху, прадукцыя праходзіць і праз дэгустацыйную раду, абавязкова вялікая ўвага надаецца дызайну, упакоўцы.

Вафелькі «Віцьбы» якасныя і таму, што тут выкарыстоўваецца сучасная тэхналогія вытворчасці, і таму, што на прадпрыемстве працуе высокакваліфікаваны персанал (многія работнікі маюць вышэйшую адукацыю). Трэба адзначыць, што за гэты год укладанне ў інвестыцыі на прадпрыемстве склала амаль 10,5 мільярда!

Сёння задзейнічаны ўсе вытворчыя плошчы кандытарскага камбіната. На месцы былога складскога памяшкання з'явілася выдатная новая лінія (аўстрыйская ўстаноўка для выпечкі вафель HAAS, украінскае абсталяванне для глазуроўкі, італьянскае — для ўпакоўкі, апошняе, між іншым, дазваляе пакаваць у хвіліну 225 адзінак).

Як паведаміла **начальнік вафельнага цэха Таццяна ФІЛОНЕНКА**, новая лінія дазваляе выпускаць глазураваных батончыкаў 3900 кг, а батончыкаў «Vitba.by» з пасыпкай арахісам, паветраным рысам, фундуком 5200 кг за 2 змены.

Дырэктар кандытарскага камбіната «Віцьба» Уладзімір САЗОН заўважае:

— Мы цэнім і паважаем нашых спажыўцоў і імкнёмся зрабіць усё магчымае, каб задаволіць патрэбы людзей любога ўзросту. Галоўнае, уся наша прадукцыя, незалежна ад кошту, незалежна ад яе пазіцыянавання на рынку, — высакаякасная.

Ласуноў, якія ўпадабалі вафельныя торцікі «Віцьбы», парадуе навіна. У хуткім часе ў продажы з'явіцца **тарты «Віцебскі гасцінец»** з пасыпкамі з паветранага рысу, курагі, арахісу. Хочаце «эксклюзіў»? Можаце заказаць незвычайны вафельны торт у фірменных крамах (на сталічнай Камароўцы ці ў гандлёвым доме «Беларусь» у Віцебску) альбо непасрэдна на самім прадпрыемстве. Яны могуць быць любога памеру і ўпрыгожвацца разнастайнымі ўзорамі і надпісамі. Так, тут заказваюць вясельныя тарты. Сярод самых незвычайных на «Віцьбе» зроблены трох'ярусныя тарты вагой у 20 кілаграмаў, якія складаліся з 160-170 кавалкаў (для зручнасці торт загадзя складзены з парцыённых кавалачкаў). На дзень нараджэння «Віцьбы» тут з'явіўся торт, які адзін заняў усю паверхню стала. Заказвалі на камбінаце торт і да 50-годдзя Алега Газманава. Сёння ўжо адпрацаваны варыянт торта ў выглядзе разгорнутай кнігі, на «старонках» якой кандытары змогуць размясціць самыя розныя пажаданні, малюнкі, лагатыпы прадпрыемстваў.

Перавага такой прадукцыі ў параўнанні з бісквітнай — вафельныя тарты могуць доўгі час захоўвацца без халадзільніка.

«Віцьба» правядзіць шмат разнастайных акцый, дэгустацый, адсочвае патрэбы рынку і пастаянна шукае новыя падыходы да вытворчасці хрусткай прадукцыі. Часам ідэі прадпрыемству падказваюць... дзеці. Напрыклад, пірацік з пісталетам на ўпакоўцы **«Трубачкіна» (вафельныя трубачкі)** выбраны хлопчыкамі і дзяўчынкамі.

Школьнікам ён спадабаўся больш за іншыя прапанаваныя дызайнерамі персанажы.

СЮРПРЫЗЫ ДЛЯ МАЛЫХ І ДАРОСЛЫХ

Дарэчы, для дзятвы «Віцьба» падрыхтавала прыемны сюрпрыз.

Вы ведаеце, колькі важыць жырафа? Неўзабаве пра гэта можна будзе даведацца — за... сняданкам. Так, усім ужо палюбіліся **сухія сняданкі: шматкі, калечкі, шарыкі, зорачкі.** Але пакуль такая прадукцыя проста ў асноўным і ёсць на рынку. Ці будзе яна ў Беларусі? Ці не ператворыцца ў чарговую экзотыку, якой у нас ужо шмат? Ці не будзе яна, як і многія іншыя прадукты, якія ў нас з'явіліся, проста «адбіваць» хлеб у традыцыйных прадуктаў? Ці не будзе яна, як і многія іншыя прадукты, якія ў нас з'явіліся, проста «адбіваць» хлеб у традыцыйных прадуктаў?

Аматары чыпсаў, увага! «Віцьба» запускае ў вытворчасць абсалютна новы прадукт **«Салькоў»**, які ствараецца на аснове натуральнага кукурузнага шарыка з адпаведнымі чыпсавымі смакамі (смак халадца з хрэнам і цыбулі са смятанай). Кукурузныя шарыкі нічым не саступаюць чыпсам, наадварот яны маюць пераважны плюс — у іх аснове ляжыць натуральны, здаровы прадукт без усялякіх дабавак. Хочаце прыемна ўразіць сваіх знаёмых? Захапіце ў кампанію пакецік «Салькова». Нават тыя, хто думаў, што пра чыпсы і падобныя вырабы ведаюць усё, будуць прыемна ўражаныя новай прадукцыяй. Аказваецца, не толькі з бульбы, але і з кукурузы атрымліваецца прадукт, якім так прыемна хрумкаць. Здавалася б, знаёмыя смакі, але зусім іншая падача, і абсалютна новыя эмоцыі! Калі першая партыя «Салькова» патрапіла на прылаўкі, пакупнікі ўмомант яе размялі, а гандаль просіць яшчэ і яшчэ такой прадукцыі. І прадпрыемства ідзе яму насустрач. Так што да смачнай сустрэчы з «Сальковым»!

Маркетолаг Алена КРАПІВЕНЦАВА з сімваламі дзіцячых салодкіх пачастункаў «Віцьбы».

Як бачыце, з «Віцьбай» ужо можна бавіць час і дома, і ў школе, і ў студэнцкай тусоўцы, і на дачы (улетку павялічваецца попыт на сухія сняданкі, якія дазваляюць зэканоміць час на гатаванні). Прадукцыю камбіната можна спажываць і з гарбатай, і з кавай, і з малаком, і ўжо нават з півам («Салькоў») ці каньяком («Вівайлі эліт»).

Начальнік вытворчасці Кацярына КАВАЛЕНКА і начальнік вафельнага цэха Таццяна ФІЛОНЕНКА.

ШТО ДАЛЕЙ?

На сёння «Віцьба» — буйнейшы ў Беларусі камбінат па вытворчасці падушачак, і да апошняга часу такога прадукту рынку было недастаткова. Але 19 лістапада кандытарскі камбінат «Віцьба» падпісаў з англічанамі акт прыёмкі новага абсталявання. З гэтага часу пачала дзейнічаць мадэрнізаваная лінія, і вытворчасць падушачак павялічылася на 50 працэнтаў! Пакуль на «Віцьбе» працуюць на класічных рэцэптурах, але новы магутны сучасны экструдар дазволіць выпускаць і змененыя падушачкі (з больш далікатным, паветраным валакністым корпусам). Ёсць задумы і па новых натуральных начынках).

Вядуцца далей пошукі для новых трубачак «Вівайлі эліт», батончыкаў «Vitba.by», новыя смакі з'явяцца і ў «Салькова», плануецца паспрабаваць выпускаць несалодкую прадукцыю, у аснове якой будзе такая сыравіна, як жыта.

Нягледзячы на тое, што прадукцыя «Віцьбы» ніколі не залежваецца на полках і што на асобныя вырабы попыт перавышае прапанову, кандытарскі камбінат пастаянна працуе над асартыментам. Амаль штомесяц на рынак трапляюць новыя прадукты, кожны з якіх вельмі хутка заваёўвае свайго спажыўца, прычым не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі: у Расіі, Латвіі, Казахстане, Украіне, Малдове, Германіі. Прадукцыя камбіната пастаянна ўдастойваецца высокіх узнагарод і перамагае ў міжнародных конкурсах, напрыклад, у такіх, як «Прадукт года», «Выбар года», «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай Федэрацыі», «Наша марка» і іншых. Калі «Віцьба» прэзентуецца на замежных выставах, падчас якіх арганізуецца продаж прадукцыі, дык за паўгадзіны ўсё раскупляецца.

Аператар упаковачнай машыны Анатоль КАСТЭНКА.

На лініі па вырабе вафельных батончыкаў з пасыпкай вырабляюцца і класічныя батончыкі «Віцьба». Аператар Марыя КАРОТЧАНКА кантралюе якасць прадукцыі.

Мы паспрабавалі высветліць у супрацоўнікаў «Віцьбы», якія з прысмакаў камбіната яны б раілі пакласці пад навагоднюю ёлку, і нам называлі самыя розныя прадукты: ад класічнай «Віцьбы» да супернавінкі «Vitba.by» . А выбіраць тут сапраўды ёсць з чаго — зараз

Прадукцыя «Віцьбы» заслужыла давер: прадпрыемства супрацоўнічае з камбінатамі школьнага харчавання. Сярод прадукцыі, якую заказваюць школы, дробная фасоўка (на 50, 75 грамаў) і недарагія, але якасныя **батончыкі і вафлі «Віцьба», «Віта», «Вітоша», «Сёмка Халвіч»**. Прадукцыю «Віцьбы» цяжка не палюбіць. Дзецям падабаюцца мілыя, добрыя мульцяшныя персанажы на ўпакоўцы: дракоша Вітоша і дзяўчынка-весялінка Віта, хутка палюбілася і ваверчаня Сёмка. Дарэчы, ужо з'явіліся ў продажы **новыя вафельныя батончыкі і вафлі «Сёмкі Халвіча» з арахісавай, а таксама з арахісавай і кунжутнай халвой.** Вы яшчэ не каштавалі? Дарэмна, бо спалучэнне двух любімых прысмакаў — халвы і вафлі — не толькі прыносіць двайное задавальненне, а стварае вельмі арыгінальны смак.

Ведаеце, што ў Беларусі ёсць свой «Сникерс»? Ён называецца «Віцьба» і ўжо ўпадабаны многімі. Ён не горшы за замежныя аналагі, а ў чымсьці нават і лепшы. Ён ужо ёсць у кожнага, хто любіць смачна паесці. Ён ужо ёсць у кожнага, хто любіць смачна паесці. Ён ужо ёсць у кожнага, хто любіць смачна паесці.

Вырабы камбіната выстройваюцца вялікія чэргі.

У Расіі «на ўра» ідуць вафельныя рулецікі, якія могуць быць цалкам ці часткова глазураваныя. Сярод навінак — **вафельныя рулецікі «Віцьба» лімонныя і міндальныя**.

Хутка заваявалі пакупніка хрусткія, далікатныя **вафельныя трубачкі «Вівайлі» (са смакам капучына, пламбіра, з шакаладам, з арахісам)**. Начынка тут наносіцца па ўнутранай паверхні трубачкі. Аналагаў такой прадукцыі няма. Іншыя кандытарскія прадпрыемствы пакуль не рашаюцца ўзяцца за такі складаны, далікатны прадукт, а «Віцьба» вырабляе і паспяхова прадае — самыя вялікія адгрузкі па «Вівайлі» зараз у Малдове, а таксама ў Прыднястроўі і Казахстане; напарадзе заваяванне еўрапейскага спажыўца — першая партыя накіраваная ў Германію. Дарэчы, сёння камбінат прапануе чарговую **навінку — вафельныя трубачкі «Вівайлі эліт кава і каньяк ў малочнай глазуры»** (начынка робіцца з натуральных кавы і каньяку). Апошнія, між іншым, — выдатны прэзент для любімых: вафельныя трубачкі, спакаваныя па пяць штук у прэзентабельную кардонку, у 2 разы таннейшыя за шакаладку. Дарэчы, з'явілася такая фасоўка дзякуючы... занадта пільнай увазе пакупнікоў да стыльнай хрусткай навінкі, бо гэтыя крохкія вафельныя трубачкі патрабуюць далікатнага абыходжання.

Прадукцыя «Віцьбы» не толькі смачная, але і натуральная. Тут стараюцца выкарыстоўваць натуральныя араматызатары альбо экстракты. Кантроль за якасцю ажыццяўляецца на ўсіх стадыях вытворчасці, пачынаючы ад прыняцця сыравіны, заканчваючы гатовай прадукцыяй. Нездарма дэвіз фабрыкі — «Лідарства і давер праз якасць!»

Ёсць у «Віцьбы» прадукцыя, у якую спецыяльна дадаюцца карысныя рэчывы, напрыклад, тут выпускаюцца шматкі з вітамінамі, фоліевай кіслатой, робяцца вітамінізаваныя падушачкі. Людзі, якія клапоцяцца пра здаровы лад жыцця, ужо звярнулі ўвагу на такія карысныя прадукты, што выпускаюцца пад **гандлёвай маркай «Забота»**. «Віцьба» прапануе сёння і **новы дыябетычны прадукт — трубачкі, у дадатак да ранейшых пячэння і вафель**. Дарэчы, у Малдове дыябетычная прадукцыя «Віцьбы» прадаецца праз аптэчную сетку.

У «Віцьбы» ёсць і **філіял у Полацку**, дзе выпускаецца **прадукцыя пад гандлёвай маркай «Палачанка»**. Там вырабляецца жывы квас, нарыхтоўваецца бярозавы сок, вырабляюцца соусы, кетчупы, пернікі і аўсянае печыва і, вядома, вафлі. Асаблівасць «палачанскіх» вафель — яны робяцца па старой рэцэптуры і ў іх джэмавая начынка. Вядома ж, ёсць ідэі і па гэтай прадукцыі — так, плануецца вафелькі глазураваць, наразаць на патрэбныя памеры, рабіць з пасыпкамі... Безумоўна, тут таксама не абыдзецца без мадэрнізацыі вытворчасці.

Хутка пачнуцца святы, і дырэктар кандытарскага камбіната «Віцьба» Уладзімір Сазон спяшаецца павіншаваць партнёраў і кліентаў: ***«Паважаныя сябры! З надыходзячым Новым годам і Калядамі! Няхай 2011 год прыносіць у кожны дом радасць, шчасце, цеплыню, дастатак і прыемныя сюрпрызы».***

Алена ДАЎЖАНОК,
Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.
Аляксей СУПРУН (фота).

УНН 300187443

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

АДКАЗЫ НА СКАНВОРД

Па гарызанталі: Лявонаў. Кручкова. Ворона. Талаш. Гумно. Чын. Мурыца. Янус. Лагатын. Кіт. Астра. Аўгур. Тагака. Рай. Кнаната. Кашка. Лік. Хам. Поней. Носік. Ром. Стык. Карыта. Адрас. Малі. Абат. Пародына. Акопка. **Па вертыкалі:** Эскулап. Конаваў. Гагат. Арахіс. Матрыка. Акт. Аліва. Адам. Помпа. Кідаюся. Урна. Рада. Лафет. Скала. Рыжа. Сіта. Шчака. Лік. Жабо. Пята. Шпагаты. Гуру. Пінот. Гак. Масляна.

ФЭН-ШУЙ ГАРАСКОП

Нядзеля, 26 снежня

Пажадана не напіраць на пытанні, дзе карысці ад баявога настрою столькі ж, колькі ад газонакасілкі падчас збору ўраджаю збожжавых, а вось нядбайнасць або імпульсіўнасць могуць прынесці адчувальныя страты, у першую чаргу матэрыяльныя. Акрамя таго, сённяшнім словам і інфармацыі лепш давяраць толькі пасля дадатковай праверкі.

Панядзелак, 27 снежня

Спрыяльны час для бізнэсу, менеджменту, грамадскіх мерапрыемстваў, актыўнага акунання ў любую дзейнасць. Паспрабуйце правесці дзень максімальна актыўна і энергічна. Канталюйце расходы, фінансавыя пытанні і забяспечце захаванасць сваім зберажэнням.

Аўторак, 28 снежня

Спакой, неканфліктнасць і нацэленасць на матэрыяльны вынік дадуць адчуванне ўпэўненасці і пры гэтым дапамогуць пазбегнуць сутыкненняў з навакольнымі з нагоды і без яе. Праўда, пры гэтым верагоднасць каго-небудзь у чым-небудзь пераканаць або ссунуць з наседжаных пазіцый выглядае даволі сціпла.

Серада, 29 снежня

Максімум дынамікі, мінімум спакою. Выдатныя ўмовы як для атрымання пазітыўных эмоцый, так і для руху да сваіх практычных мэтаў. Прадукцыйнай працы і пошуку агульнай мовы з навакольнымі не будуць перашкаджаць ніякія эмацыйныя праблемы.

Чацвер, 30 снежня

Дасягненне нават самых сціплых тактычных мэтаў сёння будзе спалучана з некаторымі цяжкасцямі. На важныя і складаныя справы, асабліва тыя, што звязаныя з грашыма і патрабуюць ўзважанасці і цвярозага разліку, трэба рашацца толькі ў крайнім выпадку. Калі вас цікавіць вынік, планку разважнасці і сабранасці ніжэй вызначанага ўзроўню лепш не апускаць.

Пятніца, 31 снежня

Дзень прыдатны для актыўнага і пасіўнага адпачынку, які дае як мага больш і патрабуе для гэтага як мага менш. Верагоднасць рэалізацыі сур'ёзных і амбіцыйных планаў, мякка кажучы, невысокая, а вось «паляцець» можна проста. Сёння лепш крыху знізіць актыўнасць і не перанапружвацца (раптам хто збіраўся). Возьмем паўзу і пераседзім!

Субота, 1 студзеня

Убачым прыклад, якім павінен быць сапраўдны выхадны дзень, без перакосаў на месцах, недарэчнага напружання і ўсіх астатніх атрыбутаў «нялётнага надвор'я». Ён прынясе шмат кантактаў і забяспечыць лёгкі эмацыйны фон. Выдатны час для адпачынку і «падзарадкі батарэек», хоць пры жаданні або неабходнасці можна плённа папрацаваць галавой.

Усміхнемся!

Карпаратыўная камп'ютарная сетка.

— Да нас на сайт за ўчорашні дзень зайшлі 54 чалавекі.

— У нас на фірме 55 — якая сволач не зайшла?

☺

Спадары студэнты! Просьба ставіць свае джынсы шчыльней, а то выкладчыкам няма дзе ставіць свае веласіпеды!

☺

За крадзеж з супермаркета жанчыну прыцягнулі да суда. Суддзя:

— Што менавіта вы ўкралі?

— Маленькі слоік з кансерваванымі персікамі. У ім было ўсяго шэсць персікаў.

— Шэсць персікаў... Суд прыгаворвае вас да шасці сутак турэмнага зняволення, па адным дні за кожны персік.

Жанчына ледзь не губляе прытомнасць, а яе муж ускоквае з месца і крычыць:

— Спадар суддзя! А яшчэ яна выкрала слоік зялёнага гарошку!

☺

Жанчына сама не ведае, чаго хоча, пакуль не ўбачыць гэта ў іншай жанчыны.

☺

— Сэкс па тэлефоне. Я выканаю ўсе вашы жаданні...

— Люся, гэта я. Хлеба дадому купі.

☺

Часам будзільнік дапамагае прачнуцца, але часцей за ўсё ён замінае спаць.

☺

— Мілы, я хачу футра!

— Еш вінегрэт...

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.27	15.51	7.24
Віцебск —	8.24	15.33	7.09
Магілёў —	8.17	15.41	7.24
Гомель —	8.05	15.46	7.41
Гродна —	8.41	16.07	7.26
Брэст —	8.33	16.16	7.43

Месяц

Поўня 21 снежня.
Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Данілы, Івана, Лукі.*

К. *Евы, Ірмы, Эвеліны, Адама, Рыгора.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра



Дзве даты

24 снежня

1904 год — нарадзіўся (вёска Навасёлкі Петрыкаўскага раёна) Алесь Дудар (Аляксандр Дайлідовіч), выдатны беларускі паэт, перакладчык, ён жа — літаратурны крытык Тодар Глыбоцкі. Адзін з кіраўнікоў літаратурнага аб'яднання «Маладняк». Дэбютаваў вершам у 1921 годзе (газета «Савецкая Беларусь»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Беларусь бунтарская», «Сонечнымі сцежкамі», «І залацісцей, і сталёвей», «Вежа», паэмы «Шанхайскі шоўк», «Слуцак», зборніка апавяданняў «Марсельеза». Перакладаў з рускай, нямецкай, французскай моў. За верш «Пасеклі наш край папалам…» у сакавіку 1929-га арыштаваны органамі ДПУ, высланы на тры гады ў Смаленск. Зноў арыштаваны ў ліпені 1930 года па справе так званага «Саюза вызвалення Беларусі». Трэці раз арыштаваны ў кастрычніку 1936 года. Асуджаны пазасудовым органам НКВД 28 кастрычніка 1937 года як «член антысавецкай аб'яднанай шпіёнска-тэрарыстычнай нацыянал-фашысцкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. У ноч на 29 кастрычніка разам з 22 іншымі вядомымі беларускімі літаратарамі расстраляны ў Мінску ці ў Курапатах. Рэабілітаваны Ваенная калегіяй Вярхоўнага суда СССР у 1957 годзе.

1798 год — нарадзіўся Адам Міцкевіч беларуска-польскі паэт, грамадскі дзеяч, публіцыст. Выхадзец з роду старажытнай беларускай шляхты. Многія яго творы тэматычна звязаны з Беларуссю. На беларускіх народных паданнях заснаваныя балады «Рамантыка», «Рыбка». На сюжэты з гісторыі ВКЛ напісаны паэмы «Гражына» і «Конрад Валенрод». У самым значным творы паэта — паэме «Пан Тадэвуш» — праходзіць шэраг вобразаў беларускай шляхты, яркія пейзажы Навагрудчыны, Налібоцкай пушчы. Памёр у 1855 годзе.

Цытата дня

«Самая лепшая частка жыцця сапраўднага чалавека — гэта яго невялікія, безыменныя і ўсімі забытыя ўчынкі, выкліканыя любоўю і дабрынёй».

Уільям Уордсворт (1770—1850), англійскі паэт-рамантык.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

СЯРЭДНІЯ ПРАБЛЕМЫ

Да іх адносяцца тыя, у якіх суадносіны сіл у выходных пазіцыях ад 9х10, 10х9 да 12х12. Чэмпіён свету па шашачнай кампазіцыі, міжнародны гросмайстар Уладзімір Матус (Масква) працягвае свой **аўтарскі конкурс-11** рашэнняў такіх канструкцый на 100-клетачнай дошцы чарговым заданнем:

№ 14. **Белыя:** 6, 11, 17, 21, 22, 24, 25, 35, 44, 46, 48 (11). **Чорныя:** 1, 8, 9, 12, 15, 23, 28, 31, 33, 38, 40 (11). Выйгрыш.

ЭЦЮД НА РАЗВІТАННЕ

Нацыянальны майстар кампазіцыі Пётр Шклудаў (Наваполацк) свой аўтарскі конкурс-12 завяршае эцюдам:



№ 24. **Белыя:** дамкі e1, h6 (2). **Чорныя:** a3, b4, c3, c7, e7 (5). Перамога белых.

ПРАЗ ПАРАЖЭННІ — ДА ПЕРАМОГІ

Падведзены вынікі 44-га першынства Беларусі па завочных шашках-64. У яго рамках адбыліся спаборніцтвы ў вышэйшых лігах (БВЛ), першых (БПЛ) і турнір кандыдатаў у майстры спорту (БКМ). Перамаглі ў іх: Л. Козел, К. Барэль і П. Шклудаў (БВЛ, класічная версія), І. Працук, П. Шклудаў і І. Гайдукевіч (БВЛ з лёсаваннем дэбютаў), П. Алехна, М. Зубцоў і М. Гельман (БПЛ, класічная версія), М. Гельман, Л. Жыхар і П. Алехна (БПЛ з лёсаваннем дэбютаў), А. Пярхальскі, У. Таратушкін і М. Гофман (БКМ).

Нам прыемна адзначыць паспяховыя выступленні звяздоўскіх канкурсантаў і аўтараў Канстанціна Барэля (Свіслач), Пятра Шклудава (Наваполацк), Івана Працука (Паставы), Міхаіла Гельмана (Мінск), Леаніда Жыхара (Мядзел), Анатоля Пярхальскага (Глыбокае) і Уладзіміра Таратушкіна (Мінск). Сярод іх А. Пярхальскі выдаў зборнік сваіх партый «Праз паражэнні — да перамогі» (Віцебск, 2010). У ім ён піша: «Чытаючы газету «Звязда», я заўсёды звяртаў увагу на рубрыку «Шашкі». І ўрэшце зрабіў выбар — трэба гуляць у іх. Такім чынам, распачаў прынаднае і змястоўнае жыццё ў вольны час». Наступныя эпізоды з яго партый разгледзьце ў якасці **бліца-58/3**:

1. **Белыя** (У. Бандарык): e1, f2, g1, h2, h6, дамка b8 (6). **Чорныя** (А. Пярхальскі): a7, e7, f6, f8, h4, дамка a1 (6). Перад гэтым белыя зрабілі неасцярожны ход 1. fb8 і прайгралі. Чаму?

2. **Белыя** (А. Пярхальскі): b4, d4, e3, h6 (4). **Чорныя** (М. Гофман): a7, d6, f6 (3). Белыя згулялі 1. ef4=. Але ў іх быў шанц нанесці чорным паражэнне. Выкарыстайце яго.

* * *

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі»**.

ПЕРШАЯ ЛІГА

У яе межах прайшоў чэмпіянат рэспублікі па шашках-100. У ім была дадзена магчымасць паказаць сваё майстэрства ў асноўным выхаванцам Нацыянальнага цэнтра шахмат і шашак і СДЮШАР-11 г. Мінска. Перамогу святкавалі: у мужчынскім турніры — сталічныя кандыдат у майстры спорту Уладзіслаў Валюк, майстры Уладзіслаў Сплендэр, Вольга Федаровіч, першаразраднік Ягор Ханукаеў і кандыдат у майстры Аляксей Куніца, у жаночым — кандыдаты ў майстры Вера Хвашчынская (Бабруйск), мінчанкі Ганна Вузлік, Святлана Гарбачэнка, Маргарыта Храмцова і майстар Анастасія Барышава. Усе яны атрымалі пуцёўкі ў вышэйшую лігу, дзе іх чакаюць больш сур'ёзныя выпрабаванні.

СКЛАДАЛЬНІК З ПІНСКА

Ім з'яўляецца Мікалай Крышталь — настаўнік геаграфіі па прафесіі, а па шашачнай кампазіцыі — кандыдат у майстры спорту. Для **бліца-59/1** даслаў сваю новую праблему:

Белыя: 15, 19, 20, 23, 24, 28, 29, 32, 33, 45 (10). **Чорныя:** 9, 11, 17, 21, 30, 31, 34, 35, 37, 40, 41 (11). Пашукайце камбінацыю за белых.

ПАВАЖАНЫЯ ВЕТЭРАНЫ педагагічнай працы Іўеўскага раёна. Віншую вас з Новым годам і святам Нараджэння Хрыстова. Моцнага здароўя, дабрабыту, ласкавых адносін ад блізкіх.

Іван Станіслававіч ЖЫДЗЕЛЬ *з Іўя.*

А КІШЭНЯ ПУСТАЯ

Намеснік дырэктара ААТ, жыхар пас. Ватуцінкі, што ў Маскоўскай вобласці, прыехаў у Баранавічы не з пустымі кішэнямі. Чалавек зняў кватэру па вул. Камуністычнай, а раніцой не знайшоў у кішэні штаноў 12 тыс. еўра.

Міліцыя пачала шукаць злодзея і знайшла яго ў інтэрнаце па вул. Леніна. 21-гадовы беспрацоўны жыхар Слоніма быў раніцой у кватэры расіяніна і выкраў грошы. Злодзея адправілі ў ізалятар.

«ШАТУН» ПРАГАЛАДАЎСЯ

Жыхарка в. Лукі (Столінскі раён) заявіла ў міліцыю, што нехта з яе склепа выкраў усе кансерваваныя прадукты.

Злодзеем аказаўся яе былы муж, які не працуе, а бадзяецца па свеце. «Былога» шукаюць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

СЛУЖБА «190» ДАПАМОЖА ТУРЫСТАМ

СЭРВІСНАЯ інфармацыйная служба філіяла РУП «Белтэлеком» «Мінская гарадская тэлефонная сетка» пашырае базу сваіх звестак.

З 23 снежня па тэлефоне ГорІнфаСэрвіса «190» тэлефонным абанентам будзе давацца інфармацыя аб краінах, для наведвання якіх грамадзянам Рэспублікі Беларусь не патрабуецца візавае суправаджэнне, іх сталіцах, дзяржаўнай мове і дзейных грашовых знаках, а таксама пералік краін, дзе маюцца дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы Рэспублікі Беларусь. Гэтая інфармацыя будзе карыснай для турыстаў і вандроўнікаў, а таксама для ўсіх беларусаў, якія вырашаць правесці навагоднія святы ў замежжы. Таксама па тэлефоне «190» можна даведацца пра адрасы і тэлефоны турфірмаў, пасольстваў і консульстваў, пашпартна-візавыя службы, курс валют у розных банках, адрасы банкаматаў і інфакіёскаў. Кошт паслугі складае 473 рублі за адну хвіліну. ГорІнфаСэрвіс працуе кругласутачна без выхадных і святочных дзён.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ОЙ, ЗІМА

Бяседныя песні

«Бяседа» — ансамбль народнай музыкі Белтэлерадыёкампаніі — лірычнай і абрадавай, бяседнай і вітальна-віншавальнай песняй звонкагалоса выяўляе характар роднага краю на памежжы тысячагоддзяў. Таленавіты калектыў увесь час у пошуку, нястомна ўзнаўляе песенныя скарбы беларусаў. Ён разнастайна перадае іх магутны стваральны дух, які ўвасоблены ў спеўным слове, меладычным гуку.

Дасканалае выканальніцкае майстэрства артыстаў «Бяседы» спрыяе пашырэнню лепшых вакальных і музычных твораў народнага мастацтва, далучэнню моладзі да іх. Многія фальклорныя песні — «Што-та за хлопец», «А ў лузе каліна», «Ой, я жыта ды не сеяла», «Ой, ляцелі гусі з броду», «Ой, хацела мяне маці» і шмат іншых — набылі адметную інтанацыйна-выразную, эмацыйна-акрэсленую афарбоўку і прывабнасць. І вось ужо 20 гадоў «Бяседа» творча развівае спеўнае мастацтва роднай зямлі, годна дэманструе яго на канцэртах і фестывалях Еўропы і Азіі.

Песня «Ой, зіма» гучыць мажорна, па-бяседнаму запамінальна (у выкананні ансамбля замест апошняй страфы паўтараецца першая, што ў пераважнай большасці робіцца пры спяванні фальклорных твораў). Як зіма выпрабоўвае люд, гартуе яго дух і волю, так і адносіны сталеюць у выпрабаваннях, набіраюцца моцы, трываласці і веры.

Ой, зіма

Беларуская народная песня

— Ой, зіма, зіма, ты марозная,
*Нашто ж ты каня, эй, замарозіла?**

— Вы ж не біцеся, не сварыцеся,
За мае кудры, эй, памірыцеся.

Каня белага, сівагрывага,
Хлопца й малайца, эй,
чарнабрывага.

А мае кудры ўюцца не для вас,
Ёсць ў мяне дзяўчына —
лепшая ад вас.

А ў таго хлопца кучары ўюцца,
За яго кудры, эй, дзяўчаты б'юцца.

Яна мяне ў бой выправажала,
Яна мае кудры пазавівала.

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.

Рэдакцыя газеты «Звязда» і яе чытачы шчыра віншуюць ансамбль народнай музыкі «Свята» з юбілеем.



* Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

СВЯТЫНЯ ХАТЫ — АБРАЗ

Выявы Ісуса Хрыста, Дзевы Марыі, хрысціянскіх святых, адлюстраванні біблейскіх падзей, нанесеныя на дошку або выразаныя на ёй, з прыняццем хрысціянства сталі неад'емным атрыбутам сялянскага жытла. Абраз заняў галоўнае месца на покуці, ператварыўшы яго ў мікрамадэль царкоўнага алтара. Ікона стала знакам яднання сям'і з Богам.

● Лічылася, што абраз здольны асвячаць сваёй прысутнасцю прастору хаты. Таму падчас улазін яго ўносілі ў хату ў ліку іншых сакральных прадметаў першым.

● Да абразоў заўсёды ставіліся паважліва. Нярэдка ў сям'і з пакалення ў пакаленне перадаваўся сямейны ці радавы абраз. Яго лічылі заступнікам хаты. У народзе казалі, што душы памерлых бацькоў «знаходзяцца» за бажніцай. Так з'явіўся звычай у дні памінання продкаў ставіць на покуць першы блін, радзей — акраец толькі што выпечанага хлеба, лыжку куцці.

● Лічылася, што з моманту смерці і да пахавання душа памерлага «сядзіць у хаце за абразамі». Таму абразы ніколі не ставілі ўшчыльную адзін да аднаго ці да сцяны, «каб душам бацькоў было дзе пасядзець».

● У хаце нярэдка знаходзіліся абразы святых заступнікаў рамяствуў ці жывёлагадоўлі. Так, пчаляры ставілі на вуллі выявы святых Зосімы і Савація. У хляве нярэдка можна было сустрэць выяву з малюнкам святога Уласія. На стайню прыносілі выявы святога Мікалая ці святых Флора і Лаўра.

● Вялікай пашанай у народзе карысталіся «яўленыя» абразы. Цудоўным лічыўся абраз, знойдзены на дрэве, ля крыніцы, на гары. Ікона, якая прыплыла па вадзе, заўсёды станавілася знакавай у гэтай мясцовасці. З'яўленне абраза заўсёды суправаджалася пабудовай у гэтым месцы храма або капліцы. Нярэдка на месцы з'яўлення абраза пачынала біць крыніца (або там капалі студню). Вада ў такой крыніцы лічылася гаючай.

● Калі абраз па нейкіх прычынах выносілі з храма, то часцей за ўсё гэта з'яўлялася прадвеснікам яго разбурэння і спусташэння абшчыны. Калі хатні абраз па якіх-небудзь прычынах назаўжды выносілі з хаты, гэта прадвяшчала выміранне ўсяго роду.

● У дачыненні да абраза здзяйснялі спецыяльныя рытуальныя дзеянні, напоўненыя высокай ступенню сакральнасці. Перад ім запальвалі свечкі, чыталі малітвы, прамаўлялі клятвы. Хатняй ікона бласлаўлялі маладых у вясельную дарогу, невялікі абразок клалі ў труну разам з памерлым.

● Ваду, якой абмывалі абраз перад святамі, вылівалі пад покуць.

● Каля іконы забаранялася сварыцца, гаварыць брыдкія словы.

● Абраз ніколі не змяшчалі ў «нячыстых» месцах: у лазні, на гарышчы.

● Струхлелыя абразы забаранялася спальваць ці проста выкідваць. Такія абразы закопвалі на могілках ці пускалі па вадзе.

● Крадзеж, спальванне, апаганьванне абраза караліся невылечнымі хваробамі.

● Падзенне абраза са сцяны, з'яўленне на ім расколіны прадказвалі смерць аднаго з дамачадцаў. Калі абраз раптам зваліўся, трэба было тройчы перахрысціцца і сказаць: «Божа, адвядзі бяду».

● Плюнуць на абраз — страшны грэх, за які будзе «разлічвацца» не адно пакаленне.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Считать недействительными страховые полисы ЗАО «СК «Белросстрах»:
- добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу **(2РН, 2РП) серия БИ №№ 0770649-0770650, 0774080, 0785819, 0787794, 0787795, 0908463, 0908466, 0887191, 0887199;**
- квитанции ІСУ **серия КС №№ 0275917—0275922, 0276405, 0287378, 0292479**;
- добровольное страхование наземных транспортных средств (авто-каско) **2РН, 2РП, серия АК №№ 0016828—0016830**. *УНП 100782388*

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА БЕЗ УСЛОВИЙ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ОБРАЩЕННОГО В ДОХОД ГОСУДАРСТВА

Адрес объектов и их наименование	- главный корпус здания для мастерской, инв. № 1002, площадь 2121,3 м² год постройки – 1980; - здание мехмастерских, инв. № 1006, площадь 689,3 м², год постройки – 1986; - профилакторий для ремонта автокранов, инв. № 1005, площадью 98,6 м²; - производственный пункт заправочной станции, инв. № 2059, площадь 5 м², год постройки – 1981; - здание материального склада, инв. № 1001, площадь 152,2 м², год постройки – 1972. Объекты расположены по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Рабочая, 1. **Имущество продается одним лотом.** **Начальная цена: 1 080 035 370 белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 5 % от предыдущей цены
Порядок оплаты	Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 2 месяцев и 25 дней на р/с СИКУП «УКС-Сервис»
Сумма задатка	10 % от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-Сервис»
Продавец	Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Молодечненском райисполкоме
Организатор аукциона	СИКУП «УКС-Сервис»
Документы, представляемые для участия в аукционе	Заверенная банком копия платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копия учредительных документов и свидетельства о регистрации, заверенные нотариально, доверенность, выданная представителю юридического лица; физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, справка ГНИ об отсутствии задолженности по подоходному налогу
Конечный срок и адрес приема заявок	10.01.2011 г., до 16.00, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис», тел.: (8 0176) 73 00 13, (факс) 75 19 20, 8 044 710 74 60
Дата, время и место проведения аукциона	11.01.2011 г. в 15.00, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1. СИКУП «УКС-Сервис»

04 января 2011 г. в 12.00 состоится
внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гранд Фэшен Хаус».
Повестка дня:
1. О совершении сделок Обществом.
2. О переизбрании членов Ревизионной комиссии.
3. О приобретении акций на баланс Общества.
Собрание будет проходить по адресу: г. Брест, ул. Куйбышева, 13.
Начало регистрации участников собрания: 11.00.
УНП 290671335

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 6273. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Чемпионат призов»

NIVEA FOR MEN
ОФИЦИАЛЬНЫЙ ПАРТНЕР

IIHF 2011 WORLD CHAMPIONSHIP SLOVAKIA
Bratislava
Košice

1. Настоящая рекламная игра называется «Чемпионат призов» (далее по тексту – «Игра»), проводится в соответствии с условиями настоящих правил рекламной игры (далее по тексту – «Правила») с соблюдением требований законодательства Республики Беларусь без взимания с участников Игры дополнительной платы.
Игра имеет целью стимулирование продаж в Республике Беларусь средств по уходу за кожей лица для мужчин NIVEA FOR MEN.

2. Организатором Игры является Издательско-производственное частное унитарное предприятие «Проспектпресс», Республика Беларусь, УНП 101520868 (далее по тексту – «Организатор»), зарегистрированное Решением Мингорисполкома № 769 от 6 июля 2000 года. Местонахождение Организатора – Республика Беларусь, 220030, г. Минск, ул. Интернациональная, 16-302.

3. Игра проводится на территории Республики Беларусь.
Игра проводится в период (далее по тексту – «Срок проведения рекламной игры») **с 01 января по 30 апреля 2011 года.**

4. Призовой фонд Игры
Первые 10 000 (десять тысяч) участников Игры, приславших анкеты в соответствии с настоящими Правилами, получают:

Гарантированный приз:

№	Наименование	Единица измерения	Количество	Цена за 1 ед. с НДС, рублей	Всего с НДС, рублей
1.	Полотенце махровое 67х40 см с логотипом «Nivea for Men» (далее по тексту – «Полотенце»)	шт.	10 000	11 040	110 400 000

В рамках Игры разыгрываются:

Суперприз:

№	Наименование	Единица измерения	Количество	Цена за 1 ед. с НДС, рублей	Всего с НДС, рублей
1.	Часы наручные TISSOT (далее по тексту – «Часы»)	шт.	15	1 272 000	19 080 000
2.	Денежный приз	денежных призов	15	140 000	2 100 000
	Итого				21 180 000

Главный приз:

№	Наименование	Единица измерения	Количество	Цена за 1 ед. с НДС, рублей	Всего с НДС, рублей
1.	Поездка на финал Чемпионата мира по хоккею 2011 на двоих человек в г. Братислава (Словакия) (медицинские страховки, визы, авиабилеты Минск-Прага-Братислава-Прага-Минск (экономкласс), трансфер аэропорт Братиславы-отель в Братиславе-аэропорт Братиславы, проживание в Братиславе (отель 3*, завтраки) на период не более 2 ночи/3 дня, пешеходные обзорные экскурсии по Братиславе и билеты на финальный матч Чемпионата мира по хоккею 15 мая 2011 г.) (далее по тексту – «Поездка»).	шт.	5	10 290 000	51 450 000
2.	Денежный приз	денежных призов	5	1 400 000	7 000 000
	Итого				58 450 000

Всего: 190 030 000 (Сто девяносто миллионов тридцать тысяч) белорусских рублей.

Призовой фонд игры в размере 190 030 000 (Сто девяносто миллионов тридцать тысяч) белорусских рублей формируется за счет средств заинтересованного лица – ООО «Байерсдорф» (Российская Федерация).

5. В Игре могут принять участие физические лица, проживающие на территории Республики Беларусь в период проведения Игры (далее по тексту – «Участники»), с учетом ограничений, изложенных в настоящих Правилах. В случае если в Игре принимают участие несовершеннолетние, то участие таких лиц осуществляется строго в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и настоящими Правилами.
В Игре не имеют права участвовать работники и представители Организатора Игры, работники рекламных агентств и официального дистрибьютора на территории Республики Беларусь, связанных с Организатором договорными отношениями (обслуживающих Игру), а также члены семей названных работников и представителей, работники и представители любых других юридических лиц, имеющих отношение к организации и проведению настоящей Игры, а также члены их семей. В Игре не имеют права участвовать граждане, привлеченные названными рекламными агентствами и юридическими лицами на основании гражданско-правовых договоров для обслуживания Игры в любой форме, а также члены семей таких граждан.

6. Права участников Игры
Участник Игры имеет право знакомиться с Правилами Игры, принимать участие в Игре на условиях, определенных Правилами, и получать соответствующие Призы (при соблюдении указанных ниже условий). Каждый Участник может принимать участие в Игре неограниченное количество раз при условии соблюдения настоящих Правил Игры.

7. Регламент деятельности комиссии по проведению рекламной игры
Комиссия по проведению Игры создается Организатором Игры в целях осуществления контроля за соблюдением правил проведения Игры, а также для подведения результатов розыгрыша призов и объявления их победителей. Комиссия уполномочена рассматривать жалобы и предложения со стороны участников Игры.
Комиссия осуществляет свою деятельность в период проведения рекламной игры с 01 января по 30 апреля 2011 года.
Состав комиссии по проведению Игры утверждается директором УП «Проспектпресс». Численность комиссии составляет 7 (семь) человек, из них представителей от УП «Проспектпресс» – 3 человека:
1) Жуков Роман Валерьевич, региональный менеджер, ООО «Байерсдорф» (Российская Федерация).
2) Трухнов Павел Александрович, заместитель директора по коммерческим вопросам, ИЗАО «Альфа Космо».
3) Русинова Анна Юрьевна, менеджер по маркетингу, ИЗАО «Альфа Космо».
4) Гутковский Алексей Юрьевич, директор, ИП «Адверком».
5) Прокопчик Наталья Эдуардовна, начальник отдела по работе с клиентами, УП «Проспектпресс».
6) Максимчук Юлия Владимировна, специалист по рекламе, УП «Проспектпресс».
7) Наркевичюте Надежда Викторовна, специалист по рекламе, УП «Проспектпресс».

Комиссия по проведению Игры действует в составе председателя и секретаря комиссии, ее членов. Председатель и секретарь комиссии выбираются из ее членов путем голосования.
Заседание комиссии по проведению рекламной игры правомочно при наличии большинства ее членов. Если при голосовании мнения членов комиссии разделяются поровну, мнение председателя комиссии является приоритетным.

8. Ведение протокола проведения розыгрыша призового фонда
Секретарь комиссии ведет протокол проведения розыгрыша призового фонда. В протоколе отражаются:
- время и место проведения розыгрыша призового фонда;
- сведения о составе комиссии по проведению рекламной игры;
- действия комиссии по проведению розыгрыша в том порядке, в каком они имели место;
- результаты проведения розыгрыша с указанием сведений о победителях.
Протокол подписывают все члены комиссии, присутствовавшие при проведении розыгрыша, после его окончания.

9. Наименование товаров (работ, услуг) или их групп, в целях стимулирования продаж которых проводится рекламная игра: средства по уходу за кожей лица для мужчин NIVEA FOR MEN.

а) Пены для бритья: - «Экстремальный комфорт»; - для чувствительной кожи; - увлажняющая; - для жесткой щетины; - освежающая; - «Серебряная защита».	**в) Бальзамы после бритья:** - «Экстремальный комфорт»; - для чувствительной кожи; - увлажняющий; - освежающий; - «Серебряная защита».
б) Гели для бритья: - легкое скольжение; - «Экстремальный комфорт»; - для чувствительной кожи; - увлажняющий; - освежающий; - «Серебряная защита».	**г) Лосьоны после бритья:** - для чувствительной кожи; - освежающий; - «Серебряная защита». **д) Гель после бритья:** - «Заряд свежести».

10. Механизм проведения Игры
Для участия в Игре необходимо в период с 01 января по 24 марта 2011 года:
- приобрести 2 (два) средства NIVEA FOR MEN, обозначенных промостикером, заполнить 2 (две) анкеты, находящиеся внутри упаковок с такими средствами, и отправить две заполненных анкеты по адресу: 220030, г. Минск, а/я «Чемпионат призов».
В анкете необходимо заполнить следующие графы:
- фамилия, имя, отчество;
- адрес (для отправки приза);
- контактный телефон;
- возраст;
- паспортные данные (№, кем и когда выдан).

Первые 10 000 (десять тысяч) участников, отправивших анкеты по 24.03.2011 г., получат гарантированный приз (Полотенце), при этом все участники, отправившие анкеты в указанный срок, допускаются к участию в дальнейших розыгрышах суперпризов (Часы и денежный приз) и розыгрышу главных призов (Поездка и денежный приз).
Все анкеты поступают в собственность организатора, участникам не возвращаются. Организатор оставляет за собой право использовать информацию, содержащуюся в анкете, для рекламных целей без предварительного уведомления участника.
Организатор не несёт ответственность за работу почтовых служб и за задержку отсылки (доставки) писем с анкетами по вине третьих лиц.
Письма, содержащие поддельные анкеты, к участию в игре не допускаются. Идентификация анкет осуществляется работниками Организатора игры. Организатор имеет право проводить дополнительные экспертизы анкет, в том числе с привлечением экспертов.

11. Розыгрыш призового фонда, определение победителей Игры
Гарантированные призы (Полотенце) высылаются победителям путем почтовой отправки заказной бандероли с уведомлением на адрес, указанный в анкете.
Промежуточные розыгрыши суперпризов (Часы и денежный приз) состоятся по адресу: г. Минск, ул. Интернациональная, 16-302 в присутствии комиссии по проведению рекламной игры в соответствии со следующим графиком:
17 февраля 2011 г. в 15:00
10 марта 2011 г. в 15:00
31 марта 2011 г. в 15:00
Розыгрыш главных призов (Поездка и денежный приз) состоится по адресу: г. Минск, ул. Интернациональная, 16-302 в присутствии комиссии по проведению рекламной игры 31 марта 2011 г. в 15:30.
К участию в розыгрыше суперпризов и главных призов принимаются анкеты, отправленные не позднее чем за 7 дней до проведения промежуточного розыгрыша. Дата получения определяется по почтовому штемпелю отправки.
Анкеты участника, заполненные неразборчиво, содержащие исправления либо содержащие неполную информацию, для участия в розыгрыше не принимаются.
Участники игры имеют право участвовать лишь в одном из промежуточных розыгрышей суперпризов (Часы и денежный приз). Все участники промежуточных розыгрышей суперпризов (Часы и денежный приз) допускаются к участию в дальнейшем розыгрыше главных призов (Поездка и денежный приз) 31.03.2011 г.
Определение победителей игры (обладателей суперпризов «Часы и денежный приз» и главных призов «Поездка и денежный приз») будет проводиться посредством случайной выборки анкет участников игры, отправленных по почте на адрес абонентского ящика до 24 марта 2011 года включительно. Комиссия по проведению игры контролирует соответствие фактического порядка розыгрыша призового фонда порядку, установленному Правилами Игры.
Представители Организатора помещают все полученные допущенные к розыгрышу анкеты в лототрон, крутят лототрон, члены комиссии следят за правильностью и честностью розыгрыша.
Один из членов комиссии извлекает последовательно выигрышные анкеты из лототрона. После определения анкеты-победителя председатель комиссии оглашает фамилию, имя и отчество участника для внесения в протокол, после чего оставшиеся анкеты перемешиваются снова. В определенные настоящими Правилами дни промежуточных розыгрышей разыгрываются по 5 (пять) суперпризов (Часы и денежный приз), 31.03.2011 г. среди всех участников игры производится розыгрыш 5 (пяти) главных призов (Поездка и денежный приз). После проведения розыгрышей все анкеты, принявшие участие, изымаются.

12. Вручение призов победителям Игры
Победители (обладатели суперпризов «Часы и денежный приз», а также главных призов «Поездка и денежный приз») уведомляются в письменной форме не позднее 5 (пяти) дней после розыгрыша.
Вручение суперпризов (Часы и денежный приз), а также главных призов (Поездка и денежный приз) будет осуществляться 05.04.2011 г. в офисе Организатора по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Интернациональная, 16-302 при предъявлении участником паспорта.
Вручение суперпризов (Часы и денежный приз), а также главных призов (Поездка и денежный приз) несовершеннолетним в возрасте от четырнадцати до восемнадцати лет будет осуществляться с письменного согласия законных представителей – родителей, усыновителей или попечителей.
Выдача призов осуществляется в пределах заявленного призового фонда. Ответственность Организатора по выдаче призов ограничивается исключительно указанными в настоящих правилах количеством и видами призов. С момента получения приза любой участник игры несёт ответственность за уплату всех применимых налогов, установленных действующим законодательством Республики Беларусь.
Выплата денежного эквивалента стоимости вещевого приза или замена его на другой приз не допускается.

13. Организатор Игры не несет ответственности за любые риски, связанные с повреждением приза (ов) и его (их) эксплуатацией, возникшие после выдачи приза победителю.
Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках рекламной игры их имена, фамилии, фотографии, интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором. Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в Интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Все права на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

14. Порядок оповещения участников о рекламной игре
Правила проведения Игры будут опубликованы в газете «Звязда» до начала рекламной игры.
Результаты розыгрыша призового фонда Игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» не позднее 30.04.2011 г.
Дополнительно информацию об Игре можно получить по телефону «горячей линии» «Чемпионат призов» (8-029-322-42-52) в рабочие дни с 9:00 до 18:00.

15. Участие в Игре автоматически подразумевает ознакомление и согласие участников Игры следовать всем условиям настоящих Правил. Несоблюдение Участником выполнения настоящих Правил считается его отказом от участия в Игре.

16. Отказ победителя от получения приза
Победитель вправе отказаться от получения приза без объяснения причин до 5 апреля 2011 г. Отказ должен быть оформлен в письменной форме. В случае если победитель розыгрыша отказывается направить отказ в письменной форме, организатор рекламной игры имеет право передать приз на иные нужды, в том числе в качестве приза для других розыгрышей.

17. Настоящие Правила составлены на шести листах, хранятся у Организатора и доступны для ознакомления любому из участников Игры по его требованию.

Свидетельство о регистрации рекламной игры №1786 от 25.10.2010 г., выдано Министерством торговли Республики Беларусь